Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 11 кастрычніка 1985 г. № 41 (3295) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

Унумары:

Аляксей ПЯТКЕВІЧ
Час патрабуе
СУЧАСНАСЦЬ І СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА

●

Паэзія
НОВЫЯ ВЕРШЫ
Ніны МАЦЯШ

●

Урывак з новай аповесці
Валянціна БЛАКІТА

●

У майстэрні — САВІЦКІ

●

Культурная хроніка



Бульбу любяць, бульбу хваляць.

Уборка ўраджаю ў калгасе імя Дзяржынскага Бабруйскага раёна.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

НАМЕЧАНА КОМПЛЕКСНАЯ ПРАГРАМА

У друку апублікавана «Комплексная праграма развіцця вытворчасці тавараў народнага спажывання і сферы паслуг на 1986—2000 год», якая распрацавана ў адпаведнасці з рашэннямі XXVI з'езда КПСС і з'яўляецца састаўной часткай Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986 — 1990 гады і на перыяд да 2000 года.

У адпаведнасці з пастаўленай партыяй задачай паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на базе навукова-тэхнічнага прагрэсу праграма прадугледжвае ўсямернае павелічэнне вытворчасці, расшырэнне асартыменту і павышэнне якасці тавараў народнага спажывання і развіццё паслуг, аказваемых насельніцтву, канцэнтруе намаганні ўсіх галін народнай гаспадаркі на вырашэнні бліжэйшых і перспектыўных задач у галіне развіцця вытворчасці і рэалізацыі нехарчовых тавараў, а таксама сферы паслуг.

Галіны, спецыялізаваныя на выпуску тавараў і абслугоўванні насельніцтва, атрымліваюць паскоранае развіццё. На аснове шырокага ўкаранення сучаснай тэхнікі і тэхналогіі ўмацоўваецца іх матэрыяльна-тэхнічная база. Паляпшаецца забеспячэнне вытворчасці тавараў і сферы паслуг абсталяваннем, матэрыяламі і камплектуючымі вырабамі.

Намячаецца значна павялічыць вытворчасць тканін, адзення, абутку, павысіць забяспечанасць насельніцтва ўсімі відамі складанай бытавой тэхнікі і разнастайнымі паслугамі. Пры гэтым будзе праводзіцца мэтанакіраваная і дзейсная работа па фарміраванні ў савецкіх людзей разумных патрэбнасцей, выхаванні ў іх сацыялістычнай культуры быту і адпачынку, па стварэнні ўмоў для паўнацэннага выкарыстання вольнага часу.

Асноўная ўвага ў праграме ўдзяляецца пытанням паляпшэння якасці і асартыменту выпускаемых тавараў, укаранення прагрэсіўных форм і расшырэння паслуг у гандлі і грамадскім харчаванні, бытавым, жыллёва-камунальным, транспартным, турысцкім і іншых відах абслугоўвання насельніцтва.

Павышаюцца роля і адказнасць міністэрстваў, ведамстваў, саюзных рэспублік і мясцовых Саветаў народных дэпутатаў за задавальненне патрэбнасцей насельніцтва ў неабходных таварах і паслугах, больш поўнае выкарыстанне рэзерваў і магчымасцей, якія ёсць на месцах.

Узаемазвязана вырашаючы пытанні развіцця вытворчасці і рэалізацыі тавараў і сферы паслуг, праграма прадугледжвае ўдасканаленне кіраўніцкай і планавай дзейнасці, забеспячэнне адпаведных галін кваліфікаванымі кадрамі рабочых масавых прафесій і спецыялістамі, расшырэнне і паглыбленне супрацоўніцтва з сацыялістычнымі краінамі. Асаблівая ўвага ў праграме ўдзелена павышэнню ролі паслуг устаноў культуры ў ідэйным, маральным і эстэтычным выхаванні савецкіх людзей, больш поўным задавальненні іх разнастайных духоўных патрэбнасцей, развіццю новых прагрэсіўных відаў ці форм культурнага абслугоўвання насельніцтва.

Будзе прадоўжана далейшае планамернае расшырэнне сеткі ўстаноў культуры і мастацтва, асабліва ў месцах масавай жылой забудовы і сельскай мясцовасці, уводзіцца ў дзеянне штогод за кошт дзяржаўных капітальных укладанняў не менш як 50 кінатэатраў. Павялічыцца колькасць крытых летніх кіназалаў і кінапляцовак, павысіцца эфектыўнасць і якасць работы кінаўстановак.

Стварацъ шматфункцыянальныя аб'екты культурнага прызначэння, гарадскія і раённыя культурна-спартыўныя комплексы. Павысіць ролю клубных устаноў у арганізацыі адпачынку насельніцтва, асабліва ў вёсцы. Актыўней выкарыстоўваць пры гэтым новыя тэхнічныя сродкі (відэамагнітафоны, ігравыя тэлевізійныя прыстаўкі і інш.). Прадугледзець работу ў клубах гурткоў і курсаў па інтарэсах. Расшырыць выкарыстанне малых форм, тэатральнага мастацтва. Стварацъ тэматычныя, спецыялізаваныя паркі, а таксама перасовачныя атракцыённыя комплексы. Шырэй прымяняць выязныя формы культурнага абслугоўвання ў сельскай мясцовасці.

Забяспечыць далейшае паляпшэнне дзейнасці паркаў культуры і адпачынку. Стварыць у радзе гарадоў доследна-паказальныя атракцыённыя комплексы пры парках культуры і адпачынку і эксперыментальныя цэнтры правядзення вольнага часу.

Цэнтральны Камітэт КПСС і Савет Міністраў СССР выказалі цвёрдую ўпэўненасць у тым, што рабочыя, калгаснікі, усе працоўныя нашай краіны сваёй самаадданай, высокапрадукцыйнай працай унясуць дастойны ўклад ва ўзмацненне эканамічнай магутнасці СССР, зробяць усё неабходнае для паспяховага ажыццяўлення праграмы.

СПРАВАЗДАЧНА-ВЫБАРНЫ ПАРТЫЙНЫ СХОД

У сераду ў Доме літаратара адбыўся справаздачна-выбарны партыйны сход Саюза пісьменнікаў БССР, на якім са справаздачным дакладам выступіў сакратар партыйнага бюро В. Карамазаў. У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел Л. Дайнека, Г. Васілеўская, У. Ліпскі, П. Шыдлоўскі, Э. Ялугін, Г. Каржанеўская, А. Шабалін, У. Федасеенка, А. Зарыцкі, В. Трыхманенка, Ф. Каваленка, М. Гроднеў, Н. Гілевіч.

На сходзе абраны новы склад партыйнага бюро, сакратаром партбюро — В. Карамазаў.

Выбраны дэлегаты на V справаздачна-выбарную партыйную канферэнцыю Партызанскага раёна г. Мінска, члены камісіі па кантролі за дзейнасцю адміністрацыі.

У рабоце сходу прыняў удзел і выступіў з прамовай сакратар ЦК КПБ А. Т. Кузьмін.

Справаздача аб рабоце сходу будзе змешчана ў наступным нумары.

З КЛОПАТАМ АБ БУДУЧЫМ

«Дзеля жыцця на зямлі» — так называецца Усесаюзная творчая канферэнцыя пісьменнікаў, прысвечаная 40-годдзю Перамогі над германскім фашызмам і японскім мілітарызмам, месцам правядзення якой выбраны Ленінград. Больш як сто вядомых савецкіх пісьменнікаў, а таксама літаратары амаль са ста краін свету вядуць зацікаўленую гаворку аб месцы і ролі літаратуры ў сучаснай вострай ідэалагічнай барацьбе, аб намаганні творцаў па прадухіленні ядзернай катастрофы.

Ад беларускай пісьменніцкай арганізацыі ў рабоце канферэнцыі прымаюць удзел сакратар праўлення СП БССР І. Чыгрынаў, народны пісьменнік Беларусі В. Быкаў, В. Казько, Э. Скобелеў.

В. ЗУШЧЫК.

Гучала музыка над Сожам...

Група ўдзельнікаў пленума ў Гомелі. Фота П. БЕЛАВУСА.

4 кастрычніка ў Гомелі закончыў работу выязны пленум праўлення Саюза кампазітараў БССР. Насычанай была праграма чатырох пленумаўскіх дзён. Беларускія кампазітары, музыказнаўцы, журналісты, крытыкі, госці з Масквы, Ленінграда, Рыгі, Харкава, Чэбаксараў наведалі памятныя мясціны горада, усклалі кветкі да помніка У. І. Леніну, да Вечнага агню, сустрэліся з кіраўнікамі партыйных і савецкіх органаў Гомеля і вобласці. Аўтары песень і выканаўцы выступалі на прамысловых прадпрыемствах, перад школьнікамі, воінамі Савецкай Арміі, работнікамі міліцыі. Вялікі выязны канцэрт прайшоў у вёсцы Пакалюбічы — у Палацы культуры калгаса імя У. І. Леніна Гомельскага раёна. Гамяльчане паслухалі дзве эстрадныя канцэртныя праграмы, падрыхтаваныя аркестрам Мінскага дзяржаўнага цырка пад кіраўніцтвам М. Фінберга, Акадэмічным сімфанічным аркестрам БССР (дырыжор Б. Райскі), дзіцячым узорным хорам «Рапсодыя» СШ № 30 г. Гомеля (мастацкі кіраўнік В. Баннікава), народнай харавой капэлай Гомельскага Дома работнікаў асветы (мастацкі кіраўнік У. Курылін), ансамблем «Сябры», вядучымі салістамі рэспубліканскага тэлебачання і радыё, філармоніі, Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР.

Пленум, прысвечаны праблемам развіцця масавых жанраў у сучаснай беларускай музыцы і праведзены пад знакам падрыхтоўкі да XXVII з'езда КПСС, завяршыўся творчай дыскусіяй. З дакладам выступіў народны артыст БССР, старшыня праўлення Саюза кампазітараў рэспублікі І. М. Лучанок. У рабоце пленума прынялі ўдзел інструктар ЦК КПБ М. А. Крыловіч, намеснік міністра культуры БССР У. П. Скараходаў, сакратар ЦК ЛКСМБ Т. В. Граблеўская, партыйныя і савецкія работнікі Гомеля і вобласці. Пленум прыняў рэзалюцыю па пытаннях, абмеркаваных у час дыскусіі.

Справаздача з выязнога пленума праўлення Саюза кампазітараў БССР будзе надрукавана ў «ЛіМе».

НАШ КАР.

У Палацы культуры Мінскага аўтамабільнага завода прайшлі канцэрты Івіцы Шэрфезі. Папулярны эстрадны спявак з Югаславіі не ўпершыню выступаў у Мінску. Як і раней, ягоная праграма мела поспех у маладзёжнай аўдыторыі.

Фота А. КАЛЯДЫ.

ПІСЬМЕННІК У НАСТАЎНІКАЎ

Іван Чыгрынаў часта сустракаецца са сваімі землякамі. Жаданы госць ён і ў педагогаў Касцюковіцкага раёна. Вось і нядаўна І. Чыгрынаў выступіў перад настаўнікамі, расказаў аб ролі і значэнні літаратуры ў сучаснай ідэалагічнай барацьбе, тых задачах, якія стаяць перад ёй у святле рашэнняў апошніх партыйных пленумаў, падрыхтоўкі да XXVII з'езда КПСС і XXX з'езда Кампартыі Беларусі.

К. СЯЛЮК.

ГОРКАЎЦЫ АДКРЫЛІ ЗАСЛОНУ

Пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства культуры СССР прысуджаны Рускаму тэатру БССР імя М. Горкага за поспехі ва ўсесаюзным спаборніцтве. Спектакль «Знак бяды» паводле В. Быкава атрымаў права паказу на Усесаюзным аглядзе творчай моладзі ў Тбілісі. Нядаўна наш калектыў запрасіў на традыцыйныя «Дні тэатра» працаўнікоў сельскай гаспадаркі Лагойскага, Чэрвеньскага, Маладзечанскага, Смалявіцкага і Дзяржынскага раёнаў і правёў з поспехам гастролі ў Кіеве і Гомелі, дзе сустракаўся з рабочымі буйных прамысловых прадпрыемстваў.

Спектаклямі «Макбет» В. Шэкспіра і «Знак бяды» В. Быкава распачалі чарговы — пяцьдзесят чацвёрты — сезон. Ён пройдзе ў атмасферы творчай падрыхтоўкі да знамянальнай падзеі — XXVII з'езда КПСС.

К. СТРЫЖОВА,
памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы.

ПРЭМ'ЕРЫ

Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа на пачатку новага сезона паказаў прэм'еру спектакля «Без віны вінаватыя» па п'есе А. Астроўскага (пераклад на беларускую мову А. Кудраўца). Рэжысёр — заслужаны дзеяч мастацтваў Украінскай ССР Б. Эрын. Гэта дзевяты твор вялікага рускага драматурга, які ўвасабляецца на падмостках коласаўскага тэатра, пачынаючы з 1936 года, калі ўпершыню па-беларуску тут прагучала знакамітая «Беспасажніца».

На здымку: сцэна са спектакля «Без віны вінаватыя». У ролях Кручынінай і Дудукіна народная артыстка БССР Г. Маркіна і заслужаны артыст БССР Г. Дубаў.

Тэкст і фота С. КОХАНА.

Прыняты ў Саюз пісьменнікаў БССР

ПАУЛІКАВА (Хейдарава) Людміла Фёдараўна. Паэт, празаік. Нарадзілася ў 1952 годзе ў пасёлку Ялізава Асіповіцкага раёна. Скончыла факультэт прыкладной матэматыкі БДУ імя У. І. Леніна (1974). Працуе вядучым канструктарам Беларускага навукова-даследчага інстытута пры Дзяржбудзе БССР.

Удзельнік VIII Усесаюзнай нарады маладых пісьменнікаў (1984).

Выступае ў друку з 1980 года.

Аўтар кнігі паэзіі «Адведзіны рамонкавай паляны» (1985), шэрагу апавяданняў.

СУПРУНЧУК Віктар Пятровіч. Празаік. Нарадзіўся ў 1950 годзе ў вёсцы Сялец Бярозаўскага раёна. Скончыў Белаазёрскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча (1968), факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна (1976). Працуе рэдактарам аддзела нарыса часопіса «Полымя».

Член КПСС.

Першае апавяданне апублікаваў у 1972 годзе.

Аўтар кнігі «Страсці» (1983).

ПАУЛАЎ Савелій Яфімавіч. Празаік, публіцыст. Піша па-беларуску і па-руску. Нарадзіўся ў 1934 годзе ў вёсцы Самуйлы Браслаўскага раёна. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна (1962). Кандыдат гістарычных навук. Партыйны работнік.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР.

Літаратурную працу пачаў у 1962 годзе. Аўтар кніг «Каштаны налiваюцца гневам» (1962). «Слова — зброя» (1970). «Рэпартаж з борта Зямлі» (1975), «Два колеры Зямлі» (Масква, 1980). «Імперская паранойя» (1984). «Вендэта па-амерыканску» (1985).

ЧАРОТА Іван Аляксеевіч. Перакладчык, крытык, літаратуразнавец. Нарадзіўся ў 1952 годзе ў вёсцы Лышчыкі Кобрынскага раёна. Скончыў філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна (1974). Выкладчык кафедры рускай савецкай літаратуры Белдзяржуніверсітэта.

Друкавацца пачаў у 1978 годзе.

Пераклаў кнігі «Памінкі» Б. Зупанчыча (1983), «Аўтабіяграфію» Б. Нушыча (1985), выступае ў перыядычным друку з рэцэнзіямі і літаратурна-крытычнымі артыкуламі.

ВЫЗНАЧАНЫ ЗАДАЧЫ

«Даведачна-бібліяграфічнае і інфармацыйнае абслугоўванне навучэнцаў на ўзровень сучасных задач» — тэма чарговага семінара работнікаў чытальных залаў цэнтральных гарадскіх і раённых дзіцячых бібліятэк, праведзенага абласной дзіцячай бібліятэкай на базе Калінкавіцкай РЦБС — школе перадавога вопыту.

Былі праслуханы даклады і кансультацыі: «Удасканаленне даведачна-бібліяграфічнай і інфармацыйнай работы дзіцячых бібліятэк у святле рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы», «Формы індывідуальнай і масавай работы бібліятэк па выхаванні культуры чытання навучэнцаў», «Каталогі дзіцячых бібліятэк, іх значэнне, складанне і прапаганда», «Змест і метады работы чытальных залаў дзіцячых бібліятэк у паляпшэнні самаадукацыі школьнікаў», «Эфектыўнасць выкарыстання рэкамендацыйных бібліяграфічных дапаможнікаў і каталогаў у кіраўніцтве чытаннем» і іншыя, з якімі выступілі работнікі абласной бібліятэкі М. Рэйзіна, Л. Страх, Р. Надэльсон, Г. Сідаровіч, Н. Шыцікава...

Работнікі чытальных залаў Т. Прымак (Петрыкаў), Н. Ласякова (Гомель), І. Падзярэнка (Карма) і іншыя падзяліліся вопытам работы аб паляпшэнні выкарыстання кніжных фондаў, павышэнні дзейснасці і якасці індывідуальнай і масавай работы, выкарыстання даведачных і перыядычных выданняў у рабоце з чытачамі, расказалі пра дапамогу, якую яны аказваюць школьным бібліятэкам у сувязі з рэформай сярэдняй агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы.

І. ЦАРЫК.

РЭПАРТАЖ У НУМАР

У ПАЛОНЕ «СЛОВА...»

Да 800-годдзя стварэння велічнага помніка сусветнай літаратуры «Слова пра паход Ігаравы» выдавецтва «Мастацкая літаратура» падрыхтавала добры падарунак — выпуск гэтага твора ў арыгінале на старажытнарускай мове, а таксама ў перакладах на сучасную рускую, выкананых Д. Ліхачовым і М. Забалоцкім, на беларускую — Янкам Купалам і Р. Барадуліным, на ўкраінскую — М. Рыльскім.

Мастацкае афармленне і ілюстрацыі выкананы вядомым майстрам кніжнай графікі Аленай Лось. Работа гэтая заняла асаблівае месца ў творчай біяграфіі мастачкі. Гэта і зразумела. Паспяхова ажыццявіць такую задачу — справа вельмі і вельмі няпростая. Адзін з самых праслаўленых ілюстратараў «Слова...» У. Фаворскі аднойчы выказаў наступную думку: калі прыступаеш да ілюстравання такога твора, як «Слова пра паход Ігаравы», то мастацкая яго дасканаласць робіць гэтае ілюстраванне вельмі цяжкім. Але тут жа дадаў, што гэты твор у той жа час і аблягчае работу мастака, бо паэма ўяўляе сабой высокі ўзор з ярка выяўленым характарам і мастацкім стылем.

Знайсці сваё прачытанне «Слова...» і сказаць нешта новае ў яго прачытанні пасля таго, як гэты твор ілюстравалі на працягу больш чым ста васьмідзесяці гадоў многія і многія мастакі розных краін і народаў, сапраўды складана. Яны выкарыстоўвалі розныя прыёмы падыходу да гэтага помніка. Пераймаліся спосабы мініяцюр старажытнарускіх летапісаў, старажытнарускай іконы, рускага жывапісу XVII стагоддзя. Адначасна з гэтым рабіліся спробы прачытання «Слова...» мовай сучаснай графікі.

Нават можа скласціся ўражанне, што ўжо цалкам вычарпаны ўсе выяўленчыя магчымасці, але А. Лось даказала, што гэта не так. Глыбокае веданне гісторыі Радзімы і яе мастацтва, перш за ўсё — народнага мастацтва — дапамаглі ёй не паўтарыць іншых. Многія гады А. Лось вывучала мастацтва старажытнага Ноўгарада, яго знакамітыя фрэскі, а таксама прыкладное мастацтва гэтага горада і прыкладное мастацтва старажытнарускіх гарадоў славутага Залатога кальца.

Немалую ролю ў паспяховым вырашэнні задачы па стварэнні ілюстрацый да «Слова...» адыграў і той факт, што А. Лось безупынку вось ужо многія і многія гады вывучае беларускі, а таксама рускі і ўкраінскі фальклор. Усё гэта дазволіла ёй даць ілюстрацыі да «Слова пра паход Ігаравы» адпаведна стылю і духу гэтага твора і, што самае галоўнае, прачытаць па-свойму, арыгінальна. Калі чытач будзе трымаць кнігу ў руках, ён зможа пад уплывам і ўздзеяннем гэтых ілюстрацый за старажытным радком тэксту адчуць біццё пульсу сучаснага жыцця з яго глабальнымі праблемамі міру, дружбы, братэрства супраць сіл зла, цемры і цемрашальства.

Аленай Лось выканана шэсць разваротаў, якія адкрываюць кожны з шасці тэкстаў. А ўсе разам яны ўяўляюць своеасаблівую сюіту да гэтай паэмы, адлюстроўваюць яе асноўныя і фундаментальныя моманты.

Першы разварот прысвечаны Баяну, легендарнаму спеваку Кіеўскай Русі XI стагоддзя. У гэтым вобразе мастак пераканаўча і паэтычна перадаў натхнёныя рысы спевака, воіна, патрыёта, і не толькі рысы легендарнага Баяна, а і рысы спевакоў-казачнікаў, гусляроў наступных стагоддзяў. Украінскіх кабзароў, казачнікаў былінага эпасу рускай Поўначы, беларускіх спевакоў, якія донеслі да нашых дзён скарбы свайго фальклору, які з'яўляецца на думку такога знаўцы славянскіх літаратур, як С. Гарадзецкі, каштоўнай жамчужынай у багатай спадчыне ўсяго славянскага фальклору.

Наступныя развароты арыгінальна ўзнаўляюць такія сцэны з «Слова...», як выступленне ў паход і зацьменне сонца, бітва войска Ігарава з полаўцамі, залатое слова кіеўскага князя Святаслава, плач Яраслаўны. У заключэнне, як магутны акорд Ігаравай адысеі, гучыць спеў, музыка, званы ў кампазіцыі, прысвечанай вяртанню героя з палону, урачыстасці святла над цемрай, дабра над злом.

Усе ілюстрацыі, як і астатнія афармляльныя элементы кнігі, выкананы ў тэхніцы літаграфіі ў тры колеры — жоўты, чырвоны, шэра-сіні. Роля колеру, як сімвалу, у кампазіцыях да «Слова...» вялікая. Ён не толькі ўзмацняе, а фарміруе пэўны настрой пры разглядзе тых або іншых ілюстрацый. Судакранаючыся з тэкстам паэмы і зрокавым чынам кампазіцый да «Слова...», мы непрыкметна для сябе ўваходзім у сівую даўніну, якая адбліскваe булатнай сталлю, і аднуваем дым пажарышчаў, гора народа, боль і пакуты — усе тыя перажыванні, якія ўрываюцца ў краіну разам з войскамі ворагаў Радзімы. Адчуваем бадзёрасць і радасць, калі цёплыя, звонкія колеры ўзмацняюць кампазіцыю, прысвечаную вяртанню Ігара з палону на радзіму.

Кнігу ўпрыгожвае супервокладка з выявай князя Ігара, які вяртаецца да сваёй дружыны, а таксама застаўкі, падобныя на тыя, якімі старажытныя майстры ўпрыгожвалі ліштвы акон і дзвярэй, сцен. Гэтыя застаўкі як бы звязваюць усё афармленне ў адзінае цэлае з тэкстам.

Усё гэта дапаможа чытачу яшчэ глыбей пранікнуць у геніяльны тэкст паэмы, адчуць веліч у закліках аўтара «Слова...» да міру і братэрства і прыняць іх як эстафету пакаленняў.

Дзмітрый МАРОЗ.

Ілюстрацыі Алены ЛОСЬ да «Слова пра паход Ігаравы».

Часопісы ў кастрычніку

«ПОЛЫМЯ»

Змешчаны вершы У. Паўлава, А. Лойкі, К. Кірэнкі, паэма У. Няклява «Гарбун». Пад рубрыкай «Новыя пераклады» публікуюцца творы С. Ясеніна ў перакладзе В. Зуёнка.

Проза прадстаўлена аповесцямі «Ян першы снег...» Г. Васілеўскай і «Бухта адзіноцкага чалавека» А. Крыгі, апавяданнем «Водар палыну» Л. Калодзежнага.

Увазе чытача прапануюцца не друкаваныя раней раздзелы з аповесці У. Краўчанкі «З добрым раннем!» (публікацыя Е. Краўчанкі).

Артыкул М. Кузняцова «Ураджайная сіла гектара» друкуецца пад рубрыкай «Насустрач XXVII з'езду КПСС».

«Сляза і кветка» — нарыс М. Карпенка.

У раздзеле «Крытыка і літаратуразнаўства» — артыкулы «Пошукі слова» Р. Шкрабы і «Зведанае, перажытае» А. Марціновіча.

З рэцэнзіямі выступаюць У. Гніламёдаў, Л. Савік, А. Сідарэвіч.

Завяршае нумар падборка «Наш каляндар».

«МАЛАДОСЦЬ»

Паэзія прадстаўлена вершамі У. Паўлава, Г. Каржанеўскай, А. Касценя, М. Арочкі, Н. Гальпяровіча, А. Каско.

Змешчаны аповесць В. Супрунчука «Сяргей Сяргеевіч» і апавяданні В. Курыленкі і Р. Галіцкага.

Паэзія С. Ясеніна гучыць у перакладзе Я. Янішчыц.

Сярод іншых матэрыялаў чытача зацікавяць выступленні С. Кобыша і В. Шабаліна «Жыць з паскарэннем», А. Гаўрона «Там, дзе возера глыбокае...», Я. Садоўскага «Ліст з 1905 года»...

А. Сідарэвіч падрабязна разглядае раман А. Кудраўца «Сачыненне на вольную тэму» — «Новая сустрэча з Ігнатам Сцяпанавічам».

«БЕЛАРУСЬ»

Публіцыстычны роздум П. Прыходзькі «А ён стаяць будзе ў вяках» змешчаны пад рубрыкай «Пісьменнік і жыццё».

Ю. Ведзянееў і М. Давыдзік гутараць са старшынёй калгаса «Прагрэс» Гродзенскага раёна А. Дубко—«Аргументы «Прагрэсу», Л. Суханава—з доктарам філасофскіх навук М. Тараткевічам — «Колькі чалавеку трэба?».

Друкуюцца вершы Г. Бураўкіна і Р. Баравіковай, апавяданне А. Ярася «Таварыскі суд», навела А. Васілевіч «Літоўка».

«Алгарытм паскарэння» — нарыс В. Яноўскага.

Фотарэпартаж А. Хіневіча і В. Жыліна «Дом з вокнамі на поле»—чарговая публікацыя з серыі «Літаратурны пост «Беларусі» ў падшэфным калгасе».

Разважанні М. Халецкага «Калі вораг не здаецца...» прапануюцца пад рубрыкай «П'янству — бой».

«Калі «ўзяць пробы» на глыбіні» — літаратурна-крытычны артыкул А. Сямёнавай.

Артыкул А. Сілянкова «Блакітны экстаз» публікуецца пад рубрыкай «Справы сямейныя».

«НЕМАН»

Нізку вершаў Н. Гілевіча «У добрай згодзе» пераклалі У. Гардзейчаў, Б. Спрынчан і І. Фанякоў. Паэзія прадстаўлена таксама творамі Г. Шутэнкі.

Змешчаны пачатак рамана І. Пташнікава «Алімпіяда» (пераклад У. Кудзінава) і аповесць Ф. Конева «Першы параход». «Гранітны бераг» — рэпартаж П. Бурака.

У раздзеле «Запіскі. Успаміны. Дакументы» выступае М. Вінакураў — «Мой рабочы гарачы час».

Пра творчасць маладых мастакоў разважае Т. Гаранская—«Тры погляды на сучаснасць».

«Каго я святлом азарыў?» — артыкул У. Гніламёдава даследуе тэму грамадзянскасці ў беларускай паэзіі.

Друкуюцца рэцэнзіі на новыя кнігі, ёсць падборка «Хроніка «Немана».

БУДНЯЎ ГЭТЫХ СВЯТОЧНАСЦЬ

Дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы адкрыў 66 сезон

Пачатак новага тэатральнага сезона — заўсёды свята як для акцёраў, іншых работнікаў тэатра, так і шматлікіх паклоннікаў гэтага аднаго з самых старадаўніх відаў мастацтва. І ўсё ж гэты дзень, сам па сабе непаўторны, становіцца ўдвая радасным, калі ведаеш, што праз некаторы час зноў адкрые сваю заслону не проста тэатр, а тэатр, на які трэба раўняцца, тэатр, які лічыцца правафлангавым усяго сцэнічнага мастацтва рэспублікі. Менавіта такім тэатрам з'яўляецца Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы.

Зразумела, былі за доўгі час яго творчага жыцця і гады больш плённыя і менш значныя па мастакоўскіх набытках. Здаралася часам і так, што калектыў у нечым страчваў узятыя вышыні ці, наадварот, нечакана сягаў далёка наперад. Усё гэта, безумоўна, так. Ды толькі ніколі купалаўцам нельга было адмовіць у жаданні з гонарам несці сцяг першага тэатра рэспублікі, і паўсядзённая святочнасць будняў ніколі не адмаўляла напружанай творчай працы.

Чакаецца яна і ў сёлетнім — шэсцьдзесят шостым у гісторыі калектыву сезоне. Ён прыпадае на час, калі ўся краіна рыхтуецца дастойна сустрэць XXVII з'езд КПСС. Аднак ёсць яшчэ адна акалічнасць, якая прымушае і ўзважыць магчымасць, і выкарыстаць мастакоўскія рэзервы — плануецца, што ў 1987 годзе адбудуцца гастролі тэатра ў сталіцы нашай Радзімы Маскве.

У аўторак, калі адбыўся традыцыйны збор трупы, на гэтым шмат засяроджвалася ўвагі, а яшчэ падводзіліся вынікі папярэдняга, юбілейнага сезона, што стаў для тэатра ў многіх адносінах плённым. Галоўнае, што быў створаны спектакль, які атрымаў высокую ацэнку крытыкі і гледача, шырокі грамадскі рэзананс, «Радавыя», пастаўленыя В. Раеўскім па п'есе А. Дударава, з поспехам паказваліся ў Маскве на Усесаюзным фестывалі тэатраў, прысвечаным 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. На гэтым прадстаўнічым аглядзе лепшых тэатральных калектываў краіны спектакль выйшаў пераможцам. Спадарожнічаў поспех «Радавым» і на фестывалі «Прыбалтыйская вясна-85», які праходзіў у Рызе. Пяць з васьмі прызоў — найлепшае пацвярджэнне значнасці новай работы купалаўцаў. Радасна і тое, што рэжысёр В. Раеўскі, мастак Б. Герлаван, драматург А. Дударав, выканаўцы галоўных роляў У. Філатаў і А. Дзянісаў вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі СССР.

На ўрачыстым зборы выступілі намеснік дырэктара тэатра Л. Смірноў, галоўны рэжысёр тэатра заслужаны дзеяч мастацтваў БССР В. Раеўскі, сакратар партыйнай арганізацыі народная артыстка рэспублікі Л. Давідовіч, народны артыст СССР З. Стома, старшыня праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання народны артыст БССР М. Яроменка, начальнік упраўлення тэатраў і музычных устаноў Міністэрства культуры БССР У. Рылатка, старшыня мясцкома тэатра заслужаная артыстка БССР А. Рынковіч. Адзначалася, што важнай падзеяй мінулага сезона сталі гастролі ў Томску, горадзе, дзе аматары сцэнічнага мастацтва добра памятаюць выступленні старэйшага пакалення купалаўцаў, калі тэатр у час Вялікай Айчыннай вайны вымушаны быў пэўны час працаваць у гэтым сібірскім горадзе.

Як і ў папярэднія гады, адбылося нямала выступленняў перад сельскімі працаўнікамі рэспублікі, што ўжо даўно сталі традыцыйнымі. Паспяхова вытрыманы і яшчэ адзін творчы экзамен — гастролі ў Гродне, якія праходзілі напружана. За дваццаць пяць дзён было паказана 45 спектакляў.

Але, як падкрэслівалася ў выступленнях, тэатр па-ранейшаму павінен думаць аб тым, каб ствараць спектаклі высокага ідэйна-мастацкага гучання, якія б адпавядалі ўзросшым патрабаванням і акцёрскага майстэрства, і рэжысуры. У прыватнасці, варта падумаць аб тым, каб уключыць у рэпертуар п'есу, якая б ставіла вострыя праблемы сучаснасці, адказвала на тыя надзённыя пытанні, якія цяпер, у сувязі з апошнімі партыйнымі рашэннямі і мерапрыемствамі, выступаюць на першы план. Закраналіся і пытанні занятасці акцёраў, гаварылася аб неабходнасці павялічыць колькасць спектакляў у тыдзень, якія ідуць на «малой сцэне».

Ля манумента працоўнай і баявой славы ў Томску.

Знаёмства з альбомам, які расказвае пра гастролі ў Томску.

Настрой — творчы, рабочы.

Сцэна са спектакля «Паўлінка». У ролях: Паўлінка — артыстка А. Доўгая, Пранцысь Пустарэвіч—народны артыст СССР З. Стома, Агата—народная артыстка СССР Г. Макарава, Альжбета—артыстка Я. Кавалёва.

Адным словам, тэатр і надалей павінен з гонарам несці званне і тэатра купалаўскага, і тэатра акадэмічнага. Тым больш, што ён становіцца школай для іншых. Пры тэатры пачынаюць праходзіць стажыроўку рэжысёры іншых сцэнічных калектываў рэспублікі. Высокія задачы ставяцца і перад лабараторыяй маладых драматургаў, якая павінна дбаць аб тым, каб рэпертуар папаўняўся цікавымі, значнымі творамі маладых аўтараў.

Што тычыцца планаў на бліжэйшы час, дык мінчан і гасцей беларускай сталіцы неўзабаве чакае сустрэча з неўміручай драматургіяй В. Шэкспіра. Рыхтуецца да пастаноўкі п'еса «Бура». Класіка ў рэпертуарных планах пазначана і «Дзецьмі сонца» Максіма Горкага. Тэатр мае намер пазнаёміць гледачоў са сцэнічнай рэдакцыяй аповесці А. Жука «Паляванне на апошняга жураўля». Будзе прадоўжана супрацоўніцтва з югаслаўскімі аўтарамі. Мяркуецца пазнаёміць гледачоў з п'есай Д. Кавачэвіча «Там і тут...»

У планах купалаўцаў — пастаноўка адной з п'ес А. Валодзіна. На «малой сцэне» будзе ажыццёўлена пастаноўка п'есы А. Гельмана «Зінуля...»

Тым жа вечарам зноў узнялася купалаўская заслона. І зноў пачалося свята сустрэчы з мастацтвам, вечна жывым і непаўторным. Як і год, як і два, як і дзесяць, як і сорак з гакам гадоў назад, сезон адкрыла славутая «Паўлінка» Янкі Купалы.

А. ЯНОВІЧ.

Фота Ул. КРУКА.

КНІГА СЛУЖЫЦЬ МІРУ

У дваццаці гарадах Савецкага Саюза працягваецца Дэкада кніг Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, прысвечаная нацыянальнаму святу братняй краіны — 36-ай гадавіне ўтварэння першай на нямецкай зямлі сацыялістычнай дзяржавы. Як і ў ранейшыя гады, месцам правядзення яе стаў і горад-герой Мінск, які даўно падтрымлівае цесныя культурныя сувязі з пісьменнікамі і выдаўцамі ГДР.

Урачыстае адкрыццё Дэкады адбылося ў памяшканні Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. Выступаючы перад прысутнымі, старшыня Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю М. І. Дзялец, падкрэсліў, што дзякуючы сацыялізму нямецкі народ дасягнуў значных поспехаў у розных галінах жыцця.

Відавочныя здабыткі і ў выдавецкай дзейнасці, сферы літаратуры, культуры, з кожным годам пашыраюцца творчыя сувязі паміж Германскай Дэмакратычнай Рэспублікай і Савецкім Саюзам. Сведчанне таму — і выпуск кніг нямецкіх аўтараў у перакладзе на мовы народаў СССР. За трыццаць пяць гадоў у нашай краіне выпушчана 2.686 кніг і брашур агульным тыражом 98,3 мільёна экземпляраў. У перакладзе на беларускую мову выдадзена 35 кніг, тыраж якіх склаў 3,2 мільёна экземпляраў. Радуюць вынікі Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, на якой заключана 13 кантрактаў і 26 папярэдніх пагадненняў на выпуск кніг нямецкіх аўтараў у Беларусі. Шмат якія творы беларускіх пісьменнікаў неўзабаве будуць выдадзены ў ГДР.

Пісьменнік В. Рабкевіч, які таксама выступіў на адкрыцці Дэкады, зазначыў, што творы нямецкіх аўтараў у планах выдавецтва «Мастацкая літаратура» заўсёды займалі і займаюць важнае месца. Толькі ў апошні час выйшлі такія кнігі, як «Вяртанне да сябе» Е. Бехера, «Матчына споведзь», рэгулярна прадстаўляюцца нямецкія аўтары і на старонках літаратурнага зборніка «Далягляды». Неўзабаве беларускія чытачы змогуць пазнаёміцца з раманам І. Шпехта «Выгнанцы», у наступным годзе выходзіць раман Р. Крафт «Востраў без маяка». Усё гэта стала магчымым дзякуючы таму, што ў рэспубліцы плённа працуюць перакладчыкі з нямецкай мовы на беларускую — Я. Семяжон, В. Сёмуха, А. Зарыцкі, А. Лойка, У. і Л. Чапегі, У. Папковіч, М. Навіцкі, Ф. Баторын і іншыя, а У. Сакалоўскі і П. Садоўскі займаюцца даследаваннем беларуска-нямецкіх літаратурных узаемасувязей.

Консул Генеральнага консульства ГДР у Мінску В. Янда выказаў упэўненасць, што цяперашняя Дэкада не толькі дасць магчымасць беларускім чытачам бліжэй пазнаёміцца з творчасцю пісьменнікаў ГДР, але і яшчэ больш умацуе дружбу паміж нашымі народамі.

На цырымоніі адкрыцця прысутнічаў генеральны консул ГДР у Мінску П. Якабс.

Выстаўкі нямецкай кнігі працуюць у гэтыя дні ў шматлікіх бібліятэках рэспублікі, у тым ліку ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна. Праводзяцца чытацкія канферэнцыі, вечары інтэрнацыянальнай дружбы. Ажыўлена і ў мінскай кнігарні «Дружба», дзе прадстаўлены шырокі выбар грамадска-палітычнай, навуковай, мастацкай і іншых відаў літаратуры, выпушчанай выдавецтвамі ГДР, навінкі якой паступілі ў сувязі з Дэкадай.

К. АРХІПАЎ.

КНІГАПІС

САВЕЦКІ ШМАТНАЦЫЯНАЛЬНЫ РАМАН. Калектыўная манаграфія. На рускай мове. М., «Наука», 1985.

Ва ўсім свеце відавочны дасягненні савецкай шматнацыянальнай літаратуры, і ўсё ж асабліва плённа развіваецца раман. І гэта ў той час, калі на Захадзе нараджаюцца і адміраюць усё новыя тэорыі ўстарэласці рамана як жанру. Савецкі ж вопыт 60—70-х гадоў яскрава пераконвае, што раман не толькі не страціў узятых пазіцый, а, наадварот, яму па сіле пакарэнне новых вышыняў. Адбываецца больш глыбокае адлюстраванне падзей рэчаіснасці ў іх нацыянальнай, гістарычнай і псіхалагічнай канкрэтнасці, расце колькасць аўтараў, што спрабуюць свае сілы ў гэтым нялёгкім і няпростым жанры. Характэрна і тое, што раман дасягнуў вялікага поспеху не толькі ў літаратурах, дзе даўно моцная раманная традыцыя, але і ў тых, дзе яшчэ параўнальна нядаўна толькі пачынаў заваёўваць права на жыццё.

Зразумела, што даследчыкі не могуць абыходзіць сваёй увагай гэтых складаных працэсаў далейшага самасцвярджэння і развіцця рамана. Толькі ў апошні час з'явілася шэраг цікавых даследаванняў, напісаных як асобнымі літаратуразнаўцамі, так і калектыўных прац. У прыватнасці, яшчэ ў 1978 годзе выдавецтва «Наука» выпусціла падрыхтаваную калектывам вучоных інстытута сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага манаграфію «Советский роман», у якой разглядаліся заканамернасці станаўлення і развіцця жанру, узнімаліся праблемы далейшага пашырэння ідэйна-тэматычнага зместу.

Нядаўна з'явілася чарговае даследаванне, якое ўспрымаецца лагічным працягам папярэдняй кнігі, «Советский многонациональный роман» — таксама калектыўная манаграфія, якая выходзіць пад эгідай інстытута сусветнай літаратуры імя А. М. Горкага. Для напісання артыкулаў прыцягнуты вядомыя савецкія даследчыкі, што працуюць у гэтай навуковай установе, а таксама супрацоўнікі рэспубліканскіх інстытутаў літаратуры.

У кнізе дзве часткі, што ўзаемна дапаўняюць адна адну — «Раман і праблемы літаратуры сучаснасці» і «Рух жанру і ўзаемадзеянне літаратур». Асноўнае пытанне, якое хвалюе аўтараў, чым сённяшні раман (гаворка вядзецца на матэрыяле 60—70-х гадоў) адрозніваецца ад рамана іншых перыядаў. Наколькі відавочныя поспехі і дасягненні ў параўнанні з папярэднім перыядам, які таксама, як вядома, шмат у чым узбагаціў раманную традыцыю.

Пра шырыню ахопу фактычнага матэрыялу сведчыць тое, што ў полі зроку даследчыкаў знаходзяцца па сутнасці ўсе літаратуры, якія ў галіне рамана дасягнулі найбольш значнага поспеху, а таксама тыя, што па свайму развіццю ў апошні час узняліся на ўзровень высокаразвітых. Асобны раздзел прысвечаны беларускай літаратуры — «Маральныя аспекты беларускага рамана».

Даўні і патрабавальны даследчык беларускай літаратуры, які нямала зрабіў на ніве творчых кантактаў і ўзаемасувязей, А. Аўчарэнка ўважліва і патрабавальна прачытвае некаторыя творы, якія ўжо ацэнены па вартасцях і крытыкай, і чытачамі. Асабліва шмат увагі даследчык удзяляе «Палескай хроніцы» І. Мележа, шмат якім творам В. Быкава, раманам І. Навуменкі «Сасна пры дарозе», «Вецер у соснах». «Сорак трэці», І. Шамякіна «Снежныя зімы» і «Атланты і карыятыды», Звяртаецца А. Аўчарэнка і да такіх твораў, як «Я з вогненнай вёскі...» А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка, «Хатынская аповесць» А. Адамовіча, «Апошнія і першыя» Б. Сачанкі, «Тартак» І. Пташнікава, «Пушчанская адысея» А. Карпюка, «Расстаемся ненадоўга» і «Сустрэчы на ростанях» А. Кулакоўскага, «На другую зіму вайны» і «Сярод ночы» Л. Арабей і іншых.

В. ЯНОВІЧ.

СУЧАСНАСЦЬ І СУЧАСНАЯ ЛІТАРАТУРА

ЧАС ПАТРАБУЕ

Аляксей Пятрэвіч

СУЧАСНАЯ ІДЭЯ, сучасны канфлікт, сучасны герой... Мы часта карыстаемся гэтымі словамі. Толькі ці заўсёды ўкладваем у іх патрэбны змест, ці заўсёды задумваемся над іх сэнсам? Нярэдка сучаснае разумеецца як тое, што адносіцца толькі да нашага часу, што адбываецца цяпер. І мы з лёгкай душой узводзім у ранг сучасных любыя, у тым ліку зусім ардынарныя, пісьменніцкія назіранні, якія фіксуюць з'явы цяперашняга жыцця. Мастацтва ж, засвойваючы рэчаіснасць, імкнецца пазнаць яе вядучыя працэсы, яе найбольш красамоўныя асаблівасці, што ўмяшчаюць самы важны, самы глыбінны змест часу. Менавіта на гэтым напрамку чакаюць пісьменніка сапраўдныя эстэтычныя здабыткі. І, значыць, крытэрый сучаснасці — у глыбокай адпаведнасці твора праўдзе часу, яго карэнным запатрабаваннням. Пераканаўча ўвасобіць сучаснасць, перадаць напружаны пульс яе жыцця могуць вынашаныя ў сэрцы ідэі, вострыя канфлікты, яркія характары. Справа нават не ў сённяшнім матэрыяле, які распрацоўваецца пісьменнікам. Напрыклад, творы Уладзіміра Караткевіча, хоць і адлюстроўваюць гістарычнае мінулае, застаюцца больш сучасныя і сваім зместам, і ідэйна-маральным напаўненнем, чым некаторыя дужа аператыўныя, але дыдактычна зададзеныя ці то раўнадушныя творы пра наш дзень, бо гарачы грамадзянска-патрыятычны тэмперамент пісьменніка, усхваляваная думка пра Беларусь, яе народ, яе лепшых сыноў, пра яе лёс на крутых гістарычных паваротах складаюць сутнасць твораў У. Караткевіча і моцна адгукаюцца ў сэрцы нашага сучасніка.

Вядома, першачарговая задача ўсякай літаратуры — паказаць свой час, сённяшнія з'явы і працэсы ва ўсёй іх складанасці і шматграннасці. Наша літаратура спраўляецца з такой задачай. Аднак перад ёю на гэтым шляху нямала праблем, што заўважана і іншымі ўдзельнікамі гаворкі на старонках «ЛіМа». Мне здаецца, што творам многіх беларускіх пісьменнікаў бракуе зараз моцнага сацыяльнага пачатку.

Сучасны герой распрацаваны досыць глыбока як мастацкі характар. Аўтары пераканаўча раскрываюць складанасць яго ўнутранага свету, выяўляюць таямнічыя рухі яго душы. Але за духоўнай гісторыяй такога героя вельмі часта слаба праглядваецца сацыяльная лінія яго паводзін, слаба адчуваецца сацыяльна-грамадская абумоўленасць яго жыццёвых прынцыпаў. У выніку асоба псіхалагічна расплываецца, размываюцца яе канкрэтныя жыццёвыя контуры. Аслабляецца і ідэйная мэтанакіраванасць дзеянняў героя. Сацыяльная невыразнасць персанажаў лёгка тлумачыцца характарам канфліктаў у сучаснай нашай літаратуры, якія паступова перавандравалі са сферы сацыяльна-грамадскіх працэсаў у сферу побыту і такім чынам не толькі прыглушыліся, а як бы і зніклі ў многіх творах. Чытачу даводзіцца шукаць іх у шматзначнасці падтэксту.

Трэба тут таксама адзначыць, што мастацкае даследаванне чалавечага духу ў сучаснай беларускай літаратуры — яе выдатная заваёва. На гэтай лініі яе вялікія мастацкія поспехі, адкрыцці. Рашучы паварот літаратуры да глыбіннага высвятлення духоўнага жыцця чалавека адбываўся ў 60-я гады. Гэта была рэакцыя на пашыраную раней вульгарна-сацыялагічную канцэпцыю героя. Псіхалагічны аналіз культываваўся тады нават з пэўнай палемічнай завостранасцю. Зразумела, што сацыяльныя матывіроўкі адступалі на задні план. Здаецца, што да сённяшняга часу трымаецца інерцыя такіх прынцыпаў. Час жа настойліва дыктуе неабходнасць усебаковага ўвасаблення чалавека ў літаратуры. І менавіта сінтэз сацыяльна-грамадскага і маральна-філасофскага даследавання жыцця вядзе да вялікіх грамадзянскіх вывадаў, ідэйных абагульненняў.

Пра гэта сведчаць, напрыклад, камедыі Андрэя Макаёнка, аповесці Васіля Быкава. У «Знаку бяды» В. Быкава ідэйная сіла твора, маштабнасць пісьменніцкага мыслення, унутраная паўнакроўнасць характараў узмацняюцца тым, што аўтар «падключае» да ваенных бед балючыя сацыяльныя пытанні нашай даваеннай рэчаіснасці. Выстройвае іх у адну маральна напружаную дынамічную лінію, якая скіроўваецца ў наш дзень і далей — у будучыню. І аповесць будзіць грамадзянскае сумленне сучасніка, яго трывогу за чысціню адносін у грамадстве, за чалавечае шчасце і радасць на зямлі.

Прыглушанасцю сацыяльных акцэнтаў у цяперашняй нашай літаратуры тлумачыцца ў значнай меры слабасць крытычнага пафасу твораў, бляклась адмоўнага персанажа, элементарнасць яго жыццёвага крэда. Часта гэта чалавек, які толькі часова памыляецца, а затым, пад заслону, перавыхоўваецца ці, прынамсі, выкіроўваецца на сумленную дарогу. Грамадскае зло, якое драматызуе жыццё людзей, наносіць ім цяжкія маральныя траўмы, стараецца знішчыць здаровае і прыгожае ў гэтым жыцці, у творах паказваецца нярэдка безаблічна і бесцялесна, як нейкая няясная сіла, што дзейнічае ўпотай, і таму з ёю змагацца цяжка. Мы, па сутнасці, не гаворым сур'ёзна пра адмоўнага героя, бо, бараніі божа, гэтак можна ж кінуць цень на наша светлае жыццё... Так і ўспамінаецца «рыпенне голасу» «сухога лысага газетчыка» (з аповесці Янкі Брыля «На Быстранцы»), які павучаў юнага Толю Клімёнка: «Толькі штаноўчае, малады чалавек, толькі штаноўчае. Яно, і толькі яно гаворыч пра таржаштво нашага ладу». Але ж калі тое было? Адмоўны герой, як вядома, — чыннік канфлікту, гэтак жа, як і станоўчы, для якога ён павінен стаць салідным антыподам.

У творах пра наша сённяшняе жыццё супярэчнасці нярэдка вынікаюць з падзей ваеннай пары, і адмоўны герой — адтуль. Гэта і Шышковіч з рамана Івана Шамякіна «Вазьму твой боль», Далідчык-Мамка з «Алімпіяды» Івана Пташнікава, Стась Мастоўскі з «Сачынення на вольную тэму» Анатоля Кудраўца. Што ж, яны падказаны праўдай жыцця. Але такія канфлікты і характары не могуць замяніць тых, што пароджаны сённяшняй рэчаіснасцю, складанымі грамадскімі працэсамі сучаснасці. Ігнараванне іх, уцёкі ад іх — даніна даўно пахаванай «тэорыі» бесканфліктнасці.

У тым жа кантэксце бачыцца і яўны дэфіцыт сатыры ў нашай літаратуры, якая, між іншым, мае даўнія і вельмі багатыя сатырычныя традыцыі. Сатырыкаў зараз можна пералічыць на пальцах. Зрэшты, і яны пішуць сатырычныя творы калі-нікалі. Літаратура, якая не ўмее здзекавацца са зла, паражаць яго вострай зброяй смеху, траціць вельмі важны ідэйна-эстэтычны плацдарм ў барацьбе за высокія ідэалы.

Што датычыць «гарадской» і «вясковай» прозы (пра што загаварылі ўдзельнікі гаворкі), то пры ўсёй умоўнасці і нязручнасці такога размежавання яно мае сэнс, дапамагае высветліць некаторыя аспекты сучаснага развіцця нашай літаратуры. «Гарадскі» напрамак у ёй (паводле матэрыялу, зместу, стылістыкі), на вялікі жаль, бедны. Пра горад мала хто піша (Іван Шамякін, Яўген Радкевіч, Васіль Гігевіч, яшчэ сёй-той), хоць абсалютная большасць пісьменнікаў жыве ў гарадах (колькі гаворым пра гэты парадокс!). Але справа не ў колькасці напісанага, а ў тым, што тэма гарадскога жыцця не стала для сучаснай беларускай літаратуры сваёй, арганічнай, не атрымала такога тонкага эстэтычнага засваення, такой грунтоўнай аналітычнай трактоўкі, як тэма вёскі. Я ўжо не кажу, што жыццё рабочага класа застаецца амаль што неадкрытым у літаратуры мацерыком. І асноўная прычына ў тым, што ў беларускую літаратуру вельмі рэдка ідуць людзі з горада. Гэта зразумела — улюбёнасць у роднае слова, адчування яго жывой стыхіі, яго адценняў і фарбаў, эстэтычных магчымасцей на глебе гарадскога жыцця прыдбаць цяжкавата. Дык каму ж пісаць пра горад, які зараз імкліва расце?

Сёння, праўда, літаратура (усе яе роды і жанры) вельмі чуйна рэагуе на праблему «вёска — горад». Яна з трывогаю даводзіць, як разбураецца асоба чалавека, што адрываецца ад народных маральных асноў жыцця (вёскі), арыентуючыся на рацыянальна-прагматычныя каштоўнасці (горад), і, наадварот, як вяртанне да родных крыніц духоўна акрыляе чалавека, узвышае яго. Характэрныя ў гэтых адносінах творы Івана Пташнікава, Міколы Гіля, Віктара Карамазава, Алеся Жука, Анатоля Кудраўца, Генрыха Далідовіча. У рамане Паўла Місько «Градабой» паказваецца, што прынцыпы, народжаныя працэсамі урбанізацыі, НТР (імклівы рытм жыцця, адчужанасць паміж людзьмі, брак душэўнасці, практыцызм), «даганяюць» героя ў сваёй жа вёсцы. Ён—калгасны пенсіянер Іван Іванавіч Сухавей — імкнецца ўцячы ў свой мікрасвет і сцвердзіць такім чынам сябе, давесці, што і сёння можна жыць спакойна і хораша, каб душа цешылася. Дзеля гэтага аддзяляецца ад сямейнай дачкі, жэніцца, наладжвае адухоўлены побыт. Але неўзабаве памірае, і смерць яго ўспрымаецца як паражэнне, як крушэнне ягоных спадзяванняў. Герой, па сутнасці, уцякаў назад, у даўнюю вёску з яе традыцыйнымі маральнымі каштоўнасцямі. Але дарогі туды ўжо няма, сцвярджаецца ў творы. Гэта як у вершы Дануты Бічэль-Загнетавай, гераіня якой пытаецца: «Як вярнуцца дахаты?»

Словам, пісьменнікі звычайна паказваюць вясковага чалавека як носьбіта самых здаровых, маральна высокіх норм жыцця, якія руйнуюцца пад уздзеяннем НТР. І нормы гэтыя разглядаюцца як універсальны сродак паратунку ва ўсіх драматычных сітуацыях. Такая пастаноўка пытання, хоць і заканамерная і слушная ў цэлым, аднак і досыць аднабаковая.

Гэта адчуваў А. Макаёнак, які ў камедыі «Кашмар» паказаў свайго Старога не толькі ўнутрана прывабным — маральна прынцыповым, сумленным чалавекам, але і смешным сваёй катэгарычнасцю, проста-лінейнасцю сваіх прынцыпаў. Бескампрамісная пазіцыя Старога, які верыць у сілу і дзейснасць толькі сялянскай працоўнай маралі і ўпарта адмаўляе любыя з'явы, што з ёю не стасуюцца, выглядае наіўнаю («святая прастата»!) у барацьбе з бедамі сучаснага чалавецтва і мяжуе з бяздумнасцю. Яна не вытрымлівае праверкі жыццём асабліва тады, калі Старому ў ролі прэзідэнта даводзіцца вырашаць складаныя праблемы глабальнага значэння.

(Заканчэнне на стар 6).

ЧАС ПАТРАБУЕ

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 5).

Тыпалагічна блізкі гэтаму герою Разорчык з рамана В. Гігевіча «Доказ ад процілеглага». Ён, праўда, даўно ўжо гараджанін, навуковец па прафесіі. Але моцная ў ім сялянская маральная закваска. Усяго ў жыцці ён дасягнуў цягавітасцю і настойлівасцю. Разорчык таксама непарушна кіруецца некаторымі простымі і важкімі ісцінамі. Але паступова выяўляецца, што яны не ратуюць у бурлівым віры сённяшняга жыцця. Герой усё больш адчувае яго гнятлівы цяжар, заўважае, што траціць агульную мову з калегамі на працы і нават дома з уласнымі дзецьмі, і пакутуе ад неразумення, як жыць. Адносіны аўтара да гэтага персанажа неадназначныя. Раскрываючы драматызм яго ўнутраных пошукаў, пісьменнік паказвае складанасць узаемадзеяння народна-традыцыйных і сучасных норм жыцця.

Пераважная эстэтычная арыентацыя на вясковае жыццё, якая зараз кідаецца ў вочы, вядзе да пэўнай стылявой аднастайнасці нашай прозы (і не толькі прозы), да таго, што стылістычны багаж яе застаецца зусім не багаты.

Найбольш пашыранае ў нас рэалістычна-канкрэтнае, аўтэнтычнае адлюстраванне, якое перадае натуральную плынь жыцця, яго звычайныя праявы, падрабязнасці. Традыцыя яго даўняя — ад ананімных гутарак, Францішка Багушэвіча — да Якуба Коласа, Максіма Гарэцкага, Кузьмы Чорнага... У прозе гэты кірунак выяўляецца як бытавая хроніка — разгорнута, непаспешліва, без вострых знешніх калізій, падзей, праз штодзённыя людскія справы і клопаты ствараецца адбітак жыцця. І гэтак у аднаго аўтара, у другога, у трэцяга... Возьмем такіх пісьменнікаў, як Іван Пташнікаў, Вячаслаў Адамчык, Іван Чыгрынаў, Анатоль Кудравец, Павел Місько, Янка Сіпакоў, Алесь Жук. Хоць гэта вельмі розныя творчыя індывідуальнасці, усіх іх збліжае прыхільнасць да таго ж хранікальна-бытавога пісьма. А многія іншыя празаікі, а многія маладыя аўтары? Яны, баючыся збочыць з выверанага маршруту (як жа, гэта ж амаль нацыянальны мастацкі стыль!), старанна імітуюць жывую стыхію народнага жыцця, уважліва прыкмячаюць нязначнае, што ляжыць на паверхні, не забываюць пра апавядальную раскаванасць інтанацыі, стрыманасць эмоцый, заземленасць малюнка і яшчэ — гутарковую сялянскую лексіку. І пайшло — мнагаслоўе, манатоннасць, грувасткасць, неабавязковасць многіх назіранняў. «Наша беларуская цягамоцна», як выказаўся нядаўна Міхась Тычына.

Паўстагоддзя назад Я. Колас пісаў пра стыль аднаго з тагачасных твораў, што ён «аддае нейкай архаічнасцю, томіць сваім цягучым ладам», «цячэ ...пагудкаю старасветчыны». Баюся, ці не стасуюцца гэтыя меркаванні класіка да літаратуры сённяшняй, калі бачыцца ўсеагульнае захапленне бытавым стылем, калі ён, па сутнасці, уніфікуецца.

Могуць сказаць — а вось Я. Брыль, І. Шамякін, В. Быкаў, У. Караткевіч? Іх спосабы выказвання адхіляюцца ад згаданай лініі. Так, можна тут назваць і іншых пісьменнікаў. З маладзейшых — Віктара Казько, Васіля Гігевіча, якія, дарэчы, не цураюцца і хранікальных прынцыпаў. У «Доказе ад процілеглага» гэтыя прынцыпы служаць рэпартажна-дынамічнаму ўзнаўленню жыцця, выяўленню яго маральнай напружанасці. Увогуле ж канкрэтна-бытавы стыль стаў масавым у нашай літаратуры, з чым і звязаны яе выдаткі.

Хочацца тут, аднак, заўважыць, што «бытапісальнікі» сёння найбольш развіваюць літаратурную мову (нярэдка за кошт дыялектаў, і з гэтым нельга не пагадзіцца). Але, зноў жа, развіваюць адзін з яе пластоў — размоўна-бытавы. Іншыя галіны нашай літаратурнай лексікі, стылістыкі церпяць нават страты, і культура мовы ў цэлым зніжаецца. Не без уздзеяння нашай перыёдыкі, іншых сродкаў масавай інфармацыі, якія не заўсёды адказна ставяцца да слова, у літаратурнай мове асядаюць розныя штучныя, чужародныя элементы, якія засмечваюць яе. Цяпер на кожным кроку сустракаем «бур'ян», «малыш», «плацце», «памагаць», «прадаўжэнне», «музыкальны», хаця трэба — «зелле», «малы» ці «малеча», «сукенка», «дапамагаць», «працяг», «музычны». А ўжо такія спалучэнні, як «згубіў сумленне», «пагасіў касцёр», «ажаніўся на суседцы», «пайшоў за грыбамі», «чарга ў касу за білетамі» лёгка гуляюць па старонках кніг, хоць па-беларуску трэба «страціў сумленне», «патушыў касцёр», «ажаніўся з суседкаю», «пайшоў па грыбы», «чарга ў касу па білеты».

Пытанне гэтае вялікае і патрабуе асобнай гаворкі. Ясна толькі адно — недакладна, прыблізна ўжытае слова разбурае вобраз, нішчыць яго эстэтычную энергію і выклікае недавер чытача. Я прывяду толькі адзін прыклад з мастацкага твора. У кнізе Леаніда Галубовіча «Таемнасць агню», якая атрымала высокую (і заслужаную) ацэнку крытыкі, ёсць радкі, што не раз цыталіся ў друку:

...Пакуль не скажа дзед які
З развагай аналітыка:
«Хлеб трэба сеяць, мужыкі,
Без хлеба — дрэнь палітыка».

Усё было б добра (нечакана, як гэтага патрабуюць законы паэзіі, даведзена, што «звычайны» хлеб больш важны ў жыцці, чым «высокая» палітыка), калі б... «Мужыкі» сказана не па-беларуску. І ў рэальным жыцці вяскоўцы ў «шумным гурце» не выкажуцца так пра сябе, яны скарыстаюць тут зваротак «мужчыны». Ці варта нагадваць, што слова «мужык» ужывалася ў нашай мове даўно як сінонім слова «селянін», і то часцей з адценнем нізкай маральнай ацэнкі (да чаго прычыніліся казённыя органы манархічнага рэжыму). А зараз сустракаецца толькі як размоўная форма, якая мае толькі адно значэнне — «муж», г. зн. жанаты мужчына ў адносінах да свае жонкі: «Маяго мужыка ўсё на работу клічуць, зацягаўся за работаю» (Т. Сцяшковіч. Матэрыялы да слоўніка Гродзенскай вобл. Мн., 1972, с. 290). У зборніку ж Л. Галубовіча слова гэта ў неўласцівай яму ролі сустракаецца не раз і не два. Каб жа толькі адно гэтае слова, і каб толькі ў аднаго паэта!

Наш час патрабуе ад пісьменніка павышанага пачуцця адказнасці перад літаратурай, перад грамадствам. Няхай жа і культура творчасці, культура слова будуць той сур'ёзнай меркай, якой вымяраецца сучасны ўзровень пісьменніцкай дзейнасці, той дзейнасці, значэнне якой даўно выйшла далёка за межы гэтай прафесіі.

г. Гродна.

«КАБ СЛОВА СВЯЦІЛА, ЯК ЗОРКА...»

«Раса-расінка» — чацвёрты зборнік вершаў Марыі Шаўчонак. Для паэта гэта дастатковы шлях, каб выразна заявіць пра сябе, засведчыць адметнасць свайго паэтычнага голасу. Імя М. Шаўчонак не ў першым шэрагу паэтэс маладзейшага пакалення, без творчасці якога ўжо нельга ўявіць сённяшні стан нашай паэзіі. Такая нерашучасць і сарамлівасць крытыкі ў адносінах да названай паэткі мае свае падставы.

Чым можа быць адметны паэт? Перш за ўсё — сваім непаўторным бачаннем свету. Вось ён адкрыў нечаканы зрэз сацыяльнай тэмы, засведчыў дакладны малюнак прыроды; заўважыў душэўны зрух, убачыў прыгожае там, дзе ніхто не заўважае, падсвяціў сучаснасцю мінулае, наблізіўшы яго да нашых дзён, раскрыў таямніцу душы, спыніў цудоўнае імгненне...

Зборнік «Раса-расінка» дае падставу сцвярджаць, што паэтку хвалююць вобразы роднага краю. У малым М. Шаўчонак імкнецца ўбачыць вялікае, значнае, тонка перадаць душэўны стан. Сваім, сцішаным голасам гаворыць яна пра перажытае і ўбачанае.

То раптам бяда, то няўдача
Слязой неспакойнай гараць.
Ад гора чужога заплачу,
Сваё паспрабую схаваць.

Такому шчыраму прызнанню верыш. Адчуваецца, што гэта не поза, а натуральнае, непадробнае пачуццё. І пачынаеш услухоўвацца ў гэты не гучны, але даверлівы голас мужнага чалавека, які не застаецца абыякавым да чужой бяды. Такая здольнасць да суперажывання, уменне падзяляць гора сваёй спагадай, дапамогай падкупляюць. Бачыцца чалавек багатай душы і высакародных памкненняў.

Помніцца, яшчэ ў першай кнізе М. Шаўчонак «Белая ластаўка» выразна і непаўторна прагучаў матыў нявернасці. І гэта былі не слязлівыя вершы. У радках прачытваліся горыч, пакута маладой душы, якая дзялілася сваім сардэчным болем. Не было ў ёй безвыходнага адчаю. Толькі шчымлівая крыўда не давала спакою, турбавала, сумавала, як бы папярэджвала — не паўтараць памылак.

Шмат пішацца, асабліва ў маладыя гады, пра вечнае і дарагое пачуццё. І кожны раз яно неяк па-новаму высвечвае душу.

Што мне доўгія цёмныя ночы
І маўчанне халоднай сцяны,
Калі сэрца паверыць не хоча,
Што між намі навекі яны.

Гэта не альбомныя прызнанні, а выпакутаванае чалавекам, якога пакрыўдзілі, не зразумелі. Ды ўсё ж ён верыць у светлае і высокае. Верыць свайму адзінаму.

Лепшыя вершы паэткі не здзіўляюць нечаканымі параўнаннямі, шматзначнасцю падтэксту. Яна імкнецца да прастаты, да значнасці думкі, шчырасці. За высокі эталон жыццёвай праўды аўтар «Расы-расінкі» бярэ слязу, ёй хочацца, «каб слова свяціла, як зорка».

Каму, як ні слову даверыць,
скажы,
Усё, чым жывём, чаму рады?
Падумай, складанасць якая
ў слязы?
Ніякай. Уся яна—з праўды.

Паэтцы лепш удаюцца малюнкі прыроды. Пейзажныя вершы настройваюць на аптымістычны лад. Яны прывабяць таго, хто не глухі душою. М. Шаўчонак дала зрокавае ўвасабленне маладога шчасця, нёманскай раніцы, гневу маланкі, сцішанасці восеньскай ночы, зіхценню веснавых вясёлак-праменняў. Тут пасведчаць вершы «Бегла дзяўчына па кладачцы», «Яшчэ над Нёманам спакой», «Аблачынкі белы парасон», «Аб падаконнік стукне глуха», «Чым вясна багацейшай была?»

У большасці вершаў М. Шаўчонак праслухоўваецца пульс нашага часу. Яны даносяць голас душы, якая імкнецца да чысціні, перадаюць настрой ад хараства жыцця, паўнаты шчасця, выяўляюць надзею на радасны дзень.

Як першы раз гляджу на свет,
Стаю затоена ў здзіўленні,
Запомніць трэба ўсё навек,
Сабраць, адчуць усе адценні...

А сярод кветак і травы
Такое сонечнае неба!
Дзівіся, радуйся, жыві—
Нічога лепшага не трэба.

І раптам, далёкі ад замілавання і захаплення, акрэсліваецца зусім іншы—балючы настрой. Паэтка ў вершы «А быццам—і людзі» абураецца супраць тых, хто «баіцца шчырасці, як беднасці», хто «сябруе ў адпаведнасці: ты—мне, і я табе—як ты». Магчыма, крыху абагульненыя штрыхі сытага шчасця, але асуджальна-выкрывальны пафас радкоў не пакідае раўнадушным. Такая грамадзянская чуласць да праблем сучаснасці акрыляе паэзію, дорыць ёй той агонь, якім сагрэецца сэрца. Нялёгка сумленнай, чулай душы, але ўжо тое, што яна не маўчыць, не згаджаецца са спажывецкім настроем, выклікае да яе павагу і сімпатыю.

На шырыню людскіх настрояў выходзіць М. Шаўчонак у вершах «Прыхавана трывога ў маўчанні ракет», «Памяць», «Дыялог з небам».

Трывожна на зямлі ва ўсе вякі,
І з кожным днём усё
трывожней свету,
Зямляне, дарагія землякі,
Чаму ж на нас нацэлены
ракеты?

Па ўсёй зямлі ідзе нябачны
бой,
Жыццё і смерць, паміж якімі—
людзі.
А новы дзень глядзіць на нас
з табой,
Няўжо для ўсіх жывых
яго не будзе!

Адчуваецца, як стаіць пытанне Жыцця. І гэта не палахлівае ўяўленне творцы. Сёння, як ніколі раней, стала жыццёвай неабходнасцю пісаць пра катастрофу, што навісла над зялёнай Планетай. Ды не спакойна пісаць—а крывёю сэрца, сілаю сумленнага голасу. Нельга аптымістычна маўчаць, бо пагроза ядзернага пажару смяртэльная ў сусветным маштабе. Не першая піша пра гэта М. Шаўчонак, і яе радкі не губляюцца ў антываенным выступленні паэтаў. Яе «Дыялог з небам» сведчыць, што аўтар умее запамінальна выказваць сваю трывогу і неспакой за ўсё жывое на зямлі. Неба ў паэткі—сама справядлівасць разумнага чалавека—так адказвае людзям:

— Не забывайце—я без сілы,
Залежыць толькі ўсё ад вас.

Кожны паэт хоча, каб яго пачулі, паверылі яго высновам, адным словам,—паглядзелі на акаляючы свет яго вачыма. Бяда, калі такога задушэўнага дыялогу не атрымліваецца. Тады адбываецца размова, пры якой адзін суразмоўнік не слухае, бо той, хто гаворыць, яго не зацікавіў.

У зборніку «Раса-расінка» трапляюцца і такія вершы, у якіх М. Шаўчонак захацела апаэтызаваць усё, што ўбачыла. Нават назвы вершаў гавораць пра гэта: «Закрасавала жыта», «Васілёк», «Сіла кветкі», «Гродна», «Нёман», «Новая вёска», «Вясёлка», «Дзве ракі», «Красавік». На жаль, пералік на гэтым не канчаецца. Ніхто не супраць такой канкрэтнасці.

М. Шаўчонак. Раса-расінка. Вершы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1985.

М. УЛАШЧЫК. Уводзіны ў вывучэнне беларуска-літоўскага летапісання. На рускай мове. М., «Наука», 1985.

Мікалай Улашчык шмат часу аддаў вывучэнню беларускага летапісання. У 1975 і 1980 гг. ён выдаў беларускія летапісы ў 32-м і 35-м тамах Поўнага збору рускіх летапісаў. Ён сам знайшоў і апісаў Ленінградскі і Краснаярскі спісы «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай».

У новай кнізе вучоны называе помнікі нашай даўніны беларуска-літоўскімі летапісамі. Беларускімі таму, што амаль усе яны напісаны па-старабеларуску. Літоўскімі таму, што ўсе яны створаны на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага і датычаць гісторыі гэтай дзяржавы. У раздзеле «Знаходкі і публікацыі летапісаў» М. Улашчык апісвае 15 летапісаў і тым самым дае наступным даследчыкам надзейныя арыенціры ў вывучэнні гісторыі археаграфіі. Навуковай навізной вылучаецца раздзел пра зусім недаследаваныя гарадскія летапісы XVII—XIX стст.

Летапісанне — адна з самых сумных старонак нашага пісьменства. Не дайшлі да нас не толькі самыя раннія летапісы (прыкладам, Полацкі), але згубіліся або захаваліся няпоўнасцю і больш познія, у тым ліку і беларуска-літоўскія. Аўтар паставіў сваёй мэтай вызначыць, наколькі гэта магчыма, ступень страчанага. Дзеля гэтага М. Улашчык разглядвае

Ды засмучае тое, што аўтар у асноўным зарыфмоўвае факт, з'яву, якія не становяцца яе лёсам. Здаецца, і піша яна пра роднае, блізкае, дарагое, але яно не ўражвае, не кранае сэрца ні пачуццём, ні вобразамі, ні паэтычнай дэталлю. Такое роўненькае пісьмо нярэдка пераходзіць у гладкапіс, дзе хапае квяцістых слоў, а глыбокіх думак і пачуцця малавата.

Што адкрываецца ў такіх радках: «Зямля цвіце, зямля спявае», з поля «бярэ свае вытокі заспелы колас — дабрадзей», «сімвал роднага поля, васілёк сінявокі», Гродна — «горад самы старажытны, горад самы малады», «Нёман — вечна малады», «Родная вёска, больш такой ні адзінай нідзе», «Красавік, красавік, малады, імклівы»? Паэтка нібы не адчувае і не заўважае, што засяроджвае ўвагу на даўно вядомым, перапетым, дзе агульныя словы засланяюць кволае зярнятка паэзіі. Вось якая адметнасць надаецца дарагой сэрцу рацэ Бярэзіне: «спяшае да Дняпра» (так і просіцца — Волга ўпадае ў...), «калісьці рыбу тут лавіў яшчэ прапрадзед мой далёкі». Ці хоць бы такі веснавы ўсхліп, дзе радкі запаўняюцца пустым наборам слоў:

Вясна! Якое гэта слова!
Вясна!
Падумайце—вясна!

Шмат клічнікаў, ды яны самі па сабе не ствараюць непаўторнага веснавога настрою. Але ж у іншых вершах змагла паэтка заўважыць, як напрадвесні «кругі вакол камля, як ад бяссоння, пачарнелі», удалося ёй зазірнуць і ў крыніцу, «дзе кветкай сонца прарасло»...

Нельга не сказаць і пра паўторы. Паэтка так упадабала слова «песня», што яно пераходзіць амаль з верша ў верш. І гэта не мастацкі прыём, а самы звычайны штамп, што прыводзіць да аднастайнасці: «Ён узышоў сцяблінкай тонкай ад лепшай песні», «Твая родная песня, як забытая казка», «Мне песня тым крылом служыла», «Хіба ж песня яго абміне», «Я заўсёды была неразлучная з песняй». І тут яшчэ не канчаецца «песня». Калі яшчэ дадаць, што «У расе-расінцы» спяваюць зямля, душа, белы вяночак, іграе вясна і весялун-кавылёк, калі чуецца «дажджу доўгачаканы спеў», «асенне-задымлены спеў верасоў», «спеў верасовы — як вечны спеў», «соснаў спеўны парасон», дык такой музычнай настроенасці аж занадта для адной кніжкі.

У сваёй творчасці М. Шаўчонак неаднаразова звяртаецца да слова. Паэтка ў пошуку такога скарбу. І хочацца верыць, што яе высновы пра слова не застануцца прыгожай дэкларацыяй:

З яго жыццё бярэ свае вытокі
І дорыць свае лепшыя світанні,
І пошукі, і веру, і чаканні,
І ўзлёт душы бязвоблачна высокі.

Юрась СВІРКА.

СІЛУЭТЫ НАД БЫЛОЙ НЯМІГАЙ

«...Пачнём наш шлях раніцай, калі толькі ўзыходзіць летняе сонца і абуджаецца стары горад. Пойдзем па вуліцах і завулках, паходзім па Замчышчы, плошчах і старадаўніх дварах, пакуль не патухне чырвонае неба над былой Нямігай і не запаляцца першыя зоркі».

Як даўно чакалі мы такой кнігі і як не ставала яе! Гэта на поўную сілу адчулася, бадай, толькі цяпер, калі, нарэшце, запоўніўся яшчэ адзін прагалак у нашай літаратуры.

Кніга пра Мінск. Кніга, якая робіць вочы відушчымі, а сэрца — чуйным. Кніга, якая дорыць нам такое неабходнае пачуццё трывушчасці. Кніга, што вяртае нам нашу памяць і законны наш гонар.

Залішне высокія словы? Мінчане зразумеюць. Не ў адной мяне, відаць, узнікала параўнанне гераічнай і трагічнай гісторыі Мінска з лёсам славутай Нямігі — прыкапанай зямлёй, залітай асфальтам. Так ужо атрымалася, што з гісторыяй свайго больш чым дзевяцісотгадовага горада мінчане знаёмыя, напэўна, у найменшай ступені, калі параўнаць іх з жыхарамі любога іншага такога ж старажытнага паселішча.

Нельга, вядома, сказаць, што літаратуры пра гістарычную спадчыну Мінска раней наогул не было. Летась у выдавецтве «Навука і тэхніка» выйшла грунтоўнае даследаванне Т. Чарняўскай і А. Пятросавай «Помнікі архітэктуры Мінска XVII — пачатку XX ст.» (на рускай мове). Праўда, разлічана яно было відочна не на масавага чытача — тыраж быў усяго 4 тысячы экземпляраў. І калі параўнаць тое выданне з кнігай Зянона Пазняка, можна сказаць, што там была акадэмічная лекцыя, тут — захопленая гаворка шчырага сябра, якому мала проста падзяліцца з табой ведамі, а трэба абавязкова ўзяць цябе за руку, правесці вулкамі і плошчамі і ўпэўнена адхінуць заслону часу: «Глядзі, колькі мы маем!» Адчуваеш беспамылкова: гэты размоўца — аўтар будзе вельмі радавацца твайму адкрыццю старога Мінска.

Чытаць гэтую кнігу хочацца менавіта ў тых мясцінах, пра якія ідзе гаворка. Ва ўсялякім выпадку, перачытваць — абавязкова там. Не толькі для таго, каб мець перад вачамі натуральныя ілюстрацыі да тэксту, а проста каб хоць неяк сарыентавацца, не заблукаць у раптоўна адкрытым табой горадзе. Горадзе, якога ты ўчора зусім, як высветлілася, не бачыў. Горадзе, у якім ёсць Замчышча і Стары горад, дзе велічна ўзносяцца ратуша, дамініканскі касцёл і цэлы ансамбль езуіцкага комплексу, што быў самым значным дасягненнем архітэктуры XVIII ст. у Мінску... Ды што там просты пералік, хай сабе і на цэлы аркуш! Самае моцнае ўражанне ад кнігі, мабыць, у тым, што пасля яе прачытання нават непадрыхтаваны чытач назаўсёды пераконваецца: горад, у якім ён жыве, калісьці славіўся архітэктурнымі помнікамі сусветнай вартасці.

Калісьці... Гісторыя тут рэдка мела літасць да працы рук дойлідаў. Але хіба толькі яна адна? Колькі шкоды прынесла абыходкавае меркаванне, што ў Мінску адсутнічае гістарычная спадчына і, значыць, няма чаго зберагаць. Ва ўступнай частцы аўтар слушна называе прычыны, якія выклікалі такую грамадскую думку. Што ж, будзем спадзявацца, што кніга шмат каму дапаможа змяніць гэтую думку на супрацьлеглую.

«Увесь гэты ў пераносным і канкрэтным сэнсе слова жывапісны фасад (Святадухаўскай царквы. — **В. Е.**) уяўляў сабой нібы маляўнічы іканастас, вынесены на плошчу. «Падобны сінтэз архітэктуры і жывапісу— заўважала вядомы савецкі гісторык архітэктуры А. Д. Квітніцкая, — не сустракаецца ў дойлідстве суседніх краін і з'яўляецца ўкладам Беларусі ў агульнаеўрапейскае будаўнічае мастацтва эпохі рэнесансу». Як паказалі апошнія даследаванні, такі прыём быў не выпадковым і не адзінкавым прыкладам у мінскай архітэктуры таго часу...»

Зрэшты, цытаваць гэтую кнігу — справа аднолькава ўдзячная і безнадзейная. Высокая адукаванасць аўтара ў гісторыі і архітэктуры выдатна паядналіся з эмацыянальнасцю, займальнасцю, публіцыстычнасцю ў лепшым сэнсе, грамадзянскасцю і патрыятызмам. Асобныя месцы кнігі гучаць як вершы ў прозе. Прыемна, што аўтар рупна ставіцца да мовы, уводзіць у навукова-папулярны ўжытак такія выразныя і сакавітыя словы, як «роўніца», «лёхі», «сутарэнні», «рошчына», «дахоўка».

Можна толькі вітаць, што менавіта такая кніга пра гісторыю і архітэктуру старога Мінска адрасавана старэйшым школьнікам (гэта абсалютна не сведчыць, што яна менш прыдатная для дарослых!). Памятаеце, як сказаў Сухамлінскі: «Розум выхоўваецца розумам, сумленне — сумленнем, адданасць Радзіме — сапраўдным служэннем Радзіме». Ці варта дадаваць, што і нас, дарослых, часам таксама трэба выхоўваць?..

Шкада толькі, што ў кнізе З. Пазняк ні словам не абмовіўся пра сваю канцэпцыю ўсприймання архітэктуры чалавекам, пра функцыю ў гэтым плане помнікаў гістарычнага дойлідства, пра ролю вертыкалей у гарадской забудове. Тым больш, што абодва раздзелы кнігі якраз і наводзяць на гэтую думку. Прыгадваецца надзвычай цікавае выступленне аўтара на леташнім навукова-практычным сімпозіуме ў Інстытуце філасофіі і права АН БССР. Там ён, у прыватнасці, пераканаўча даводзіў, што вертыкальныя, стромкія сілуэты, скіраваныя ўвысь дахі выклікаюць пачуцці ўздыму, узнёсласці, дынамізму, у той час як пляскатыя грувасткія аб'ёмы сваёй статычнасцю спараджаюць прыгнечанасць духу.

Крышачку засмучае і тое, што ў кнізе не зусім дакладна ўжываюцца гістарычныя тапонімы (невядома, зрэшты, ці гэта віна аўтара) — «Мінск» замест «Менск» (да XIX ст., а таксама ў 1920—1930 гг.), «Троіцкае прадмесце», замест спрадвечнага «Траецкага». Гаворачы пра гістарычную эпоху, трэба, думаецца, усяляк набліжаць чытача да яе атмасферы. Чамусьці ж палічыў патрэбным паэт Леанід Дранько-Майсюк, публікуючы сёлета ў жнівеньскім нумары «Полымя» верш пра 1920-я гады, назваць яго «У Менску». Бо ў гэтым не прыхамаць аўтара, а аб'ектыўная перадача гістарычных рэалій.

...Мы перачытаем гэтую кнігу не адзін раз. Не адзін раз парадуемся афармленню Я. Куліка і цудоўным аўтарскім фотаздымкам. І не раз, на жаль, выклічуць непрыемныя эмоцыі такія «дадаткі», як карэктарскія памылкі і скручаная ў трубку вокладка... Дарэчы, такая вокладка з наклееным на адзін бок цэлафанам не ўпершыню псуе настрой чытачам. Яна настолькі нязручная ў карыстанні, ажно дзіўна: няўжо гэтага не разумеюць самі выдаўцы.

І ўсё ж хочацца яшчэ раз вярнуцца да думкі, з якой пачыналіся гэтыя нататкі: як добра, што мы маем цяпер гэтае выданне, гэтую кнігу для ўсіх. Яна — і своеасаблівы энцыклапедычны даведнік, і захоплены экскурсавод, і палымяны прамоўца. І яшчэ: па-добраму зайздросціш сённяшнім 14—17-гадовым. Для іх зусім інакш прагучаць, напрыклад, звесткі, што «сістэматычнае археалагічнае даследаванне слаёў XVII — першай паловы XIX ст. пачалося ў Беларусі практычна толькі ў 1970-х гг.», што «археалагічна-архітэктурныя раскопкі старога Мінска пачаліся ў 1978 г.», што чакаюць свайго ўзнаўлення шмат якія манументальныя помнікі горада і ўжо прынята пастанова аб рэканструкцыі старога Мінска і рэстаўрацыі яго гістарычнай забудовы... Для людзей дарослых гэта проста вельмі прыемныя падзеі, што адбываюцца і маюць адбыцца на нашых вачах. А для іх, магчыма, — іншы пачатак лёсу: справа ж, па сутнасці, пачалася нядаўна і таму ўдвая прыцягальная. Вядома, ніколі, не позна выбіраць добрую дарогу. Але наколькі лепей, калі шлях пачынаецца раніцай!

Віялета ЕФІМЕНКА.

З. Пазняк. Рэха даўняга часу. Кніга для вучняў. Мінск, «Народная асвета», 1985.

Добрае пачынанне

Здаецца, у нейкай ступені вырашана праблема аператыўнага выдання твораў паэтаў, якія толькі пачынаюць уваходзіць у літаратуру — у выдавецтве «Мастацкая літаратура» пабачыў свет зборнік «Маладыя галасы», у якім прадстаўлены дваццаць маладых аўтараў, што ў 1983—84 гадах хораша заявілі аб сабе ў рэспубліканскім перыядычным друку. Дарэчы, большасць з іх дэбютавалі на старонках «ЛіМа».

Сапраўды, зборнік крыху нечаканы. «А нечаканасцю кніжка гэтая пачалася ўжо тады, — піша ў прадмове «...І прадоўжыцца час хвалявання!..», названай радком з верша аднаго з аўтараў С. Шах, Алег Лойка, — калі ўзнікла яе задума, узнікла ў саміх выдаўцоў, да якіх звычайна са сваімі першымі рукапісамі ідуць самыя маладыя».

Хто ж яны, самыя маладыя ў беларускай паэзіі? Студэнты С. Кавалёў, Г. Ракоца, У. Сіўчыкаў, М. Скобла, В. Жданко, ваеннаслужачыя А. Бадак і М. Шайбак, настаўнікі Э. Акулін, М. Гайцюкевіч, С. Рублеўскі, І. Сабачэўская, А. Шушко, інжынер С. Амяльчук, мастак А. Валюк, машыніст вежавага крана М. Гудкова, памочнік машыніста чыгункі А. Жамойцін, работнік міліцыі В. Габрусёва, навуковы супрацоўнік музея С. Сокалаў, журналіст М. Жданові.

А калі прыняць пад увагу, што афармію кніжку малады мастак У. Адамчык, рэдагаваў малады паэт Л. Дранько-Майсюк, — смела можна сказаць, што з выхадам яе адбылося сапраўднае свята творчай моладзі.

С. ВІРЗОЎСКІ.

ТАРАН ВЫБІРАЛІ СМЕЛЫЯ

У гісторыі ёсць нямала прыкладаў выключнай мужнасці і гераізму, але паветраны таран, як сродак перамогі над ворагам, знайшоў прымяненне толькі ў нашай авіяцыі. Звыш 600 разоў паветраныя сокалы, рызыкуючы жыццём і часта гінуўшы, збівалі гэтым прыёмам самалёты праціўніка. Пра некаторых з гэтых герояў расказваецца ў кнізе нарысаў Л. Жукавай «Выбіраю таран», выпушчанай у бібліятэцы часопіса «Молодая гвардия».

Зборнік знаёміць і з подзвігамі, што здзейснілі лётчыкі, якія служылі перад вайной у Беларусі. Прынамсі, адзін з іх Дзмітрый Кокараў («У першую раніцу вайны») загінуў, абараняючы заходнія рубяжы.

Нарыс «Чатыры перамогі Барыса Коўзана» прысвечаны Герою Савецкага Саюза, нашаму земляку Б. Коўзану, які на подступах да Масквы зімой 1941—1942 года чатыры разы тараніў фашыстаў, прытым двойчы на адным і тым жа самалёце.

П. ЗАЙЦАЎ.

польскія хронікі, і ў першую чаргу «Хроніку» М. Стрыйкоўскага, у аснову якой клаліся беларуска-літоўскія летапісы. Асаблівай ўвагі заслугоўвае тое, што вучоны прыцягнуў да параўнання кнігу «Пачаткі», напісаную М. Стрыйкоўскім раней за «Хроніку» і надрукаваную толькі ў 1978 г.

Пры разглядзе матэрыялаў М. Стрыйкоўскага, як і ў наступным раздзеле (пра так званую легендарную частку летапісаў), даследчык асвятляе вельмі важныя пытанні, перадусім пытанне аб працэсе ўтварэння Вялікага княства Літоўскага. Не заўсёды можна пагадзіцца з той інтэрпрэтацыяй гістарычных падзей, якую дае М. Улашчык. Аўтару варта было б паказаць тыя канкрэтныя палітычныя ўмовы, што склаліся ў Вялікім княстве Літоўскім і абумовілі канчатковае афармленне легенды аб рымскім паходжанні вялікіх князёў літоўскіх, продкі якіх нібыта высадзіліся ў Жамойціі і паступова пранікалі ў Літву, а пасля занялі Навагрудак, Полацк і іншыя беларускія землі. На нашу думку, дзяржаўная ўлада ішла не з Жамойціі і Літвы ў Навагрудак, а, наадварот, з Навагрудка ў Літву і Жамойцію. Апошнім часам у літаратуры ўжо гаварылася аб збіранні суседніх земляў вакол Навагрудка, што і вызначыла яго ролю як першай сталіцы Вялікага княства Літоўскага. Шмат увагі гэтаму пытанню ўдзяліў у сваёй кнізе і М. Улашчык. Вось чаму непераканальна гучыць заўвага, што палітычная роля гэтага горада ў летапісах перабольшана. Справа, відаць, не ў тым, што складальнікі легенды ставілі сваёй мэтай узвысіць Навагрудак. Яны проста не маглі абысці яго вялікага значэння ў мінулым. У XVI ст. яшчэ добра памяталася пра гэта, хутчэй за ўсё яшчэ захоўваўся Навагрудскі летапіс, існаванне якога даказваў савецкі гісторык У. Пашута. Стваральнікі легенды заднім чыслом садзілі ў Навагрудак міфічных жамойцкіх князёў, каб менавіта ім за кошт Навагрудка прыпісаць заслугі ва ўтварэнні дзяржавы і атрыманні перамог над рознымі ворагамі.

Для таго, каб правільна зразумець працэс утварэння Вялікага княства Літоўскага, трэба высветліць, дзе была тагачасная Літва. Аўтар прытрымліваецца традыцыйнага погляду, што Літва тады знаходзілася ва ўсходняй частцы сучаснай Літвы. У процівагу гэтаму было выказана меркаванне, што яна знаходзілася на тэрыторыі Беларусі ў Верхнім Панямонні. Аўтар адмаўляе гэта, спасылаючыся на пазнейшыя паведамленні, якіх ён, на жаль, не працытаваў. Летапісы сведчаць, што Літва суседзіла з Мінскім, Навагрудскім і Пінскім княствамі. Сведчаць пра гэта, думаецца, і назвы вёсак Літва ў Слонімскім, Ляхавіцкім, Уздзенскім, Стаўбцоўскім і Маладзечанскім раёнах. У «Пачатках» М. Стрыйкоўскага таксама гаворыцца пра існаванне Панямонскай Літвы. Праўда, аўтар лічыць, што пад ёю трэба разумець тэрыторыю на поўнач ад Гродна. Але калі запіс у М. Стрыйкоўскага параўноўваць са сведчаннямі з усходнеславянскіх летапісаў, дык з такім поглядам М. Улашчыка цяжка згадзіцца.

Адзначаныя намі спрэчныя мясціны ў кнізе М. Улашчыка ніколькі не змяншаюць яе значэння як важнай вяхі ў вывучэнні беларускага летапісання. Вартасць яе і ў тым, што яна высветліла шэраг пытанняў, якія павінны прыцягнуць да сябе пільную ўвагу нашых даследчыкаў.

М. НАВАСЕЛЕЦ.

ПАЭЗІЯ

Ніна МАЦЯШ

●

А ты жыві, каханы мой, жыві.
Хай журавель нарэшце дасца ў рукі.
Я забяру ў магілу тыя мукі,
Што выпалі нам на кастры любві.
Ад золі сэрцайка сваё адхукай:
Жыві, каханы мой, жыві!

На свеце гэтым шмат харашыні.
Хоць людзі ў свеце гэтым—тое голле,
Па-над якім вятрам бяды скуголіць
Усцяж, і ноч у ноч, і дзень пры дні.
Ці чалавек задуманы для болю?
Як ён жадзён харашыні!..

Не пасягнуць мне розумам маім
Тваіх намераў велічных, Прырода.
Жыццё дала—не папытала згоды.
Усе цацанкі-абяцанкі—дым.
Жыццё бярэш,—і мне зусім не шкода
Аднойчы развітацца з ім.

Бо што б мяне прызеляніла тут?
Якая ўжо мяне чакае радасць,
Як дружны род мой расхітала здрада,
Як дзецьмі не ацеплены мой кут,
Як песенны мой дар не мае ўлады
І над драбнейшаю са смут?..

А ты жыві, каханы мой, жыві.
Хай сэрцу будзе да каго хіліцца.
Хай жураўлём абернецца сініца.
Сваю шчаслівай долю назаві.
Хай светла збудзецца, што светла
сніцца,—
Жыві, каханы мой, жыві!

Павучок

Сшалець ад радасці—як недарэчна,
Як гэта жалю варта, сапраўды,
Аслепнуць і забыць, што вечна, вечна
Ты тут на павуцінку ад жуды.

Падцяты ў самым сонцы, і не сцяміш,
Як апынешся зноў у чорнай яме...

Няхай не трызніцца, што ты тут—волат!
Не мроіцца ўсёўладдзе ўласных рук!
А вось пабач, які ты босы-голы!
Паслухай вось, бяссільны, сык гадзюк!..

Цябе шкадуюць проста адмыслова.
А рынуцца к табе хоць хто гатовы?

Варушыцца надзеі павучок...
Зноў выштукуеш залаты гачок?..

●

А можа, ўдасца, мо сябе ўтаймую,
Душу і цела ў розуме злучу?
І лета доўгае перазімую,
За халады пакорай заплачу.

Пасля цяжкіх, бязлітасных агледзін
Пачуццяў, што пакутай параслі,
Вярнуся ў час, які мне шчэ адведзен
На гэтай пакрываўленай зямлі.

Шчэ закрасуюць буйна краскі ў лузе,
Шчэ завіруюць снежныя віры,—
Спакойная і шчырая, вярнуся
З людзьмі пра шлях і долю гаварыць.

І падстаўляць сваё плячо слабое,
Дзе хоць каго паратаваць змагу.
Мы ўсе—з любові, ўсе мы—да любові,
А як жа мы прад ёю ўсе ў даўгу!..

То, можа, ўдасца, мо сябе ўтаймую,
Душу і цела ў розуме злучу,
І неяк жытку гэту дазімую,
І новай гэтакай не захачу.

Так званаму «рэалісту»

Бядуеш: не цямлю як след,
Што свет скрозь ілжівы, злачынны.
Сама яго трохі звучыла.
Не трэба мне лекцый пра свет.

Ён часам папраўдзе турма,
Дзе людзі бязлітасна злыя,
Дзе сэрцы такія малыя,
Нібыта й зусім іх няма.

Дзе кожны адно аб сабе
Пыхліва, хапужліва дбае,
З уявай убогай аб раі,
Усё ў сваю норку грабе...

Ды гэта ж ад кожнага з нас,
Ад сэрца й сумлення залежыць:
Дабру нашы сцежкі належаць,
Ці зло мае сыты папас.

Як падумаць. Сабе самой

А як падумаць:
Гэта ж колькі іх, людзей тых, на зямлі,
Што нарадзіліся з табой адначасова—
У той жа год, у той жа самы дзень,
у тую ж самую гадзіну!..

То няўжо
Дарожкі ўсіх-усіх іх праляглі
Праз кушчы райскія,—
Адно т а б е
Даводзіцца брысці ледавікамі гора?..

Няўжо нікога больш,
Адно ц я б е
Пякельная тут мучыць смага,
Бо ўсе жаданыя азёры
Паблісківаюць саланчакамі,
Як толькі прыпадаеш ты да іх?..

Няўжо адзіна т ы
У знемагальным пошуку сцяжыны,
Якая вывела б з сіроцтва?..

Аж смешна, як падумаць!
. . . . . .
І ўжо лягчэй ісці
З усімі разам.

Не нахлусі

Змалку мне доля казала мая:
Трэба вучыцца без радасці жыць.
Горам карала, каб верыла я,
Быццам няма мне тут чым даражыць.

А ты не спалохаўся гэтае мовы,
Птах мой вясновы.

Ты прыляцеў —
і наледзь тугі
Змыла, нібыта яе й не было!
Зморана дзень, беспрасветна-даўгі,
Ружавым цветам уміг завіло!

Ружа ніводнай калючкай не коле!
. . . . . .
Не нахлусі гэтай радасцю, доля!..

●

... А што радок, ён выжыве—ці не.
А ты жывы. Табе са мною светла.
І я ўжо знаю, як сюды імкне
Душа тваёй сцяжыны—
з будніх нетраў.

І тут ён, будзень, толькі—на дваіх.
Таму і ўмее ён рабіцца святам.
І я ўжо знаю, што з хвілін маіх
Той рэдкі міг мой—
самы найкрылаты.

О, не радкі, а ты мне—канавое,
Калі й радок вось зноў жывы табою...

Дарожнае. Па свяце паэзіі ў Крошыне

Паварот адзін, другі, шчэ трошкі—
І схаваўся між палёў-лугоў
Задуменна вераснёвы Крошын
З самавітай люднасцю яго.

Крошын той, што шчэ завуць
Крашынам,
Шчэ куточак роднае зямлі,
Дзе ліхота лёс людскі крышыла,
Дзе ліхоту людзі амаглі.

Дзе суровай праўдаю нямрушчай
Павявае нават ад кладоў,
Што народнай памяці не струшчыць
Коламі няўцямства і гадоў.

Дзе, каб душы памаразь не ўкрыла,
Злётвае даверліва да рук
З жырандолі Паўлюка Багрыма
Чорны ад зажытага жаўрук.



У ГЛЫБІ ПАЛЕССЯ.

Фота С. РАМАНЧУКА.

З РАБОЧАГА СТАЛА ПІСЬМЕННІКА

У КЛАЎДЗІ Антось, здавалася, памаладзеў, аж зяяў-свяціўся знутры і звонку. Надта ж кідалася ў вочы, што быў ён заўсёды нязвыкла чысты, паголены, прыбраны, як на свята, што былую нелюдзімасць і панурасць з яго як рукой зняло. Усе глядзелі на гэтыя змены, як на якое дзіва. Яны, гэтыя змены, канечне ж, не маглі не даваць зачэпкі для розных жартачак-кепікаў, без якіх не абыходзяцца мужчыны, асабліва—як трапляе ў кампанію прызнаны вясковы вастраслоў, на якога, што б ён ні казаў, ніколі ніхто не злуецца.

— То як там у цябе, Антось, па маладой часці? — цвялліва «пад'язджалі» да яго. — Ці скора на хрысціны паклічаш?

— А думаеш, я такі зломак, як ты? — не палез за словам у кішэню Антось і тут жа пачаў выдаваць жартаўніку такое, ад чаго прысутныя аж поўзалі са смеху, а той і сам не рады быў, што зачапіў.

І гэта таксама было дзіва, бо ніхто не памятаў, калі апошні раз смяяўся-жартаваў пануры і нелюдзімы Антось і, канечне ж, забыліся, што ў яго можа быць ого які востры язык: лепш не трапляйся, не кладзі палец у рот — па локаць адхопіць.

І Клаўдзю пры Антосю гэтаксама бы хто падмяніў. То хадзіла, ледзьве цягаючы ногі, а тут пажвавела, павесялела, усё вакол яго лагодненька: паеш, Антоська, адпачні, Антоська, не ўлягай гэтак, Антоська, — досыць таго сена, з калгаса дадуць, досыць тых дроў, на дзве зімы стане. Аднак чым настойлівей стрымлівала яна, тым больш свярбелі рукі да работы ў Антося, тым болей няўлежна было яму.

— І чаго гэта калгас павінны даваць, калі сам магу назапасіць, — казаў ён і тупаў кожную раніцу дэбаць траву па хмызняках, прыдарожных канавах.

Каб не прасіць у брыгадзіра з-за нейкай дробязі каня, змайстраваў тачку на старых веласіпедных колах, вазіў адзін альбо ўдваіх з Клаўдзяй тое сена. Назапасілі—у гумно не ўмясцілася, два стажкі паставілі ў агародзе. А дровамі Антось напакаваў падпаветку, абклаў хлеў і гумно з усіх чатырох бакоў.

Адно, чаго не мог зразумець, з чым не мог змірыцца ён, была Клаўдзіна ўпартасць — і нагой не хацела ступіць, за вярсту абыходзіла яго сядзібу. Нават калі паспелі яблыкі, змушаны быў сам абіраць, збіраць на зямлі і вазіць мяхамі да яе хаты, хоць, як ён лічыў, на добры розум можна было сушыць і на месцы.

— Навошта, Антоська, каб людзі чорт ведае што думалі, языкамі мянцілі,— казала яна, не паддаючыся ні на якія ўгаворы.

Мяшочкі з сушкамі яна перадавала Антосю, строга наказваючы, каб усе да аднаго адсылаў па пошце сваім дзецям.

— То давай і тваёй Марусі пашлём, — чаго гэта толькі маім? — не згаджаўся Антось.

— Не трэба! — рашуча пярэчыла Клаўдзя.—Нашто лішнія плёткі?

Антось чуўся ніякавата, бурчэў, злаваўся, нават спрабаваў сварыцца, але ў рэшце рэшт рабіў так, як яна казала.

Ім было добра разам, дваім адзінокім старым людзям, прыязныя, шчырыя адносіны асвятлялі іхнія дні, іхняе сутонне жыццё. Сёй-той, здаецца, пачынаў зайздросціць ім...

Ды нядоўгім было іх трохі дзівакаватае, не ўсімі зразуметае, не ўсімі ўхваленае шчасце.

Неяк а другой палавіне дня ў суботу заявіліся Антосевы дзеці. Невядома, ці Антось сам ім напісаў, ці нехта з «добразычліўцаў» давёў да вушэй, але з'явіліся яны на дзвюх машынах усе разам, у адзін час. Пэўна, спісаліся альбо сазваніліся. Прыбылі Ганна з Алесем, Галя з Серафімавічам і Ніна са сваім Ігарам. Усе былі знерваваныя, змрочныя.

Патаптаўшыся ля зачыненай на вялізны ржавы замок, запушчанай, урослай па вокны ў быльнёг і крапіву бацькавай хаты, з прыгнечанай нерашучасцю рушылі да Клаўдзі.

Бацькі не было, і калі ён з'явіцца — Клаўдзя дакладна не ведала. І гаспадыня, і госці былі страшэнна збянтэжаныя гэтай сустрэчай, не ве-

АНТОСЬ І КЛАЎДЗЯ

Валянцін БЛАКІТ

Закончыў работу над новай аповесцю, якая будзе называцца «Вырай». Гэта твор пра сучасную вёску, пра адказнасць чалавека перад мінулым і будучым. Хто ты ёсць? Дзе твае карані? Чаго ты прыйшоў на гэтую зямлю? Пасадзіць дрэўца ці спілаваць дрэва, пасаджанае тваімі продкамі? Такі лейтматыў і пафас аповесці.

Прапаную чытачам «ЛіМа» урывак з новага твора. Цалкам аповесць мяркуе надрукаваць «Маладосць».

АУТАР.

далі, што рабіць, што гаварыць. Хоць, пэўна, і гаварыць нешта не было ніякай патрэбы — выразней за ўсякія словы гаварылі позіркі...

Канечне ж, Клаўдзя і не думала, і не спадзявалася, што Антосевы дзеці адразу зразумеюць, адразу ўхваляць бацькава і яе рашэнне, але і сустрэць такую адкрытую, зацятую, глухую варажнечу гэтаксама не чакала. Нешта сцялося, анямела ў яе душы. Даўно, бадай, ніколі яшчэ не адчувала яна такой разгубленасці, бездапаможнасці. Яна лічыла сябе галоўнай віноўніцай і, здаецца, пачынала шкадаваць, што ўвязалася ў гэтую гісторыю: трэ было ўзважыць усё як след, ва ўсякім разе — не рабіць без ведама Антосевых дзяцей. А то пра сябе дбалі, а пра дзяцей, як яны паставяцца да ўсяго — не падумалі, — збяру, нябось, прагаладаліся з дарогі...

Мяккі, зычлівы Клаўдзін голас клікаў да міру і паразумення, абяззбройваў, і гэта занепакоіла, бо кожны адчуваў, што варта толькі сесці за стол — і... Садзіцца тут за стол было б для іх вялікай ганьбаю.

— Не нада! Мы сыты! — напятым металічным тонам спыніў яе Галін муж — Эдуард, то знімаючы, то зноў навешваючы на нос акуляры, што выдавала яго хваляванне. — Не радзі этого мы здесь...

— Да-да! — рашуча падтрымала мужа Галя, змераўшы Клаўдзю з ног да галавы пагардлівым позіркам. — Эдуард Серафімавіч прав: не для этаго мы здесь...

Эдуарда за яго важнецкі начальніцкі выгляд нават старыя людзі ў вёсцы клікалі па імені і бацьку альбо проста — Серафімавіч, хоць ніхто толкам не ведаў, у якіх начальніках ён ходзіць. Прыстойна кланяліся, а ў душы і за вочы пасмейваліся — нейкая ўстойлівая антыпатыя была ў вяскоўцаў да гэтага чалавека. Серафімавіч, канечне, і не здагадваўся, што столькі гадоў ён тут гуляе з мянушкай «Антосеў гусь». Непрыязь да Серафімавіча ўзнікала нават тады, мо нават — асабліва тады, калі ён пачынаў падладжвацца пад народ, паляпваць вяскоўцаў па плячы, іграць ролю гэтакага прасцяка і дэмакрата. Акцёр з яго быў неважнецкі — як шыла з мяшка, выпірала няшчырасць, халодная паблажлівасць, самазадаволенасць з вечна скептычнай ухмылачкай, і гэта яшчэ больш адштурхоўвала людзей, рабіла яго вечным аб'ектам для перадражнівання, з'едлівых кепікаў. Як, дарэчы, і Галю: абое — рабое.

Толькі чалавеку абмежаванаму, аслепленаму ўласнай значнасцю здаецца, што вясковыя людзі з-за сваёй сціпласці, прыроджанай пачцівасці да гасцей і чужых людзей нічога не заўважаюць, ні пра што не здагадваюцца, усё даруюць. Ого, як бачаць, як здагадваюцца! Злёту ўгледзяць, што ты за птах, чаго варты, на свой аршын прымераюць тваю існасць...

Калі жыла Антосіха і было што пацягнуць, Галя са сваім Серафімавічам бывалі на машыне ледзь не кожныя выхадныя, а як бацька застаўся адзін, перастаў трымаць карову, гадаваць кабанчыкаў, вырабляць пханую каўбаску, сушыць кумпячкі і паляндвічкі — у момант забылі дарогу, у момант прайшлі любоў і клопат. А існасць убачылі і ацанілі яшчэ раней — калі яны прыязджалі сюды часцяком. Бывала, згорбленая Антосіха гачкуе дзялку, а дочачка з зяцем ляжаць на лужку, нагульваюць загар — адпачываюць пасля цяжкой разумовай працы. Надзёбаўшыся, старая доіць карову, гатуе прысмакі, а яны яшчэ насамі круцяць: гэта не даспадобы, тое — не так, крывяцца, скоса паглядваючы на парэпаныя матчыны рукі. Серафімавіча яшчэ як-кольвек маглі зразумець вясковыя людзі: ён чалавек чужы, гарадскі, да сялянскай працы непрыдатны. А каб Галя, якая тут вырасла, можна сказаць, з гною вылузалася?!

Да Галі ў іх свая мерка, свой рахунак і куды большая непрыязь, чым да яе важнецкага мужа. Нават кепікі, якія адпускаюцца на Галіну долю, удвая злейшыя за тыя, якімі адорваўся яе Серафімавіч. Здзекуюцца вяскоўцы больш за ўсё з Галінай ганарыстасці, пагарды да ўсяго тутэйшага, вясковага, з яе да пацешнага ненатуральнай гарадской вытанчанасці, напятай, як маска, з-пад якой, як ні хавай, а вылазіць звычайная дурнаватая вясковая баба. Пра такіх здаўна кажуць: не дай бог свінні рогі, а мужыку — панства.

— Ведаю, канечне, што не гасцяваць сюды прыехалі... — ціха і трохі адчужана сказала Клаўдзя. — А мо ўсё-ткі сядзем за стол, як у людзей заведзена?

— Нам некагда расседжвацца! — сцяла нафарбаваныя вусны Галя. — Давайце к дзелу!

— Ну, што ж, давайце к дзелу, калі так няймецца... — разважліва згадзілася Клаўдзя. — Ці мо ўсё ж пачакаем бацьку? Як жа гэта без бацькі гаварыць?

— І праўда, давайце пачакаем бацьку, — нечакана падтрымала яе Ганна, якая дагэтуль не вымавіла ні слова. — Без бацькі якая гаворка... — Адчувалася, ёй няёмка і перад Клаўдзяй, і — асабліва перад мужам, якога тут, у вёсцы, дужа паважалі за кемнасць, спакойны, разам з тым — вясёлы характар, уменне сыходзіцца, пагаварыць з людзьмі, лічылі за свайго, звалі проста — Алесь.

— А чаго чакаць?! — бліснула на Ганну нядобрым позіркам, як на здрадніцу, дэзерцірку, Галя. — Няма чаго чакаць: жанішок усё роўна недзееспасобный. — Павярнулася, шукаючы падтрымкі, да мужа: — Правільна я гавару, Эдуард Серафімавіч?

— Совершенно верно! — на ляту падхапіў Серафімавіч. — У старыка — палнейшый старчаскі маразм. Он не отвечает за сваі дзействія. — Пагразіў пальцам Клаўдзі: — Учціце: дзела будзеце імець з намі — яго наследнікамі і апекунамі!..

Гэтая Серафімавічава нетактоўнасць непрыемна ўразіла ўсіх. Алесь скрывіўся, як ад зубнога болю. Было відно, што ён ледзьве стрымліваецца, каб не сказаць-рубануць швагру тое, што ён заслугоўвае за яго «старчаскі маразм».

— Якое дзела, Серафімавіч? Пра што ты гаворыш? — захвалявалася Клаўдзя. — Калі пра хату, то я ж сказала: забірайце на здароўе! Забірайце — яна нам не патрэбна. Перабірайцеся каторы ды жывіце на здароўечка. А не хочаце перабірацца, жыць у вёсцы — прадайце... — Паглядзела з жалем і дакорам: — А пра бацьку так няможна, Серафімавіч. Грэх так пра бацьку...

Серафімавіч нервова праціраў хусцінкай акуляры, то навешваючы, то знімаючы іх. Рукі ў яго злёгку дрыжэлі. Здаецца, ён сам разумеў, якую даў прамашку. Але слова — не верабей...

І зноў які ўжо раз у хаце павісла насцярожанае маўчанне. Нават агрэсіўная Галя прыкусіла язык. Па Ганніным твары пайшлі барвовыя плямы, што сведчыла пра крайнюю ступень няёмкасці і сораму, якія яна зараз адчувае. Ніна пазмрачнела, прысела на лаву. Алесь не вытрымаў — пайшоў на вуліцу пакурыць. Клаўдзя хвалявалася, не ведала, куды падзець свае цяжкія, загрубелыя рукі. Адзін Ігар, прысланіўшыся да сцяны, клявў носам, нічога не заўважаючы, нічога не разумеючы.

Брыдкае маўчанне доўжылася і доўжылася, згушчаючыся, асядаючы гнятлівым змрокам.

— Цётка... — нарэшце, не вытрымала Ніна, прымірэнчым, здранцвелым голасам пачала паварочваць гаворку ў іншае, спакайнейшае рэчышча. — Устыдна, дальбог, устыдна...

— А то не ўстыдна! — пагадзілася Клаўдзя, яшчэ раз змерала Серафімавіча дакорлівым позіркам. — Серафімавіч, відаць, не падумаўшы гэта сказаў...

Серафімавіч маўчаў. Ён не прывык пры людзях прызнаваць свае памылкі, нават калі рабіў відавочнае глупства.

— Вядома ж, не падумаўшы... — выручыла яго Ніна. — Але я не пра тое, цётка... — Як гэта вы-ы на старасці гадоў... Устыдна! З-за вас і нам усім сораму не абабрацца...

Клаўдзя разумела, што рана ці позна давядзецца вытлумачвацца з Антосевымі дзецьмі і не цешыла сябе, што гэтае вытлумачэнне будзе простае, лёгкае. Яна рыхтавалася да сустрэчы з Антосевымі дзецьмі і баялася гэтай сустрэчы. Каб яны пачалі адразу, як яна думала, з таго, з чаго пачынае цяпер Ніна, Клаўдзя пачалавечы зразумела б іх, зрабіла б усё, каб і яны змаглі хоць як-кольвек зразумець і яе, бацьку, зразумець, што і ў іх, старых, ёсць свая праўда, ёсць сваё апраўданне. А яны пачалі вунь з чаго... З таго, пра што яна ніколі і не думала, што і ў галаву ёй не магло прыйсці... Не пасаромеліся бацьку абразіць, яе, Клаўдзю, якая ўзяла на сябе, калі на тое пайшло, іхні клопат пра бацьку, пакрыўдзіць сваім падазрэннем... Ды, па ўсім відно, не бацька іх хвалюе, а — каб якую тысячу не ўпусціць. І яны яшчэ збіраюцца яе сароміць?!

— Ну, ён стары, дурны, а вы?! — між тым працягвала Ніна. — Што вы сабе думалі?! — Годас яе смялеў, набываў павучальныя і патрабавальныя ноткі. — Што вы сабе думалі, пытаюся?! Калі вам падабаецца, што з вас, а праз вас і з бацькі ўся вёска рагоча, то мы не жадаем, каб з нас і нашых дзяцей увесь свет пацяшаўся, каб пальцамі тыцкалі. Вы гэта спецыяльна зрабілі, каб нас зняславіць, спецыяльна! Як вам не ўстыдна, цётка?! Не чакала ад вас...

— А чаго ты чакала, — голасам з падазрона ветлівымі адценкамі спытала Клаўдзя, бязлітасна змерала Ніну, потым — Галю, яе Серафімавіча, па Ганне прайшлася толькі мяльком. — Вы чакалі, каб тут аднаго бацьку вошы з'елі? Каб ён тут адубеў адзін? Гэтага ты, Ніна, чакала?! А цяпер ты мне: усты-ыдна-а... А табе не ўстыдна было, як стары бацька дзічэў адзін, гразёю абрастаў?! Ты хоць раз прыехала, прыбрала, памыла? А язды той — сорак мінут аўтобусам... А табе, Галя, не ўстыдна?! Ты хоць які клопат пра бацьку праявіла? — Хоць раз за лета прыехала, праведала, паглядзела, ці хоць жывы? Нябось раней... — Запнулася, стрымалася, падумаўшы. — А вы мне цяпер: усты-ыдна-а... То каму больш устыдна: мне ці вам, родным дочкам?! Што — ён, ваш бацька, у мяне галодны, недагледжаны, у шмацці ходзіць?! Няма чаго мне ўстыдацца. Вы ўстыдайцеся...

— Цётка, што вы гаворыце?.. — не ўтрывала Ганна. Голас яе дрыжэў ад хвалявання, але быў разважны, нават вінаваты. — Можна падумаць, што толькі вы для бацькі дабра зычыце, вы адна дабрадзейка, а мы чорт ведае што...

— Не пра цябе гаворка, Ганна. Ты жывеш далёка, бацьку на зіму забірала, дачку летам прысылала, цябе ніхто не асудзіць. Я пра іх, пра Ніну і Галю...

Нейкае супярэчлівае, двоістае пачуццё раздзірала Ганніну душу. З аднаго боку яна калі яшчэ не цалкам разумела, то спрабавала зразумець бацьку. Хто-хто, а яна бачыла, душа збалелася бачыць, як нудзіўся, якая

(Заканчэнне на стар. 10—11).

не дадумалі да канца. У іхнія гады пара быць разумнейшымі, абачлівымі...

Здаецца, вечнасць доўжылася гэтае няёмкае, нядобрае, гнятлівае маўчанне, і ніхто не ведаў, як яго парушыць.

— Дом хочаш царапнуць, старая ведзьма?! — нарэшце без усялякіх дыпламатый боўтнуў Нінін муж, Ігар. Ён перад прыходам сюды ўпотай ад усіх каўтануў за цесцевым хлявом для храбрасці з паўпляшкі чарніла, закусіўшы рукавом, і зараз тое чарніла пачало надаваць смеласці. — Во даеш, старая карга!..

Гэтая грубая, крыўдная няпраўда, хай сабе і з вуснаў п'янаватага Ігара (што ў цвярозага ў галаве — тое ў п'янага на языку), балюча торкнула Клаўдзю, але — о дзіва! — ніколечкі не абразіла. Мо нават наадварот — узрадавала. Дык во, аказваецца, пра што ў іх увесь клопат! А яна думала...

— Нашто мне ваш дом? — спакойна і разважліва сказала Клаўдзя, адчуваючы, што да яе вяртаецца ўпэўненасць, яшчэ нешта такое, што ўзнімае яе над імі, дае маральную перавагу. — У мяне свой ёсць — не горшы...

— Э-ге-е, не хітрыры-ы... — п'яна пагразіў пальцам Ігар. — Я цябе-е наскр-ро-о-зь бачу-у. Ы-ы-эге...

— А чаго мне хітрыць... Во перабірайся — і жыві. Што там салодкага знайшоў у сваім раёне? Рабочыя рукі і тут патрэбны. Хочаш, бацька хату на цябе перапіша? Пераязджайце — і жывіце на здароўе...

Ігар замоўк, лыпаючы асалавелымі вачыма. Цяжка было зразумець, ці да яго не дайшоў сэнс Клаўдзіных слоў, ці вагаецца: даваць ці не даваць ім веры? Нарэшце, нешта прабілася-прабліснула ў яго затуманенай галаве, хісткім крокам рушыў да Клаўдзі:

— Ну-у й цётка! Ну-у, ма-ла-ток! Да-ай я цябе па-ацалую...

— Сядзь, алкаш! — са злосцю схапіла за каршэнь, пацягнула назад яго Ніна, і Ігар паслухмяна асеў на лаву, мармычучы нешта невыразнае.

П'яная Ігарава выхадка шакіравала ўсіх, змусіла ўставіць вочы долу, адчуць сябе, як голыя ў крапіве.

— То пакладзіце яго на ложак — хай трохі падрэмле, — са спагадаю параіла Клаўдзя. — І самі прысядзьце — чаго стаяць... Я зараз на стол

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

КАНЦЭРТЫ, ГАСТРОЛІ, ПРЭМ'ЕРЫ

ЗАЎТРА, 12 КАСТРЫЧНІКА, БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ ФІЛАРМОНІЯ АДКРЫВАЕ 48 СЕЗОН

Першага кастрычніка — Міжнародны дзень музыкі. У канцэртнай зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі адбыўся канцэрт з удзелам заслужанага калектыву рэспублікі Сімфанічнага аркестра Узбекскай ССР пад кіраўніцтвам народнага артыста УзССР прафесара Західа Хакназарава і лаўрэата Рэспубліканскага конкурсу піяністкі Эльвіры Міркасымавай. А заўтра—адкрыццё чарговага канцэртнага сезона. Напярэдадні гэтай падзеі ў культурным жыцці Мінска мы сустрэліся з мастацкім кіраўніком філармоніі Юрыем Гільдзюком.

— Фестывалі, сустрэчы, канцэрты сезона 1984—1985 гг. праходзілі ў азнаменаванне вялікага свята — 40-годдзя Перамогі, — расказвае Ю. Гільдзюк. — Падзеяй быў фестываль мастацтваў «Мінская вясна», у канцэртах якога гучалі творы беларускіх аўтараў. Слухачы пазнаёміліся з многімі цікавымі музычнымі прэм'ерамі. Значнай з'явай у культурным жыцці ўсёй нашай рэспублікі было адкрыццё аргана ў канцэртнай зале Полацкага Сафійскага сабора. У снежні мінулага года прайшлі справаздачныя канцэрты беларускіх творчых калектываў у Алімпійскім комплексе ў Маскве.

Аматары і музыканты-прафесіяналы летась мелі магчымасць наведваць канцэрты ў філармоніі па 25 абанементах. Адбыліся аўтарскія вечары Ц. Хрэннікава, А. Тактакішвілі, Д. Кабалеўскага, Я. Глебава, І. Лучанка, Д. Смольскага, групы ленінградскіх кампазітараў. За мінулы сезон пашырылася сетка тэатральна-канцэртных цэнтраў-клубаў, палацаў культуры, у якіх канцэртна-лекцыйнае бюро рэгулярна наладжвае выступленні калектываў.

— Юрый Мікалаевіч, дзе гастралявалі сёлета вядучыя калектывы філармоніі і якія цікавыя паездкі чакаюць іх у будучым?

— Акадэмічны сімфанічны аркестр БССР выступаў у маі з канцэртамі ў Маскве. Затым пабываў ва Удмурціі, дзе ўдзельнічаў у фестывалі імя П. І. Чайкоўскага на радзіме кампазітара ў горадзе Воткінску. І вось гэты калектыў разам з салістамі — заслужанай артысткай УССР прафесарам В. Пархоменка, лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола рэспублікі І. Шумілінай, лаўрэатам усесаюзнага і міжнароднага конкурсаў Г. Забарам запрасілі на Украіну, па фестываль «Кіеўская залатая восень». У наступным годзе плануюцца цікавыя паездкі аркестра па нашай краіне: Калінінград, Пскоў, Ноўгарад, Ленінград — удзел у фестывалі «Белыя ночы». Дзяржаўны народны аркестр БССР імя І. Жыновіча ездзіў з канцэртамі па Беларусі. Ансамбль «Песняры» быў на гастролях у Індыі. Мінскі камерны аркестр адкрывае новы канцэртны сезон у Полацкім Сафійскім саборы, а ў далейшым яго чакаюць гастролі па Прыбалтыцы. У маі многія нашы калектывы возьмуць удзел у Днях культуры Беларусі ў Эстоніі.

— Новы канцэртны сезон — новыя падзеі ў музычным жыцці рэспублікі...

— Адзначу, што традыцыйныя фестывалі «Беларуская музычная восень», «Мінская вясна», «Гомельская вясна», «Майстры мастацтваў — працаўнікам сяла Магілёўскай вобласці» будуць прысвечаны XXVII з'езду КПСС. «Беларуская музычная восень» заўсёды прываблівала многіх выканаўцаў з усёй краіны. Сёлета мы чакаем прыезду выдатнага дырыжора сучаснасці Я. Мравінскага, які выступіць з Сімфанічным аркестрам Ленінградскай дзяржаўнай філармоніі імя Д. Шастаковіча. Нашымі гасцямі будуць Дзяржаўны акадэмічны Рускі хор Саюза ССР, Акадэмічны хор Латвійскай ССР, Арэнбургскі рускі народны хор, Дзяржаўны ансамбль танца Паўночнай Асеціі, маладаўскі «Жок», украінская капэла бандурыстаў, многія іншыя калектывы і выканаўцы. У снежні пройдуць Дні культуры Славеніі ў БССР. У Гродзенскай і Брэсцкай абласцях адбудуцца канцэрты Фестывалю сімфанічнай музыкі, прысвечаныя 90-годдзю з дня нараджэння Д. Шастаковіча. Вясной пройдзе традыцыйны Усесаюзны тыдзень музыкі для дзяцей і юнацтва.

— Дарэчы, эстэтычнае выхаванне нашай моладзі хвалюе цяпер многіх. Мяне ўражваюць такія лічбы: толькі за 1984 год канцэртна-лекцыйным бюро было дадзена па рэспубліцы больш чым паўтары тысячы выступленняў для дзяцей і юнацтва. Каля 900 канцэртаў было праведзена для навучэнцаў вясковых школ, больш за 300 — для навучэнцаў ПТВ і СПТВ. Маладую аўдыторыю, як мне вядома, чакае серыя цікавых сустрэч з музыкай і надалей. Сярод 27 абанементаў новага філарманічнага сезона дзесяць адрасавана дзецям. Гэта «Музычныя партрэты» і «Музычныя паралелі», абанемент № 9 «Спяваюць дзіцячыя хоры», абанементы «Музычныя ўрокі з працягам», «Дзіцячыя і юнацкія гады любімых кампазітараў», «Урокі музыкі», «Загадкі музычных жанраў». Безумоўна, для таго, каб усе гэтыя сустрэчы з музыкай былі рэгулярнымі, каб яны дасягалі мэты выхавання слухачоў з дзяцінства, патрэбна ў першую чаргу зацікаўленасць кастаўнікаў падрастаючага пакалення. А гэта залежыць, вядома, не толькі ад філармоніі, а і ў першую чаргу ад саміх школьных калектываў.

— Вядома, так. А што датычыць філармоніі, дык мы наладжваем і сёлета абанементы для маладзёжнай аўдыторыі: «Літаратурна-музычныя вечары для моладзі» і «Маладзёжны музычны клуб». Пашыраюцца цыклы канцэртаў у навучальных установах: у Беларускім дзяржаўным універсітэце, у Мінскім педагагічным інстытуце, у інстытуце замежных моў, у Сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках...

— Калі ласка, «расшыфруйце» змест сёлетніх абанементаў. Якія творы прагучаць у канцэртах, імёны якіх выканаўцаў убачым мы на афішах?

— У новым сезоне запланаваны аўтарскія вечары кампазітараў Альфрэда Шнітке, Яўгенія Догі, Алега Янчанкі, Сяргея Картэса. «Музыка за мір і гуманізм» — назва абанементнага цыкла, у канцэртах якога прагучыць «Нямецкі рэквіем» І. Брамса, упершыню ў Мінску будуць выконвацца сімфонія № 7 «Вясенняя» М. Тэадаракіса і «Трыумф Афрадыты» К. Орфа. Намячаюцца прэм'еры твораў нашых беларускіх кампазітараў. Акрамя ўжо названых калектываў, да нас у Беларусь павінны прыехаць Каўнаскі дзяржаўны хор, Дзяржаўная харавая капэла Грузінскай ССР, Маскоўскі камерны хор, Камерны хор Міністэрства культуры СССР, камерны аркестр «Віртуозы Масквы», Ерэванскі камерны аркестр, Ансамбль скрыпачоў Вялікага тэатра Саюза ССР, ансамблі «Мадрыгал» і «Рычэркар», салісты Рыгор Сакалоў, Станіслаў Ігалінскі, Этэры Анджапарыдзе, Валерый Клімаў, Юрый Башмет, Ермек Серкебаеў, Ламара Чконія, Галіна Пісарэнка, Віргіліус Нарэйка, Вольга Басісцюк і многія-многія іншыя. Чакаем мы выступленняў Яўгенія Несцярэнкі, Аляксандра Варашылы. Своеасаблівым эпіграфам да новага канцэртнага сезона можна лічыць выступленне 10 кастрычніка ў нашай канцэртнай зале вядучых салістаў Вялікага тэатра Саюза ССР, лаўрэата Ленінскай прэміі Героя Сацыялістычнай Працы народнай артысткі СССР Ірыны Архіпавай і народнага артыста СССР Уладзіслава П'яўко.

— Словам, новы філарманічны сезон мае быць насычаным і цікавым. Аматары сімфанічнай, вакальнай і інструментальнай музыкі, мастацкага чытання, эстрады і джазу сустрэнуцца са сваімі любімымі творамі і выканаўцамі, адкрыюць для сябе многія новыя імёны.

Гутарку вяла
Іна ГУРАРЫЙ.

У зале Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Фота А. КАЛЯДЫ.

МАСТАК і ЖЫЦЦЁ

У МАЙСТЭРНІ — САВІЦКІ

ПРЫЗНАЮСЯ шчыра: не без хвалявання пераступаў упершыню парог новай майстэрні Міхаіла Савіцкага. Сюды ён пераехаў недзе ўвесну. За дзесяцігоддзі дыялога з мастаком і яго творамі я прывык да той, старой майстэрні, дзе, па сутнасці, створана гэтым мастаком усё, што ўзвысіла аўтарытэт беларускага жывапісу далёка за межамі нашай рэспублікі: «Партызаны», пра якіх столькі спрачаліся пасля першага ж іх з'яўлення на выстаўцы, «Пакаранне смерцю», «Партызанская мадонна» і «Куст ружаў», «Партызаны, блакада» і «Рыта і Андрэй», пякельна набатны цыкл «Лічбы на сэрцы» і зусім нядаўні трыпціх «Агрэсія», якім пазначаны, на мой погляд, новы, адметны кірунак творчых пошукаў мастака, і партрэт Васіля Быкава — слова, прынцыповае ў партрэтным мастацтве сённяшніх дзён... Ды хіба пералічыш усё!..

Не надта яна была прасторная, тая, старая, майстэрня. «Адыход», такі патрэбны, мабыць, для кожнага жывапісца як «адлегласць», быў тут яўна недастатковы. Паліцы з кнігамі, перагружаныя, нягледзячы на пастаянны парадак, які панаваў на іх, быццам навісалі над невялікаю пустою прасторай сярэдзіны пакоя зацісну-тай між гэтымі самымі паліцамі, падрамнікамі з нацягнутымі на іх палотнамі, столік, за якім столькі гутарак адбылося з самымі рознымі наведвальнікамі майстэрні, сцены з прымацаванымі да іх мальбертамі... У куце заўсёды папыхкваў самавар — добра заваранны чай і абмену думкамі спрыяе, і здымае стомленасць, калі так імкліва пралятае чарговы рабочы дзень... А славутыя кактусы, апетыя ледзь не кожным, каму давялося пісаць пра Савіцкага, займалі ўсе падаконнікі!.. Помню збянтэжанасць японскай папулярызатаркі савецкага мастацтва Накамуры-сан, калі яна пераступіла парог майстэрні Савіцкага. Усё яе аблічча быццам выпраменьвала ледзь прыхаванае здзіўленне: «І гэта тут, тут — у такой несамавітай майстэрні, створана ўсё тое, што здзіўляе і хвалюе гледачоў многіх краін?!» Неяк і Таір Салахаў спытаў Савіцкага: «Дык гэта тут табе ўдалося стварыць усё?!»

Так, з той невялічкай майстэрні, з якой Міхаіл Андрэевіч быццам зросся, пайшлі яго карціны ў вялікі свет. І калі паняцце «майстэрня» некалькі пашырыць, узяць яго трошкі ў інакшым вымярэнні, з улікам таго, што «майстэрня» — гэта і ўнутраны свет мастака, і адбітак гэтага ўнутранага свету ў саміх творах, — дык ніці сувязей цягнуліся з той несамавітай майстэрні да вельмі разнастайных каардынат, сярод якіх — Масква і Парыж, Балгарыя і Японія, суседняя Польшча і аддалены поўдзень Італіі — Калабрыя... Ды хіба прыгадаеш адразу гарады і краіны, дзе тысячы і тысячы гледачоў усяго свету далучаліся і далучаюцца да мастацтва Міхаіла Савіцкага.

У новай майстэрні, зусім непадалёк ад колішняй, на той жа вуліцы Някрасава, — і прасторы больш, і святла, здаецца, больш, ды і не адзін пакой займае гэтая майстэрня. Уласна, сама майстэрня, месца працы мастака над новымі творамі, адасоблена ад пакоя, дзе можна пагаварыць з наведвальнікам аб справах, адпачыць. Праўда, самога паняцця адпачынку для Савіцкага быццам бы і не існуе — ён і гаварыць пра адпачынак не любіць, і ставіцца да адпачынку толькі як да перамены занятку. Калі пад вечар або ў пахмурны дзень святла недастаткова, каб працаваць перад палатном, ён працуе над артыкуламі, піша адказы на шматлікія пісьмы з розных куткоў краіны, чытае...

Міхаіл Савіцкі вядзе так званую «акадэмічную майстэрню» — пад яго кіраўніцтвам павышаюць сваю творчую кваліфікацыю маладыя жывапісцы, і цяпер займаецца ўжо з другім выпускам, але гэта — прадмет асобнай гаворкі. А тут я прыгадаў гэтую акалічнасць, каб падкрэсліць, што ў вучняў майстра — свае памяшканні, свае майстэрні, у гэтым жа прыгожым будынку. Карысна тое, што майстра мае магчымасць «без адрыву» ад уласнае твор-

Антось і Клаўдзя

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 8—9).

скруха-самота сушыла яго на Палессі, як чакаў вясны, каб вырвацца дадому. Што ні рабіла, як ні ўлагоджвала — нішто не памагала, нішто не магло вылечыць ад скрухі-настальгіі па сваёй вёсцы. І калі шчыра, як гэта ні горка, ён лепш сябе адчувае тут, з Клаўдзяй, якая клапоціцца пра яго. Але... Але гэта—кашчунства над памяццю маці. Чым можна апраўдаць гэтае кашчунства? Нічым... Гэта, у рэшце рэшт, пляма на іх, яго дзецях: бацьку на старасці гадоў аддалі ў прымакі... За старым, нямоглым бацькам даглядае чужая жанчына.... Гэта — усё роўна, што сплавіць старога ў дом састарэлых... Што скажа яна, Ганна, сваім дочкам? Чаго пасля гэтага можа чакаць у старасці ад сваіх дачок?..

Антось прытэпаў з лесу з поўным кошыкам грыбоў. Грыбы толькі што пайшлі, таму браў усё, што трапляла: і лісічкі, і савячкі, нават сыраежкі. Праўда, усё ж падняў пару маладзенькіх баравічкоў, а гэта значыць: калі пастаіць цяпло ды яшчэ бог пашле добры цёплы дожджык-грыбасей — пасыплюцца па хвойніках, як гарох. Отта ж пачнецца...

Цяпер, калі адужаў усе неадкладныя справы, можна будзе пагрыбаваць, адвесці душу. Падабаецца ці не падабаецца Клаўдзі, але трэба сказаць: хай ходзіць сушыць у яго хату —там печ здатнейшая. І... Заўважыўшы дачок, зяцёў, анямеў, халадок пайшоў пад сэрцам. Мо схавацца, не паказвацца? Але было позна, яго ўжо заўважылі — пасыпаліся з хаты, рушылі насустрач. Збянтэжана таптаўся на месцы, акружаны імі, не ведаў, што сказаць, што рабіць з кошыкам— паставіць тут ці несці ў хату.

— Пойдзем дадому, тата, пагаворым...

Антось з удзячнасцю паглядзеў на Ганну:

— Добра, пойдзем...

— Да сваёй хаты! — заступіла дарогу Ніна.

— Што ж, пойдзем і да сваёй... Во толькі ключ вазьму.

Моўчкі стаялі ля плоту, нецярпліва чакалі, а яго ўсё не было і не было.

— Не трэба было адпускаць, — не вытрымала Галя. — Мо эта ведьма... —Замоўкла, убачыўшы, што бацька выйшаў з хаты.

Ён скінуў абшарганую світку, у якой хадзіў у лес, пераапрануўся ў

чае працы штодзённа і штогадзінна быць блізка да сваіх падапечных, а яны заўсёды могуць звярнуцца да яго, у любы момант!..

Мабыць, хваляванне маё рассеялася ў першыя ж хвіліны візіту ў новую майстэрню мастака па той простай прычыне, што адразу ж адчуў: многае змянілася, ды засталося без змен тое асноўнае, грунтоўнае, што вызначае пэўную адметнасць майстэрні менавіта Савіцкага. Разам з майстрам у новую майстэрню «пераехала» сама атмасфера неспакойнага творчага існавання ў свеце. Атмасфера напружанай работы думкі і пачуцця мастакоўскага. Як кажуць, з месца ў кар'ер размова пайшла пра надзённыя і пра адвечныя праблемы творчасці. Завязалася спрэчка пра даўні ўжо жаночы партрэт, які адносіцца да першага перыяду творчасці мастака. Натуральна, што гэтая спрэчка пацягнула за сабою абмен думкамі пра задачы сучаснага партрэта, пра цяжкасці, якія даводзіцца пераадольваць, дамагаючыся яснага выяўлення задумы ў рабоце над карцінай... Гаворка працягвалася нешта гадзіны чатыры-пяць, а не ўсё было сказана...

Міхаіл САВІЦКІ з маладымі мастакамі.

Вось пішу ўсё гэта і лаўлю сябе на думцы, што прывыкаю да новай майстэрні Савіцкага, як, мабыць, прывык і сам майстра, — бо ў новай прасторы, па сутнасці, быццам бы падалася ўшыркі тая, колішняя, старая майстэрня. Тыя ж кактусы пазаймалі ўсе падаконнікі — і толькі дзівішся, як яны маглі мясціцца ў той, колішняй. Тыя ж мальберты трывала прымацаваны да сцяны, а на мальбертах — новыя палотны з распачатымі кампазіцыямі. Побач — палітра і пэндзлі, заўсёды гатовыя, каб да іх наблізіўся майстар... Тыя ж кнігі — таксама «трымаюць» колішнюю атмасферу: вакол «аўтаманаграфіі» Ігара Грабара гуртуюцца кнігі пра майстроў розных эпох. Міхаіл Савіцкі ўсебакова дасведчаны ў гісторыі мастацтва і яго сучасным стане. Тонкасці станаўлення жывапісу эпохі Адраджэння або абсягі жывапісу Італіі на пачатку стагоддзя і сёння — пра іх ён гаворыць так, што разумееш: многае абдумана, узважана, а ў выніку ўсталяваўся цвёрды ўласны погляд на рэчы. І пра Тыцыяна, і пра Рэната Гутуза— і кампетэнтна, і дэталёва.

Кажу мастаку пра нядаўні ягоны трыпціх «Агрэсія» — бачу ў гэтай рабоце плённую блізкасць да творчых намаганняў Рэната Гутуза, не павярхоўныя, так сказаць, збліжэнні, а сутнасныя, унутраныя, якраз тыя, у якіх — адбітак нашага складанага часу, калі так патрэбна вострае, натхнёнае слова мастака, здольнае памагчы людзям уратаваць мір на зямлі... Савіцкі з хваляваннем гаворыць, наколькі важна для мастака культура творчага мыслення, калі ён бярэцца за такую адказную тэму.

Слухаю яго і думаю: творы Савіцкага ездзяць па свеце шмат, сам жа ён ездзіць мала — лічаныя вандроўкі па краіне і за мяжу. Ведаю: яго цягне да сябе майстэрня. Пакінуць майстэрню не тое што на месяц, а на пару тыдняў ці дзён на дзесяць — для Савіцкага літаральна пакута. «Столькі можна паспець зрабіць за тыдзень!» — кажа ён. І калі ён гаворыць пра каштоўнасць часу, дык адразу ж хочацца падкрэсліць: ужо хто-хто, а ён умее наладжваць адносіны з хуткаплынным часам — такіх дысцыплінаваных мастакоў, як Міхаіл Савіцкі, сустракаецца не так і многа. Яму памагае ў гэтым майстэрня. («Дома жыву нашмат меней, чымся ў майстэрні... Тут мой дом!..» — усміхаецца).

...Папыхквае самавар... Нервовыя пальцы Савіцкага трымаюць муштук з цыгарэтай... На стале — стос пісьмаў, адрасаваных мастаку... Дзве новыя кампазіцыі на мальбертах. Абедзве ў рабоце. Мабыць, рана пра іх казаць. Ды як не сказаць, калі выразна ўжо акрэсліваецца кожная з іх, хоць працы наперадзе — процьма.

Адна з кампазіцый прысвечана працаўнікам сяла. Дзіўлюся кампазіцыйнаму майстэрству, вынаходлівасці, арганічнасці, натуральнасці пачуцця, якія выпраменьвае нават незавершанае яшчэ палатно. Умее Савіцкі паказаць працу чалавека паэтычна і пераканальна, а на канве шчырага пачуцця цярпліва вырошчвае сапраўды філасофскага напалу думку... Асабліва гэта датычыць другога распачатага палатна: карціны пра рэвалюцыю. Гэтая шматфігурная кампазіцыя, так сказаць, толькі «завязваецца». Але той нерв, які выклікае яе да жыцця, які прымушае весці надзвычай складаныя каларыстычныя пошукі, — відочны. Міжволі прыгадваюцца ранейшыя творы мастака, блізкія па гучанні тэмы. Гэтыя ранейшыя творы адразу ж выстройваюцца ў памяці ў рад, калі гляджу на гэтае распачатае палатно, — і адразу бачу, што новае — новае ў самім кампазіцыйным падыходзе, новае ў пошуках каларыстычных — зноў у наяўнасці. Мастак тлумачыць, якія цяжкасці даводзіцца пераадольваць: пра тыя ці іншыя таямніцы каларыту, пра ўзаемазалежнасці, якія ўзнікаюць у часе работы над палатном, ён можа гаварыць гадзінамі...

Не так даўно мастак пераехаў у новую майстэрню, а зроблена ўжо нямала. Адну з новых карцін майстра, якая пайшла адсюль у свет, я не бачыў. Але бачыў распачаты яшчэ ў старой майстэрні партрэт вядомага артыста Міхаіла Ульянава. Тады партрэт толькі намячаўся. Цяпер ён блізкі да завяршэння. І вось распачаты значныя новыя творы...

Цяпер разумею, чаму адышло на другі план хваляванне, з якім пераступаў парог гэтай майстэрні. Яшчэ раз пераканаўся, што галоўны «кампанент» мастакоўскага майстэрства — сам мастак як чалавек, узровень, так сказаць, дынамікі яго духоўнага жыцця. Пра Савіцкага як пра чалавека вельмі красамоўна сведчыць майстэрня, дзе ён зусім не затворнік. Нават здзіўляешся часам, як ён паспявае ўсюды — і ў майстэрнях калег пабываць, і на абмеркаванні маладзёжнай выстаўкі выступіць, і на пленуме ў Саюзе мастакоў, і на экспертнай камісіі, і на выстаўкоме. Пра яго работу як дэпутата Вярхоўнага Савета рэспублікі сведчыць тая актыўнасць, з якой узнімае ён шматлікія праблемы, якія можна коратка акрэсліць так: эстэтычнае выхаванне грамадства. Так сказаць, уклад выяўленчага мастацтва ва ўдасканаленне «чалавечага фактару»!.. Неспакой!.. Ды вось што дзіўна — ні разу не давялося чуць з вуснаў Савіцкага, быццам шматлікія клопаты яго па-за майстэрняй «адрываюць» яго ад майстэрні. І сама майстэрня сведчыць: не адрываюць! Бо заўсёды тут, на мальберце, новыя палотны.

Даводзілася бачыць у майстэрні Савіцкага работы на самых розных этапах творчасці. І толькі што распачатыя, як, скажам, некалі «Аднадушнасць» — тады зайшоў да Савіцкага Віктар Сахненка, і столькі павучальнага давялося пачуць з вуснаў майстроў, якія раяцца між сабой! Бачыў я тут, у майстэрні, і блізкія да завяршэння работы — такія, як «Пакаранне смерцю», «Агрэсія», палотны да вядомай Купаліяны Савіцкага. І — работы — у самым, як кажуць, «лабараторным» яшчэ выглядзе, як вось гэтая новая карціна, што выспявае ў новай майстэрні мастака цяпер, — пра падзеі рэвалюцыі... Кожны раз даводзілася адчуць унутраную творчую апантанасць гэтага чалавека, якая нібы выбухае з-пад вонкавай яго стрыманасці, з-пад знешняга спакою.

Так, у сваёй майстэрні Міхаіл Савіцкі звязаны з усім сённяшнім светам. Напал жыцця планеты тут адчувальны. Напал жыцця сённяшняга. І — напал памяці. Памяці дзеля заўтрашняга.

Калісьці на вуліцы Някрасава доўгія гады жыў Міхаіл Аркадзьевіч Керзін — узроўнем яго творчай культуры многае вызначалася і вызначаецца ў мастацтве нашай рэспублікі. Сёння на вуліцы Някрасава працуе Міхаіл Андрэевіч Савіцкі — узроўнем яго творчай культуры таксама вызначаецца многае. Тут, на гэтай вуліцы, Стасіс Красаўскас з хваляваннем ішоў аднойчы ў майстэрню Савіцкага. Ён казаў: «Савіцкі — выдатны майстар...»

...Вуліца Някрасава ў Мінску — вуліца мастакоў. Ад часоў Керзіна, калі Савіцкі вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы, да сённяшняга дня — цэлая эпоха! Нерв гэтай эпохі— такі выразны ў творчай атмасферы майстэрні Міхаіла Савіцкага, дзе працуе адзін з самых неспакойных мастакоў, чыя творчасць жывіць інтэлектуальны і эмацыянальны свет нашых сучаснікаў, несучы ў сабе энергію спасціжэння нашых дзён.

Уладзімір БОЙКА.

новы касцюм, быў супакоены, упэўнены ў сабе:

— Пайшлі!

Усю дарогу панура маўчалі. Антось не хацеў першы падаваць голасу — чакаў, пакуль загавораць яны. Ён ужо, здаецца, не палохаўся, гатовы быў да гаворкі з імі.

Калі параўняліся з машынамі, Серафімавіч нечакана спыніўся, адамкнуў ключом дзверцы свайго «Жыгуля», мякка прапанаваў:

— Сядай, баця...

Антось запытальна глянуў на яго. Зяцевы вочы за шкельцамі акуляраў бегалі ва ўсе бакі. Яны былі насцярожаныя, фальшывыя, у глыбіні іх хавалася нешта нядобрае, аднак Антось рашуча і бязбоязна палез у машыну: падумаеш, яны мяне павучаць сабраліся!..

Побач з ім прымасцілася Галя, а спераду ля Серафімавіча сеў Ігар. Ніна і Ганна пайшлі ў Алесеву машыну.

Калі выехалі за вёску, Антось занепакоіўся: што яны надумалі? З асцярогаю запытаў:

— То куды гэта едзем?

— Да Ніны, а там рашым куды: да нас ці да Ганны...

— Чаго мне да вас ці да Ганны?— не зразумеў Антось.

— Каб людзей не смяшыў,— суха адказала Галя. — Пры-ы-мак! Усё, досыць сюды бадзяцца!..

— Вы гэта ўсур'ёз?

— А то, думаеш, ехалі, каб пажартаваць, — ледзьве стрымліваючы злосць, мовіла Галя. — Жанішок аб'явіўся... Куры ад смеху дохнуць...

— Спыні машыну, Эдзік! Выпусці! — нервова замітусіўся Антось.

— Сядзі, жанішок! — насмешлівым, разам з тым уладным голасам загадала Галя.

— А ну, зараз жа спыніся, Эдзік! Што я табе кажу?! — захадзіў Антось. — Спыні, а то зараз выскачу на хаду!

Серафімавіч ехаў, быццам быў глухі.

— А ну стой! — схапіў яго за плячо Антось. — Стой, табе кажу! — Прыўзняўся, пацягнуўся да руля.

— Ты што, здурэў?! — вызверылася Галя, рыўком асадзіўшы бацьку. — Аварыю захацеў зрабіць?!

— Стойце! — закрычаў Антось, рвануўся цераз Галю да дзверцаў, каб адчыніць. Галя імгненна схапіла яго за рукі, балюча закруціла назад.

— Сядзі-і-і!.. — цыкнула яна на бацьку, націснула на чорненькую кнопачку на дзверцах.

Антось яшчэ доўга рваўся да гэтай кнопачкі, крычаў, лаяўся, прасіў, але яго надзейна трымалі маладыя, дужыя рукі і раптам Антосю падалося, што нешта падобнае, калі ён адчайваўся ад сваёй бездапаможнасці супроцьстаяць фатальнай грубай сіле, з ім ужо было. Дзе і калі было?.. У дэфензіве, у астрозе?.. І ён аціх, невідушча гледзячы наперад, з вачэй самі самой пакаціліся, упалі на калені буйныя, як боб, горкія, як пальн, слёзы горычы і крыўды...

ВАЧАМІ СЯБРОЎ

«ШМАТФАРБНА ЗЗЯЮЦЬ ЗОРКІ З МІНСКА»

У час святкавання 40-годдзя гістарычнай Перамогі савецкага народа над гітлераўскім фашызмам шмат калектываў прыехала ў нашу краіну, каб удзельнічаць у Днях культуры СССР у ГДР. Сярод іх былі Чырванасцяжны ансамбль песні і танца Савецкай Арміі пад кіраўніцтвам Б. Аляксандрава, Паўночны рускі народны хор, балетная трупа Вялікага тэатра, Ансамбль народнага танца Грузіі, выдатныя выканаўцы Сяргей Абразцоў, Людміла Зыкіна. У прадстаўнічай дэлегацыі былі і беларускія артысты.

У акрузе Патсдам, горадзе, які з'яўляецца пабрацімам Мінска, выступалі народны харэаграфічны ансамбль «Зорка» Палаца культуры тэкстыльшчыкаў Мінскага ордэна Леніна камвольнага камбіната імя 50-годдзя Кампартыі Беларусі, ансамбль «Купалінка» і выканаўца народных песень спявачка Валянціна Пархоменка.

Мне, канструктару аўтамабільнага завода ІФА ў Людвігсфельдзе, давялося быць перакладчыкам і гідам беларускіх артыстаў, бачыць іх штодзённыя рэпетыцыі, выступленні, і таму хацелася б падзяліцца некаторымі сваімі ўражаннямі.

Беларускіх сяброў мы сустракалі на берлінскім вакзале. Нарэшце, пягнік падыходзіць да станцыі. Гучыць духавы аркестр... З вагона выходзіць вялікая група дзяўчат. Гэта і ёсць нашы госці. Мы вітаемся з Зояй Пятрушай, намеснікам дырэктара Мінскага камвольнага камбіната, вясёлай сардэчнай жанчынай. Удзельніцы калектываў атрымліваюць ружы ад дзяўчат з Саюза свабоднай нямецкай моладзі.

І вось ужо аўтобусы скіроўваюць у бок Патсдама, які знаходзіцца за семдзесят кіламетраў ад Берліна. Нас суправаджаюць матацыклісты народнай паліцыі ў белым адзенні вулічных рэгуліроўшчыкаў.

Упершыню беларускія дзяўчаты бачаць пагранічны вал, які аддзяляе сталіцу ГДР Берлін ад Заходняга Берліна. Так, гэтыя дамы за пагранічнай агароджай — гэта ўжо захад, зусім іншы свет. Аўтобусы імчаць далей, і мы бачым з акон дзелавыя раёны нашага горада, берлінскі грузавы порт, перасякаем па мосце раку Шпрэе...

У Патсдаме дэлегацыя беларускіх артыстаў размясцілася ў Акадэміі культуры пры аблвыканкоме акругі Патсдам, дзе звычайна праходзяць стажыроўку і слухаюць лекцыі работнікі культуры раёна. А вечарам 14 мая ў акруговай партыйнай школе САПГ адбылося ўрачыстае адкрыццё Дзён культуры. Першы нумар праграмы нашых сяброў — харэаграфічная сюіта «Прывітальная» — адразу выклікаў шквал апладысментаў. Не паспелі яны аціхнуць, як заслона зноў адкрываецца і пачынаецца беларускі лірычны танец «Зорка», які і даў назву харэаграфічнаму калектыву. Лёгкасцю, жыццярадаснай прыгажосцю прываблівае «Крутуха». Цяжка перадаць словамі ўсю абаяльнасць танцораў! Памеры сцэны значна меншыя за тыя, да якіх прызвычаіліся артысты, ім даводзіцца па ходзе выступлення сёе-тое мяняць, але пра гэта я даведваюся толькі пасля канцэрта, а зараз і мне, і маім суседзям здаецца, што ўсё ідзе як мае быць.

Жартаўлівы танец «Вясковы донжуан», які выконваюць А. Усціновіч і артысткі ансамбля, надае новае, гарэзнае, гумарыстычнае гучанне праграме. Блізкая да гэтага нумара па сваім настроі і рытмічная, вясёлая «Расхадуха». Сярод выканаўцаў асабліва запамінаюцца Наталля Варанкова, Святлана Урбановіч, Галіна Лосева.

У тым прыёме, які аказвае беларускім артыстам нямецкі глядач, вялікая заслуга кіраўніка ансамбля Юрыя Варанцова. У рэпертуары калектыву пераважаюць яго пастаноўкі. Праграма «Зоркі» — яшчэ адно сведчанне жыццёвасці старадаўніх народных танцаў. Варта зазначыць, што спалучэнне ў адной праграме нумароў харэаграфічнага ансамбля «Зорка», выступленняў ансамбля «Купалінка» і песень у выкананні Валянціны Пархоменка натуральнае і зразумелае: усе яны аб'яднаны глыбокай павагай і цікавасцю да мастацтва, створанага народам, да фальклорнай спадчыны.

Пасля канцэрта публіка доўга не разыходзілася, гледачы абмяркоўвалі ўбачанае.

Наступнае выступленне нашых сяброў адбылося ў Доме культуры «Артур Ладвіг» у Людвігсфельдзе, горадзе аўтамабілебудаўнікоў камбіната ІФА. Сцэна тут прасторная, добра абсталяваная. Білеты на канцэрт атрымалі лепшыя рабочыя і служачыя завода. Не памылюся, калі скажу, танцоры і спевакі з Беларусі выступалі тут з бляскам і асаблівым энтузіязмам. А гэта было нялёгка, бо за дзень літаральна ўсіх знясіліла гарачыня. Але імклівасць праграмы не дае гледачам перавесці дух. Украінскі жартаўлівы танец «Варэнікі», які выконваюць Н. Варанкова, В. Трусевіч і А. Усціновіч, змяняе рускі лірычны карагод «Улітушка», потым вакальныя нумары і зноў танец...

Напярэдадні вячэрняга канцэрта мае калегі паказвалі дзяўчатам завод, дзе вырабляюцца 6-тонныя грузавыя аўтамашыны. Асабліва зацікавіў іх галоўны зборачны канвеер. На ім побач з нямецкімі хлопцамі і дзяўчатамі працуюць в'етнамцы, алжырцы, рабочыя з Мазамбіка, якія праходзяць тут практыку. У першыя пасляваенныя гады, у час правядзення ў ГДР дэмакратычнай зямельнай рэформы Савецкі Саюз у якасці дапамогі выдзеліў нашай краіне немалую колькасць трактароў і грузавікоў, а цяпер наша прадпрыемства адпраўляе машыны, галоўным чынам для сельскай гаспадаркі, у В'етнам, Анголу, Эфіопію, у Нікарагуа і іншыя краіны, выконваючы такім чынам свой інтэрнацыянальны абавязак.

Калі ў Людвігсфельдзе беларускія артысты выступалі перад рабочымі, дык у наступны дзень мы выпраўляліся ў горад Лукенвальд, дзе нашы сябры маглі пазнаёміцца з сацыялістычнай сельскай гаспадаркай. Пасля агляду мясцовага музея, які расказвае пра шлях, пройдзены нямецкай вёскай ад перыяду феадалізму да нашага часу, артыстаў запрасілі ў маладзёжны клуб. Нашы хлопцы і дзяўчаты разам з беларусамі спявалі савецкія песні.

А надвячоркам уся беларуская дэлегацыя збіраецца ў гарадскім тэатры, прасторным, на восемсот месц. Перад канцэртам артысты рэпеціруюць. У час гэтага выступлення асаблівы поспех выпадае на долю цікавай эстрадна-харэаграфічнай карціны «Рэгуліроўшчыцы».

Вялікі артыкул «Шматфарбна ззяюць зоркі з Мінска», змешчаны ў акруговай патсдамскай газеце, падвёў вынікі першых дзён выступленняў беларускіх артыстаў. Акрамя таго, газета змясціла інтэрв'ю ўдзельнікаў ансамбля «Зорка».

План правядзення Дзён культуры СССР у ГДР прадугледжваў таксама выступленне беларускіх артыстаў у горадзе Вітштаку. Канцэрт адбыўся на адкрытай пляцоўцы, якая знаходзіцца перад пабудаванай яшчэ ў сярэднявеччы брамай гарадской сцяны. Умовы выступленняў складаныя, але ў калектыве, можна сказаць, высокі баявы дух. Да таго ж, надвор'е цудоўнае. Здаецца, на канцэрт сабраўся ўвесь гарадок. Усе месцы заняты, многія гледачы стаяць у праходах. Як толькі ўключаецца ўзмацняльная апаратура, падыходзяць людзі з бліжэйшых садовых участкаў. Што зрабіць — прыцягальныя мелодыі «Крутухі», «Расхадухі», «Вясковага донжуана»! Вядучая, стройная, прыгожая Таццяна Равункова без перакладчыка на нямецкай мове аб'яўляе ўсе нумары праграмы.

Надыходзіць чарга харэаграфічнай кампазіцыі паводле аповесці Б. Васільева «А досвіткі тут ціхія». Яна прысвечана жанчынам Вялікай Айчыннай вайны.

...Вясёлыя, жартаўлівыя танцавальныя сцэнкі змяняюць адна адну, малююць мірнае, перадваеннае жыццё. Але ў музыцы адчуваецца трывога, блізкая небяспека. На сцэне з'яўляюцца дзяўчаты-байцы разам з сяржантам (В. Трусевіч). Іх танец такі выразны, што, здаецца, і ты — удзельнік трагічных падзей. Мовай пластыкі расказваюць артысты пра тых, хто не вярнуўся з вайны...

Урачыстая, святочная па свагім гучанні харэаграфічная сюіта «Сузор'е сясцёр», якую выконвае «Зорка». Яна ўслаўляе непарушную дружбу народаў Савецкага Саюза. Артысткі ў нацыянальных касцюмах сімвалізуюць пятнаццаць саюзных рэспублік...

Апошняе выступленне прадстаўнікоў беларускага мастацтва было на востраве «Дружбы», які знаходзіцца паміж двума рукавамі ракі Гафель. Гэта адно з любімых месцаў адпачынку жыхароў Патсдама. Калі разам з артыстамі мы прыехалі на востраў, там было ўжо шмат народу. Надвор'е цудоўнае, сонечнае, настрой святочны, нядзельны. Прадстаўнікі горада Патсдама зычаць савецкім артыстам поспехаў, і праграма пачынаецца, ізноў гучаць беларускія мелодыі...

Пасля заканчэння апошняга выступлення нашых сяброў чакаў сюрпрыз. Аўтобусы з артыстамі спыняюцца каля старадаўняга млына: на ўскраіне Патсдама праходзіць заключны вечар некалькіх груп савецкай дэлегацыі.

У гэтай прыўзнятай атмасферы кіраўнікі акругі сардэчна дзякуюць артыстам за паспяховае правядзенне Дзён культуры СССР. Ансамблю «Зорка» прысвойваецца званне «Заслужаны ансамбль народнай творчасці ГДР». Кіраўнікам «Зоркі» і «Купалінкі» Юрыю Варанцову і Аляксандру Гундараву ўручаюцца медалі.

Надыходзіць час расстання... Я цвёрда перакананы: нават калі б мы не абмяняліся адрасамі, нас назаўжды паяднала б моцная дружба.

Дзякуй вам, мае беларускія сябры!

Герберт АЛЬГРЫМ,
канструктар аўтамабільнага завода ІФА.
г. Людвігсфельд, ГДР.

НА ХВАЛЯХ ЭФІРУ

ШТРЫХ НА ПАЛАТНЕ

Пасля прагляду фільма «ХОЛАД ПА ПАЧАТКУ ВЯСНЫ»

Зусім нядаўна — нібы ўчора!— крочыў па нашых гарадах і вёсках Май, расквечаны сцягамі вялікага свята — саракагоддзя Перамогі над гітлераўскім фашызмам, свята, якое залпамі свайго салюта зноў скаланула нашу памяць аб Вялікай Айчыннай, нарадзіла сотні новых кніг, спектакляў і кінафільмаў, прысвечаных ратнаму подзвігу народа. Тэма Вялікай Айчыннай — невычэрпная. І — надзённая. Яшчэ не раз звернуцца да яе мастакі слова, мастакі тэатра і кіно. І на вялікім палатне мастацтва, прысвечанага мінулай вайне, будуць з'яўляцца ўсё новыя і новыя фарбы, новыя штрыхі.

Такім штрыхом на вялікім палатне стаў кароткаметражны мастацкі фільм творчага аб'яднання «Тэлефільм» студыі «Беларусьфільм», зняты па заказу Дзяржтэлерадыё БССР,— «Холад на пачатку вясны», у аснову якога пакладзена аднайменнае апавяданне Анатоля Кудраўца. Паставіў карціну Валянцін Урагаў, галоўны аператар — Пётр Крывастаненка, мастак-пастаноўшчык Уладзімір Чарнышоў, кампазітар Леанід Захлеўны, рэдактар Нэля Кліменка.

Вадзім САНЬКО ў ролі Кастуся.

Чым прывабіла аўтараў фільма апавяданне Анатоля Кудраўца? Перш за ўсё — праўдай, праўдай характараў, абставін і драматычных калізій. У апавяданні няма батальных сцэн. Гэта — «ціхае» апавяданне пра партызанскі побыт, пра штодзённае жыццё мірных жыхароў у партызанскай зоне. І ў вайну людзі кахаюць, чакаюць, мараць, нараджаюць дзяцей... Гадуюць іх, выхоўваюць...

Вайна і дзеці, станаўленне іх чалавечай сутнасці ў нялюдскіх умовах — вось што знаходзіцца ў цэнтры ўвагі аўтара і—натуральна — стваральнікаў карціны.

Аўтар апавядання, якое дало і назву фільму, заглядае ва ўнутраны свет дзіцяці ваеннай пары, і назва гэтая, яе паэтыка раскрываецца ўсім зместам. Халады на пачатку вясны — гэта сівер на пачатку жыцця, калі чалавек кволы, як маладзенькае дрэўца...

З некалькіх сюжэтных ліній пастаноўшчыкі карціны ўзялі адну — драму душы хлопчыка Кастуся, які закахаўся ў партызанку. Пільна ўглядаюцца яны ў жыццё душы хлопчыка, якое супрацьстаіць жорсткай рэчаіснасці. Дарослыя ваююць, яны вымушаны забіваць і гінуць, а Кастусь — дзіця чалавечае — поўны пяшчоты, дабрыні, ён прагне цеплыні і цягнецца да яе. Да цеплыні чалавечнасці. І гэтая цеплыня, агеньчык яе свеціцца і ў змроку трывожнага, суровага, цяжкага жыцця вёскі, як агеньчык лучыны ў аконцы хаты, які камера аператара набліжае да нас, вылучае яго з агульнай дрыготкай, змрочнай атмасферы вёскі. У адпаведнасці з інтанацыяй апавядання, з яго фонам: «...Буда прымоўкла, прыціхла, насцеражылася... Усе жылі ў чаканні нечага невядомага, страшнага...»

Мігціць агеньчык, знікае. Паўстаюць у цемры людскія постаці — партызаны выступаюць у паход. І зноў — адчуванне трывогі, бяды, няшчасця. Тое ж адчуванне ў сцэне вечарынкі.

Нарэшце, сцэна развітання з забітымі партызанамі, дзе драматызм падзей дасягае кульмінацыі. Яна знята строга, лаканічна і ўражліва. І тут, безумоўна, заслуга як аператара, так і Стэфаніі Міхайлаўны Станюты, якая здолела перадаць увесь трагізм мацярынскага гора ў жыццёва простых, такіх будзённых словах: «Сынок, што баліць? Дзе баліць? Галоўка баліць...»

На фоне гэтых трывог усё выразней праступае, разгараецца агеньчык Кастусёвай душы, агеньчык яго закаханасці ў дарослую партызанку Таню. І справа тут не ва ўзросце, справа ў самой сутнасці першага кахання, аднаго з самых чалавечных пачуццяў, у ім — завязь жыцця чалавечага, яго неўміручасць. І дарослым чалавекам, «мужчынам» Кастусь становіцца ў сілу свайго кахання. Ён кахае на ўсю моц, раўніва, страсна. І разам з тым ён — хлапчук, які яшчэ ўчора, калі не было Таці, гэтак жа моцна, як яму здавалася, любіў Людмілу.

З гумарам, са спачуваннем, з добрым веданнем псіхалогіі дзіцяці напісаны ў апавяданні Кастусь. І гэта перанесена ў фільм. Выканаўца ролі Кастуся Вадзік Санько — галоўная ўдача пастаноўшчыкаў. Вадзік—Кастусь увайшоў у карціну, як патрон у абойму, без «зазубрын», без натугі. Логіка яго паводзін, яго дарослая сур'ёзнасць, гаворка, рухі — усё натуральнае, праўдзівае. Цэльны, цікавы характар!

Кранае апошняя сцэна карціны, калі Кастусь, перажыўшы шмат драматычных, складаных момантаў, душэўных узрушэнняў, размаўляе з маці:

— Як вырасту — ажанюся з Таняй. Ты, мама, не бойся, я буду яе любіць. І цябе буду любіць!

І гэтыя словы гучаць сімвалічна, абагульняюча: каханне не забіць, не скалечыць, яно будзе жыць у чалавечым сэрцы.

Так, ва ўсякім разе, ставіць акцэнты рэжысёр. Нехта сказаў, што рэжысёр пачынаецца з выбару тэмы... Малады рэжысёр здолеў знайсці не толькі тэму, але той асаблівы матыў, які ціха, але пранікнёна гучыць у поліфаніі твораў пра вайну. І тым самым зрабіў сур'ёзную заяўку на сваю тэму. Хай сабе карціна — толькі штрых на вялікім палатне мастацтва, якое адлюстроўвае Вялікую Айчынную, але штрых запамінальны.

Р. ДЗМІТРЫЕВА.

ДУША НЕ ВЕДАЕ СПАЧЫНУ

У любой экспазіцыі абавязкова знойдзецца твор, які надае своеасаблівую падсветку ўсёй выстаўцы, а калі яна персанальная, дык дапамагае хутка знайсці найбольш істотнае і характэрнае ў дзейнасці аўтара. Такім творам-запеўкай на выстаўцы заслужанага дзеяча мастацтваў БССР Адольфа Гугеля, якая працуе цяпер на другім паверсе Палаца мастацтваў у Мінску, з'яўляецца трыпціх «Сімфонія рэвалюцыі». Работа выканана сумесна з заслужаным дзеячам мастацтваў БССР Р. Кудрэвіч. Тэма абнаўлення свету, нараджэння новага жыцця, калі адбываліся найвялікшыя сацыяльныя пераўтварэнні, вырашаецца, можна сказаць, традыцыйна, без знешняга вобразнага эфекту, але ў палотнах прысутнічае той важны падтэкст, што дазваляе прачытаць не толькі сутнасць аўтарскай задумы, але і адчуць плённасць мастакоўскага пошуку, уменне знайсці свой падыход да спасціжэння з'яў гістарычнай важнасці.

Левая частка—«Расія—турма народаў» прываблівае пакутліва - засяроджаным воблікам жанчыны, закаванай у кайданы. Яна —і пакутніца-рэвалюцыянерка, і ўвасабленне самой мужнасці, і сімвал царскай Расіі, якая была турмой народаў. Другая частка трыпціха—«Апасіянта». Уладзімір Ільіч Ленін слухае неўміручы твор Бетховена, у думках пераносячыся туды, дзе не будзе зняволеных ні фізічна, ні духоўна. Апафеоз гэтай гаворкі пра эпоху рэвалюцыі—завяршальная частка трыпціха «Да новага жыцця». На палатне паказаны чырвонаармеец і жанчына, што мае ўжо права свабодна распараджацца сваім жыццём.

Трыпціх «Сімфонія рэвалюцыі» не выпадкова ў экспазіцыі вынесены на першы план, бо тэма Леніна, рэвалюцыі, партыі ў творчасці А. Гугеля займае важнае месца. Аматарам мастацтва добра вядомы шмат якія работы аўтара, пасобныя з якіх прадстаўлены і на выстаўцы — «Камунары», «У. І. Ленін і Н. К. Крупская ў Горках», «Ленін сярод раненых чырвонаармейцаў»... Само паняцце тэмы рэвалюцыі мастак бачыць шырока і аб'ёмна, у гістарычным ракурсе. Таму з поўным на тое правам у гэты спіс можна ўключыць такія карціны, як «Карл Маркс і Фрыдрых Энгельс у Лондане», «Кастусь Каліноўскі»... А хіба не працяг гэтай праблематыкі ў карцінах, выкананых сумесна з Р. Кудрэвіч,—«Гранада», «Інтэрнацыянал»... Сапраўды ўжо, «ёсць у рэвалюцыі пачатак, няма ў рэвалюцыі канца».

І да тэмы вайны А. Гугель падыходзіць таксама па-свойму. Яго меней за ўсё цікавяць сцэны батальнага характару. Мастак разумее, што паняцце подзвіг усенародны—шырокае і ёмкае, таму імкнецца праз характары і вобразы асобных людзей спасцігнуць глыбінны сэнс значнасці Перамогі над фашызмам, паказаўшы яе як заканамерны фінал, тое непазбежнае, што павінна было адбыцца, бо ніколі не магчыма зламаць і пакарыць народ, які верыць у сваю справу, па-сапраўднаму любіць Радзіму.

Уражвае сюжэтнай завершанасцю і кампазіцыйнай стройнасцю «Партызанская балада»... Свая мелодыка ў палатна «Партызанам Беларусі прысвячаецца» (у сааўтарстве з Р. Кудрэвіч), вырашаным нават з пэўнай схільнасцю да «фатаграфавання» рэчаіснасці. Народныя мсціўцы—мужчыны, жанчына, падлетак—людзі розных узростаў — бы застылі перад аб'ектывам нейкай схаванай камеры, але ўгледзішся ўважлівей у твары, і адразу заўважаеш, што натуралізм адсутнічае, навідавоку тая ўнутраная дынаміка твора, якая дазваляе выявіць індывідуальнасць кожнага.

«Партызанам Беларусі прысвячаецца» адна з апошніх работ А. Гугеля. Яна выканана летась, а гэта твор сёлетняга года — «Дзеці вайны». На пярэднім плане — дзве дзяўчынкі і два хлопчыкі. Крыху воддаль—яшчэ маладая жанчына, што трымае на руках немаўля. Сполахі пажарышчаў, дым... Міжволі прыгадваеш адну з ранейшых работ мастака — «Ля плятня», якая таксама ёсць у экспазіцыі. Наколькі кантрастныя малюнкі?! Тут—смерць, слёзы, пакуты, а там—вясёлыя твары дзяўчынак, радасць, само жыццё.

Адольф Гугель і паказвае паўсядзённасць, а таксама тое, што ўжо стала гісторыяй, у дыялектычным разрэзе. Для мастака вельмі важна перадаць і саму рухомасць падзей у часавым іх выяўленні, і зменлівасць чалавечага характару. Застаючыся рэалістам, ён не адмаўляецца і ад пэўнай рамантызацыі, калі адчувае, што таго вымагае сам характар твора. І, наадварот, можа паўстаць непаўторным лірыкам, своеасаблівым паэтам у выяўленчым мастацтве, альбо свядома адмовіцца ад якой бы там ні было паэтызацыі.

Дзеці вайны.

Мой родны кут...

Пацвярджэнне таму і ранейшыя творы, і напісаныя нядаўна. Напрыклад, партрэт «Якаўлеўна»—відавочная схільнасць да пэўнай прыземленасці вобраза. Старая вясковая жанчына, не сказаць, каб знешне прыгожая. Нават на твары яе бачыцца некаторая мужыкаватасць. Ды і паказана яна за звычайным заняткам: у адной руцэ вядро, у другой — венік. Але менавіта гэтая прыземленасць дае прастору да роздуму, дапамагае адчуць неардынарнасць характару, і... убачыць паэзію ў паўсядзённасці, палюбіць гэтую простую жанчыну, якая жыве на зямлі сумленна і працавіта.

А гэтая паэзія — навідавоку, не прыхаваная, напоўненая сонечнасцю. «Юнацтва», «Мой родны кут...» Ды і хіба можна пісаць інакш, калі апяваецца само юнацтва, светлыя ранкі яго, імклівыя парыванні мары аб яшчэ няздзейсненым. Дзяўчынка на апошняй карціне хутчэй за ўсё чытае томік вершаў свайго любімага паэта Янкі Купалы. Так меркаваць ёсць усе падставы, бо А. Гугель асабліва прыхільна і ўважліва ставіцца да творчасці народнага песняра, часта наведвае Вязынку, іншыя мясціны, дзе давялося бываць Купалу. Пасля гэтага нараджаюцца творы, што апяваюць неўміручасць паэта, яго вечнасць у памяці народа («Восеньскі роздум», «Пралескі»), або перадаюць хараство купалаўскіх краявідаў.

Увогуле, мастак любіць падарожнічаць і па рэспубліцы, і за яе межамі. Віцебск, Рыга, Суздаль, Уладзімір, Талін, Ленінград... Толькі паасобныя адрасы гэтых паездак, адкуль таксама прывезены шматлікія эскізы, занатоўкі ў блакнотах. Некаторыя з іх трапілі на выстаўку, гэтаксама як знайшлося ў экспазіцыі месца нацюрмортам, манатыпіям.

Нядаўна А. Гугель адсвяткаваў сваё сямідзесяцігоддзе, сустрэўшы гэты значны юбілей у росквіце таленту, апантаны новымі планамі і задумамі. Душа майстра па-ранейшаму не ведае спачыну... А значыць—наперадзе новыя творы, далейшае імкненне да вяршынь дасканаласці, якія ў кожнага сапраўднага творцы з цягам часу ўзнімаюцца ўсё на новыя і новыя вышыні.

А. БЕРАЗОЎСКІ.

Восеньскі роздум.

ПА ПРАЦЫ І ПАШАНА

Надзвычай цікавая карцінная галерэя створана ў саўгасе «Дварэц» Рагачоўскага раёна. Побач з пейзажнымі і сюжэтнымі творамі ў сельскім Доме культуры знаходзяцца партрэты лепшых людзей гаспадаркі. Карціны напісаны беларускімі мастакамі А. Марачкіным, Я. Харытоненкам, П. Свентахоўскім.

У галерэі — партрэты цялятніцы саўгаса А. Савіч, механізатараў М. Вежнаўца, У. Труханава, рабочай Л. Піменавай, брыгадзіра паляводчай брыгады Я. Лявонава. Побач з імі — партрэт ударніка трох пяцігодак вадзіцеля М. Лукашэвіча, які вось ужо чвэрць стагоддзя працуе ў родным саўгасе.

Усе гэтыя людзі — перадавікі сельскагаспадарчай вытворчасці, ветэраны саўгаса, дабіваюцца найлепшых паказчыкаў у сацыялістычным спаборніцтве, з'яўляюцца выдатнымі настаўнікамі моладзі.

М. КАВАЛЕЎ.

МЕЛОДЫІ ЧАРОЎНАГА СМЫЧКА

«Дастоеўскія полькі» — так называецца вянок старадаўніх палескіх найгрышаў, з якім дэбютаваў новы творчы калектыў Белдзяржфілармоніі — ансамбль народнай музыкі «Свята». А запісалі іх фальклярысты ад 80-гадовага вясковага музыкі В. Прыбышчука з вёскі Гараваты Іванаўскага раёна, які памятае і можа выканаць на скрыпцы больш за сто песень, танцаў, мелодый роднага краю. Музыкамі былі яго прадзед, дзед, а затым бацька, радавалі вяскоўцаў мелодыямі чароўнага смычка на вяселлях, радзінах і іншых святах.

Улюбёнасць Віктара Калістратавіча ў палескую музыку, яго незвычайная памяць дапамаглі вядомаму музыкантуэстаўратару У. Пузыню аднавіць старадаўні беларускі інструмент басэтлю, якая гучыць цяпер у ансамблі «Троістыя музыкі» Мінскага інстытута культуры.

У глыбінях народнай музыкі бярэ вытокі майстэрства і другога вясковага «маэстра» — 70-гадовага Аляксея Нічыпаравіча Дардзюка з Новых Борак Маларыцкага раёна. Яго мелодыі — упрыгожанне канцэртаў, святаў у калгасе, фестываляў народнага мастацтва ў Маларыце, Брэсце, Мінску.

М. ГОРСКІ.

ВАС СУСТРЭНЕ КАЗКА

У пакоі рэгістрацыі шлюбаў Гасцілаўскага сельсавета, што ў Лідскім раёне, увагу адразу прыцягваюць незвычайныя разныя драўляныя крэслы і такі ж стол. За іх запрашаюцца шчаслівыя маладыя. Дзівосную мэблю гэтую, якая, безумоўна, дадае настрою ўсім прысутным, падарыў ЗАГСу сталяр мясцовага саўгаса «Малае Мажэйкава» М. Рыжкевіч.

З пілой і сякерай Міхаіл Антонавіч пасябраваў, калі пасля вайны пачаў будаваць дом. Ён упрыгожыў хату разнымі налічнікамі, веснічкамі. У двары паявіліся казачныя домікі з дзівоснымі драўлянымі звярамі, а ў хаце — разныя лаўкі, сталы, канапы, фігуркі кніжных герояў.

Сённяшняя хата Рыжкевічаў, якая знаходзіцца ў цэнтры вёскі Бешанкі, уяўляе сабой музей драўлянага дойлідства. У госці да разьбяра ідуць школьнікі, едуць людзі з Ліды, Гродна, Мінска. Работы Міхаіла Антонавіча экспанаваліся на розных выстаўках, ёсць яны нават у Дзяржаўным музеі БССР. А колькі падарыў гаспадар сваіх тварэнняў суседзям, гасцям, розным людзям. Ветэран і сёння працуе ў сталярні. Цяжка знайсці такую пабудову ў гаспадарцы, наогул дом у наваколлі, да якога не дакрануліся б яго таленавітыя рукі...

А. ПЕТУХОЎ.

«СЯРЭБРАНАЕ» ТРЫО

З сярэбраным юбілеем павіншавалі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Брэсцкага Дома культуры чыгуначнікаў архітэктара Анатоля Маліцкага, педагога Івана Дрыгайлоўскага і служачага Паўла Жмайліка. Трыо, якое яны ствараюць, адзначыла 25-годдзе. Увесь гэты час, нягледзячы на занятасць на рабоце, хатнія клопаты, спяшаюцца спевакі-аматары на рэпетыцыі і канцэрты. Без удзелу «сярэбранага» трыо рэдка праходзяць выступленні народнай харавой капэлы чыгуначнікаў. Настойлівае авалоданне харавой культурай, багатыя вакальныя дадзеныя дазволілі А. Маліцкаму, І. Дрыгайлоўскаму і П. Жмайліку з гонарам прадстаўляць песеннае мастацтва нашай краіны ў ГДР, Чэхаславакіі, Венгрыі, Польшчы, Італіі. Прычым, кожны з удзельнікаў трыо выступае ў канцэртах як адораны саліст. Творчыя дасягненні аматараў адзначаны Дыпломам і Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных.

М. НІКОЛЬСКІ.

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ

Ганна АБУХОВІЧ,
народная артыстка БССР

«ТЫ ЛЯЦІ, МАЁ СЛОВА, ПРАЗ ПАЛІ І ЛЯСЫ...»

ВАЙНА застала Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР у Беластоку, дзе трупа знаходзілася на гастролях. Творчы калектыў аднадумцаў, ансамбль, які ўжо склаўся, сфарміраваўся, ураган вайны раскідаў у розныя бакі. Група маладых артыстаў з Ленінграда, якая ў 1939 годзе папоўніла калектыў, з вялікімі цяжкасцямі паехала дамоў. У вайну яны працавалі ў тэатрах блакаднага горада. Частка артыстаў адправілася на Волгу, некаторыя з іх працавалі ў горадзе Энгельсе.

Мы з Дзмітрыем Арловым апынуліся ў Краснаярску, у драматычным тэатры імя А. С. Пушкіна. Яшчэ да вайны калектыву патрэбна была актрыса, якая выконвала ролі маладых гераінь, і акцёр характарнага плана.

Выехаць з Масквы ў тыл, нават пры дапамозе Упраўлення па справах мастацтваў, было надзвычай цяжка. Цягнікі перапоўненыя. Дабіраліся доўга, нас абганялі эшалоны з абсталяваннем эвакуіраваных заводаў, састаў на многія гадзіны ставілі ў тупікі. Толькі пасля Свярдлоўска вызвалілася трэцяя частка ніжняй полкі, і я, нарэшце, змагла сесці, да гэтага трымала сына на руках.

Нарэшце, дабраліся да Краснаярска. Вакол цішыня, няма святломаскіроўкі. Не верылася нават, што недзе ідзе вайна. Нас сустракала кіраўніцтва тэатра і маладыя акцёры. Запрасілі ў тэатр для знаёмства з дырэктарам і галоўным рэжысёрам, распытвалі пра Маскву, пра вайну, пра тое, дзе цяпер наш калектыў.

І Дзмітрый Аляксеевіч, і я лічылі, што ў Краснаярску мы знаходзімся часова. Былі пераканаиы, што нам, артыстам, якія маюць ганаровыя званні Беларускай рэспублікі, сорамна сядзець у тыле, калі Беларусь акупіравана фашыстамі. Вырашылі паслаць просьбу ў Маскву, дзе тады знаходзіўся ўрад Беларусі, каб нас адклікалі ў франтавы тэатр.

У канцы лета 1941 года ў Краснаярск былі эвакуіраваны Адэскі і Днепрапятроўскі тэатры оперы і балета. Таму на сцэне драматычнага тэатра імя А. С. Пушкіна два дні выступаў аб'яднаны оперны тэатр і два дні—драматычны.

У горадзе знаходзілася каля пяцідзесяці шпіталяў. Мы арганізавалі некалькі канцэртных брыгад для абслугоўвання параненых. Былі канцэртныя брыгады артыстаў і ў оперных тэатрах. З улікам рэпертуару складалі расклад канцэртаў для шпіталяў на тры-пяць дзён. «Размоўнага» жанру ў нашых канцэртах было няшмат, у асноўным выконваліся дуэты і арыі з опер, народныя песні. Памятаю, асаблівай сімпатыяй слухачоў карысталіся фрагменты з оперы «Запарожац за Дунаем».

У свой канцэртны рэпертуар я ўключыла шмат патрыятычных вершаў, напісаных паэтамі ў час вайны. Асабліва любіла чытаць К. Сіманава—«Забі яго», «Чакай мяне».

Непасрэдна ў сваёй брыгадзе я вяла праграму, чытала, а таксама іграла з партнёрам скетч «Рыбачка з узбярэжжа». Сюжэт яго быў востры, і ўспрымаўся ранеными, дый не толькі імі, добра. З наступленнем халадоў Арлову і мне выдзелілі адзенне з тэатральнай касцюмернай—паліто, шапкі і валёнкі. Са старых тэатральных касцюмаў мы шылі сукенкі, якія выглядалі зусім прыстойна. Канцэртнае адзенне вельмі бераглі.

Калі вечар быў вольны ад спектакля, адбывалася пяцьшэсць канцэртаў. Амаль у кожнага з нас быў яшчэ і індывідуальны падшэфны шпіталь. У мяне — лётчыкі, пераважна маладыя хлопцы з цяжкімі пераломамі. Яны ляжалі на выцяжцы, і каб неяк іх супакоіць, развесяліць, мы імкнуліся выконваць жыццярадасныя, прасякнутыя аптымізмам або жартаўлівыя, гумарыстычныя творы. Памятаю, што чытала я ўрыўкі з Шэкспіра, апавяданні Зошчанкі.

У шпіталях не хапала медсясцёр і санітарак. На працягу тыдня артыстаў навучылі рабіць нескладаныя перавязкі, выдаваць хворым патрэбныя лякарствы. Мы дзяжурылі ў шпіталях па начах як медсёстры. А па якіх толькі адрасах ні пісалі славутыя ваенныя «трохкутнікі» пад дыктоўку параненых! Ад сябе дабаўлялі, што пісала ліст дзяжурная медсястра, паведамлялі, што хворы адчувае сябе лепей, ён хутка паправіцца і напіша сам. Колькі пісем я атрымлівала потым з фронту ад салдат, якія паправіліся! Шкада, што яны не захаваліся пры шматлікіх пераездах. На многія лісты я адказвала, пакуль не паехала ў Маскву ў канцы 1942 года.

Мы з Арловым неаднойчы пісалі ў Маскву, каб нас адклікалі з Краснаярска для работы ў франтавым тэатры. Там фарміраваліся брыгады артыстаў для абслугоўвання фронту. Толькі ў апошнія дні студзеня 1942 года з Масквы прыйшоў выклік для Дзмітрыя Аляксеевіча. Адпускаць з Краснаярска яго не хацелі. Цяжка было знайсці замену Арлову ў канцэртах, дзе раскрываўся яго яркі камедыйны талент.

У першыя дні лютага 1943 года прыйшоў выклік з Масквы і на мяне. Адпускалі мяне таксама без ахвоты: я была актыўна занята ў рэпертуары, шмат іграла. Мне даводзілі, што я, маці чатырохгадовага дзіцяці, не маю права пакідаць яго без нагляду і ад'язджаць на фронт. Так, развітвацца было нялёгка. Сын быў уладкаваны ў кругласутачны дзіцячы сад. Акрамя таго, пра яго абяцала паклапаціцца сям'я старшыні Краснаярскага крайвыканкома Аляксея Мацвеевіча Буеверава.

Я ад'язджала ў Маскву. Так дыктавала сумленне.

●

Калі дабралася да франтавога тэатра, Арлоў з брыгадай быў ужо на фронце. Брыгады фарміраваліся і накіроўваліся на фронт у штабе ўпраўленні, начальнікам якога быў Уладзімір Нежны, чалавек дзелавы, з талентам арганізатара. Пасля вайны ён доўгі час працаваў галоўным адміністратарам Малога тэатра.

Я атрымала абмундзіраванне, паёк на тры дні і накіраванне ў гасцініцу «Якар». У Маскве сустрэла многіх беларускіх пісьменнікаў —Янку Купалу з жонкай Уладзіславай Францаўнай, Пімена Панчанку, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Петруся Броўку, скульптара Заіра Азгура. Адчуванне было такое, быццам вярнулася дадому, у той цудоўны час, калі наш тэатр знаходзіўся на гастролях у Мінску, у 1940 годзе... (Як вядома, да вайны Рускі тэатр працяглы час працаваў у Магілёве).

У нумары 626 гасцініцы «Масква» размяшчаўся наш штаб, дзе ўвесь час дзяжурылі па чарзе прадстаўнікі брыгады. Ваенныя тэлефоны—«зумеры»—звязвалі нас з палітаддзелам арміі, адкуль і ішлі прызначэнні. Палітаддзел прызначаў і ваеннаслужачага, які суправаджаў нас. Брыгадзір адказваў за творчую частку, збор брыгады, яе гатоўнасць.

На наступны дзень пасля прыезду мяне ўключылі ў брыгаду, і на машыне мы паехалі ў аэрапорт. Самалётам нас даставілі да самай лініі фронту. Брыгада складалася з Н. Шпілер і І. Фёдарава, вядомых спевакоў Вялікага тэатра Саюза ССР, актрысы В. Валадзько з Цэнтральнага тэатра Савецкай Арміі, беларускай эстраднай спявачкі Р. Плоткінай і акардэаністкі. Я чытала і вяла праграму.

Звычайна брыгады былі зборныя—на адзін выезд. Склад іх на некаторы час (паводле заявак) замацоўваўся. Усе хутка рабіліся сябрамі. Гэта было вельмі важна. Няхай мы выступалі не на перадавой, але і каля яе бамбілі бязлітасна, абстрэльвалі, усялякае здаралася, і хацелася адчуваць надзейнае плячо сябра.

Наогул бывалі мы на Цэнтральным і Беларускім франтах, дзе выступалі шмат. Звычайна нас сустракалі, вялі ў зямлянку, асветленую газоўкай з патронных гільзаў. Канцэртнае адзенне апраналі за якой-небудзь фіранкай (я дагэтуль захоўваю тую сукенку). Мы давалі тры-чатыры канцэрты адзін за адным, з перапынкамі на некалькі хвілін, пакуль выходзілі адны гледачы і заходзілі другія. Стомы не адчувалі, бо бачылі, што патрэбныя тут. Нас слухалі і прымалі з асаблівым пачуццём—гэта надавала сілы. Пасля заканчэння канцэрта артыстаў часта распытвалі пра Маскву, перадавалі салдацкія «трохкутнічкі» з просьбай апусціць у паштовую скрынку, каб дайшлі хутчэй.

Колькі твараў, колькі вачэй засталося ў памяці з тых гадоў—уважлівых, добрых! Іх немагчыма забыць! І заўсёды думаеш: а ці вярнуліся з вайны, з фронту тыя, перад кім даводзілася выступаць?

Салдаты ішлі ў бой, а нас, брыгаду артыстаў, кармілі і адпраўлялі далей для выступленняў на другім участку фронту. На якім — мы не заўсёды ведалі.

Потым Масква, два-тры дні адпачынку ў «Якары». Спалі ўволю, бачыліся з землякамі, якія таксама не сядзелі на месцы, ад'язджалі і прыязджалі. І зноў на фронт! У адзін з такіх перапынкаў, калі чакала новага прызначэння, мне даручылі ўдзельнічаць у вялікім канцэрце, арганізаваным Славянскім камітэтам, чытаць цудоўныя, прасякнутыя высокім патрыятычным пачуццём вершы Пімена Панчанкі:

Ты ляці, маё слова, праз палі і лясы,
Прывітайся з краінай маёй дарагою,
Беларусь, я — твой воін адданы і сын,
Мае думкі і сэрца заўсёды з табою.

Ты мяне гадавала, ты мяне калыхала,
Ты мне песні, як родная маці, спявала,
Клапатліва збірала у шлях...

У гасцініцы «Масква» ў нумары побач з нашым штабам жыў вядомы наш кампазітар Анатоль Васільевіч Багатыроў з жонкай. Яны часта частавалі мяне чаем, далёка за поўнач зацягваліся нашы гутаркі. Калі Анатоль Васільевіч даведаўся, што я буду чытаць вершы Панчанкі, якія ў той час успрымаліся асабліва востра (уся Беларусь была акупіравана фашыстамі), ды яшчэ ў такім адказным канцэрце, ён загарэўся ідэяй напісаць да іх музыку. Але да канцэрта заставалася мала часу, і ён, на жаль, не паспеў ажыццявіць гэтую задуму...

Канцэрт, арганізаваны Славянскім камітэтам, прайшоў вельмі добра. У ім удзельнічалі славутыя спевакі Вялікага тэатра, артысты Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, артысты з замежных краін, якія ў час вайны знаходзіліся ў Маскве.

У другой палове 1943 года мяне накіравалі ў брыгаду па абслугоўванні дэсантных войскаў, якую ўзначальваў Д. Арлоў.

У канцы года многіх беларускіх артыстаў адклікалі з франтавых брыгад і напярэдадні 1 студзеня 1944 года накіравалі ў Навабеліцу, дзе ўжо знаходзіўся ўрад Беларусі, для ўдзелу ва ўрадавым канцэрце і для абслугоўвання байцоў 1-га Беларускага фронту.

САМАДЗЕЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

ЗАБЫТЫМ ШЛЯХАМ

Амаль забыта ў сучаснай Беларусі мастацтва «выцінанак» — сурвэтак, абрусаў, фіранак, што выразаліся з паперы, каб упрыгожыць інтэр'ер вясковай хаты. Да гэтага самабытнага мастацтва Вячаслаў Дубінка, які доўгі час выступаў як фатограф-мастак і фотарэпарцёр, звярнуўся ўжо ў сталым узросце. І захапіўся настолькі, што апошнія пятнаццаць гадоў нажніцы сталі адным з любімых інструментаў мастака. Дэкаратыўныя выцінанкі Дубінкі паказваліся па «Інтэрбачанні», выстаўляліся на ВДНГ. Але пасапраўднаму сваё другое жыццё яны набылі ў дзіцячай кнізе. Нездарма першае ўжо з праілюстраваных гэтак незвычайна выданняў — зборнік вершаў для дзяцей А. Вольскага «Жывыя літары» — заваявала дыплом першай ступені на рэспубліканскім конкурсе «Мастацтва кнігі».

Хуткія і дакладныя ўзмахі нажніц нараджаюць асаблівую пластыку ўяўлення. Узор часта сіметрычны — папера пры выразанні складвалася ў чатыры, шэсць, восем столак. Вастрыня ляза нараджае і асаблівы характар лініі — прамяністыя, вострыя, калючыя пер'і на хвасце ў маленькай сарокі, вострыя іголкі вожыка — здаецца, імі і сапраўды можна пакалоцца і гэтак смешна яны працінаюць рознакаляровыя грыбы, яблыкі, шышкі. А вось навагодняя ёлка — здавалася б, мільён разоў абыграны сюжэт. І ўсё ж у выцінанцы ён глядзіцца зусім па-іншаму: ажурныя галінкі, пяшчотныя птушкі, якія парамі сядзяць на галінках, прывабныя язычкі свечак.

Сама тэхніка нараджае вясёлую асаблівасць выяўлення і паядноўвае яго з арнаментам. Склаў майстар аркуш — і вось ужо два ваўкі, дзве лісіцы глядзяць адно на аднаго з-за дзіўных казачных дрэў. Вясёлай карнавальнай маскай уяўляецца нам зялёнавусы вадзянік. Толькі нажніцы маглі ўпрыгожыць яго так мудрагеліста вясёлымі доўгімі пасмамі барады, смешнымі яркімі зорачкамі, дзівоснай каронай і вострым трохзубцам.

У выцінанках В. Дубінкі сустракаеш матывы нацыянальных беларускіх вышыванак, вядомых слуцкіх паясоў (нездарма мастак нарадзіўся і доўга жыў у Слуцку), разьбы па дрэве. У беларускім народным дойлідстве здаўна ў выглядзе вільчакоў, якія завяршаюць дах дома, выкарыстоўваюцца сіметрычныя, павернутыя ў супраць-леглыя бакі, контуры рагоў каровы, конскіх галоў, фігурак птушак і змей. Жывуць гэтыя сілуэты і ў выцінанках В. Дубінкі. Асабліва ўдаваўся народным рэзчыкам конь. Яго ўбачым мы і ў некалькіх кніжках, праілюстраваных мастаком. Ён вельмі падобны на сваіх драўляных братоў: гэткім жа прыгожым контурам перададзена горда выгнутая шыя, невялікія зубчыкі падкрэсліваюць грыву. І гэта зразумела: мастак доўга вывучаў старабеларускую архітэктуру і не гэтак даўно закончыў арыгінальны цыкл выцінанак з 16 работ «Помнікі гісторыі культуры Беларусі».

В. Дубінка — мастак-імправізатар. Не пазначаючы папярэдне сілуэт, ён спрытна складвае паперу, упэўнена працуе вялікімі нажніцамі і на нашых вачах стварае прыгожыя арнаменты, сілуэты казачных звяроў і птушак.

Цікава, што ягоныя сілуэтныя фігуры заўсёды глядзяць на чытача. Падкладаючы некалькі пластоў каляровай паперы, мастак «канструіруе» арыгінальнае вока з чырвонай або блакітнай зрэнкай.

Працуючы над канкрэтнай кнігай, ілюстратар заўсёды трапляе ў пэўную залежнасць ад тэксту. Далёка не кожны твор, відавочна, можна праілюстраваць сілуэтам, бо гэтае мастацтва незвычайнае: ёсць у яго свае межы і свае законы, уласцівыя толькі яму асаблівасці мастацкай выразнасці. Дубінка, акрамя таго, належыць да творцаў, якія вельмі тонка адчуваюць слова (напомнім — не так даўно чытачы пазнаёміліся з новым зборнікам яго аповесцей), і ў афармленых ім кніжках адразу відаць, як чуйна адгукаецца ён на мастацкі ўзровень тэксту.

Адна з апошніх работ мастака — выцінанкі да дзіцячага зборніка вершаў Вольгі Іпатавай «Казка пра Паўліна». Вершы пісьменніцы — музычныя, у якіх шмат ад народнай песеннай традыцыі — прыкметна натхнялі мастака. Сярод арнаментальных заставак, фігур казачных і лясных звяроў з'яўляецца сілуэтны партрэт хлопчы-

Ад Масквы да Навабеліцы, што каля Гомеля, не так ужо і далёка, але ехалі доўга, з працяглымі перапынкамі. Паабапал дарогі трапляліся надпісы на фанеры — «атручана». Узрушала страшэннае разбурэнне, спаленыя вёскі, ад якіх засталіся толькі каміны...

Дабраліся ўдала. Група была не вельмі вялікая: вядомыя нашы артысты Ларыса Александроўская, Рыта Млодэк, Вера Малькова, Таццяна Аляксеева, балетны дуэт — Аляксандра Нікалаева і Сямён Дрэчын. У размоўным жанры выступалі Дзмітрый Арлоў і я.

Урад размяшчаўся ў доме, які стаяў сярод вялікага гаю. Адзін з пакояў, падзелены на дзве паловы вайсковымі палаткамі, адвялі нам. Падлога клапатліва заслана саломай. Утульна і цёпла.

Канцэрт павінен быў адбыцца ў клубе фабрыкі, але праходзіў ён у зусім іншым месцы, бо ў гэты час клуб бамбілі. Нягледзячы на такую напружаную абстаноўку, урачыстае пасяджэнне, прысвечанае 25-годдзю БССР, і ўрадавы канцэрт прайшлі святочна. Было запрошана шмат гасцей з Масквы.

У наступны дзень наша група, як і было запланавана, адправілася праз Сож у адну з бліжэйшых вёсак за Гомелем, дзе знаходзіўся штаб фронту. Ехалі ў санях. Нас сустрэлі двое ваенных, правялі ў хату, дзе мы пераапрануліся ў канцэртныя касцюмы, а потым у невялікую зямлянку з электрычным святлом ад рухавічка. На падлозе—дыван. У адным з куткоў — піяніна. Каля сцен расстаўлены крэслы. Праз некалькі хвілін да нас выйшаў камандуючы фронтам маршал Канстанцін Канстанцінавіч Ракасоўскі з групай генералаў. Ён вельмі проста, сардэчна павітаўся, спытаў пра настрой, пра тое, як прайшоў учора канцэрт, на якім ён, на жаль, не змог прысутнічаць, таму і папрасіў, каб мы прыехалі ў штаб фронту.

Канцэрт меў вялікі поспех. Зямлянка была невялікая, і гэта надавала многім нумарам асаблівую цеплыню, пранікнёнасць. Усе выступалі шчыра, з душой. Мы з Арловым выконвалі вельмі смешны скетч. Не змагла выступіць толькі танцавальная пара—не было месца.

Калі скончыўся канцэрт, Ракасоўскі сардэчна падзякаваў нам:

— Даўно не атрымліваў такога задавальнення. А цяпер запрашаю на сціплы абед.

Нас правялі ў суседнюю зямлянку, дзе быў накрыты стол. Ракасоўскі сам усіх нас размясціў. З аднаго боку ад яго аказалася Александроўская, з другога—я. Канстанцін Канстанцінавіч распытваў, дзе зараз знаходзяцца нашы тэатры, ухваліў нашу працу ў франтавых брыгадах, сказаўшы, што гэта вельмі патрэбная і карысная справа. Былі ўзняты тосты за народ, а галоўнае — за нашу перамогу!

Нечакана ў зямлянку ўвайшоў палкоўнік. Ён нешта ціха сказаў камандуючаму. На нашых вачах Ракасоўскі зрабіўся іншым—строгім, падцягнутым. Заклапочана папрасіў прабачэння:

— Дарагія госці, на жаль, нам час развітвацца. Поспехаў вам у вашай вельмі патрэбнай працы.

Далей наш шлях ляжаў на Рэчыцу. Сюды прыехалі пад вечар, дабіраліся на двух вазках. Нас сустрэлі, правялі па лесе ў вялікую зямлянку, дзе дымяліся звыклыя газоўкі з патронных гільзаў і шчыльнымі радамі сядзелі на падлозе стомленыя байцы. Мы далі тры канцэрты, пасля іх салдаты адразу адпраўляліся ў бой. Пачыналася наша наступленне.

На світанні мы адправіліся ў Навабеліцу, каб адтуль дабрацца да Масквы.

Трэба было працягваць работу ў франтавых брыгадах. Салісты беларускай оперы паехалі ў горад Горкі, куды быў эвакуіраваны іх тэатр. Ужо адтуль, у складзе франтавых брыгад, яны адправіліся абслугоўваць Цэнтральны фронт. З нашага тэатра ў Маскоўскім упраўленні франтавых брыгад працавалі толькі два чалавекі: Арлоў і я.

Пасля вяртання ў Маскву мы звычайна прыходзілі ў свой, ужо такі знаёмы штаб-упраўленне далажыць што заданне выканана.

Аднойчы таварышы сустрэлі мяне незвычайна радасна і шумна:

— Анюта, мы ўсе цябе віншуем!

У мяне была вялікая непрыемнасць. Мае боты былі дзіравыя, і я вельмі часта хадзіла з мокрымі нагамі. Натуральна, я з радасцю пытаюся:

— Мне выпісалі новыя боты?

Яны смяюцца і гавораць:

— Якія боты? Табе прысвоена ганаровае званне народнай артысткі БССР!

Я так разгубілася, што і слова сказаць не магла. Неўзабаве мяне выклікалі ў Цэнтральны выканаўчы камітэт БССР і выдалі пасведчанне народнай артысткі БССР за № 3 у тонкай кардоннай вокладцы чырвонага колеру. Я беражліва і асіла яго ў кішэні гімнасцёркі...

Запіс Т. МУШЫНСКАЙ.

ка з лукам. Гістарычная балада Іпатавай пра гераічнага дзесяцігадовага Петрака, які загінуў у няроўным баі з татарамі, сама па сабе дастаткова рамантычная і арнаментальная. Колеры выцінанкі-ілюстрацыі — чорны з чырвоным, разная чорная рамка атрымліваюць тут рамантычнае і разам з тым жалобнае гучанне.

Мудрагелістая ўзорыстасць выцінанак Дубінкі заварожвае. Але асабліва да месца яны ў дзіцячых кніжках. Бо з нажніцамі і каляровай паперай нашы малыя сустракаюцца нават раней, чым з фарбамі. Да мастацтва аплікацыі дзіця адчувае асаблівую цягу.

Акрамя таго, мастацтва сілуэта ўжо мае сваю гісторыю ў савецкай дзіцячай кнізе. У рускай часопіснай графіцы першай паловы нашага стагоддзя ў поўную сілу гучаў самабытны голас мастака Л. Юдзіна (1903—1941), які віртуозна валодаў тэхнікай выцінання, актыўна супрацоўнічаў у дзіцячых часопісах «Чыж» і «Ёж». У тэхніцы выцінання выканаў адну са сваіх кніг пра жывёл вядомы ленінградскі мастак і пісьменнік Яўгеній Чарушын. Маскоўскі мастак В. Мядзведзеў — яшчэ адзін энтузіяст гэтай арыгінальнай тэхнікі, — праілюстраваў ускладнёна-прыгожымі выцінанкамі нямала кніг для дарослых.

І ўсё ж, не забываючы пра вопыт работы ў сілуэце, які назапашаны ў рускім мастацтве, Вячаслаў Дубінка ідзе сваім шляхам, абапіраючыся, у першую чаргу, на народныя традыцыі, адраджаючы амаль забытае мастацтва. Мастак здолеў знайсці яму месца ў сучаснай мастацкай культуры рэспублікі, яшчэ раз сцвердзіўшы справядлівасць выказвання Максіма Багдановіча: «Як кожны народ мае сваю нацыянальную душу, так ён мае і свой асаблівы склад творчасці, найбольш прыдатны для гэтай душы... Наш сённяшні, наш заўтрашні напрамак — да забытага намі народнага беларускага шляху».

Л. ЗВАНАРОВА-КОНАН.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

НАСУСТРАЧ ЮБІЛЕЮ

У снежні 1991 г. споўніцца 100 год з дня нараджэння Максіма Багдановіча, якога нават дваццацігадовым юнаком сучаснікі (М. Агурцоў) называлі народным паэтам.

Улетку ў Ракуцёўшчыне, дзе Максім пражыў два месяцы ў 1911 годзе і стварыў тры цыклы вершаў, адбылося традыцыйнае свята паэзіі і песні. Яно зноўку засведчыла, што наш народ любіць і шануе неўміручае слова свайго выдатнага сына. Каля Максімавай крыніцы сабраліся шматлікія аматары літаратуры з Мінска, Вільнюса, Маладзечна, а таксама навакольных вёсак. Міжволі ўспаміналіся стогадовыя юбілеі Янкі Купалы і Якуба Коласа, якія выліліся ў вялікія нацыянальныя святы.

Да юбілею Максіма Багдановіча засталося 6 год — час яшчэ ёсць, і трэба як належыць падрыхтавацца да слаўнай падзеі.

У 1968 годзе быў выдадзены двухтомны акадэмічны Збор твораў М. Багдановіча. Выданне адразу ж знікла з паліц кнігарань. Пазней даследчыкі літаратуры адшукалі нямала невядомых раней тэкстаў, якія не трапілі ў двухтомнік. Былі ў гэтым выданні і некаторыя недакладнасці ў каментарыях. Усё гэта, а найперш, вядома, неаслабная цікавасць шматлікіх чытачоў да творчай спадчыны паэта, сведчыць аб тым, што наспела патрэба ў новым навукова-каменціраваным выданні твораў класіка нашай літаратуры. Неабходна таксама, каб БелСЭ запланавала і выдала да юбілею энцыклапедыю-персаналію «Максім Багдановіч». Падрыхтаваць яе будзе значна лягчэй за купалаўскую, што неўзабаве ўбачыць свет, бо Максім Багдановіч працаваў у літаратуры ўсяго толькі 10 год. Акрэслены гістарычны перыяд, кароткае дзесяцігоддзе творчай дзейнасці паэта, абмежаванае кола ягоных сувязей гавораць пра тое, што энцыклапедыя можа атрымацца сціслай і цэльнай, добра ахарактарызуе перыяд нараджэння новай беларускай літаратуры, якую абудзіла да жыцця рэвалюцыя 1905 года.

Выдавецтву «Народная асвета» варта было б выдаць да юбілею паэта альбом-выстаўку, які, безумоўна, вельмі дапаможа ў вывучэнні ў школах творчасці Максіма Багдановіча.

За апошнія гады ў друку было змешчана нямала перакладаў вершаў паэта на рускую мову. Сярод іх ёсць удалыя, але сустракаюцца і зусім слабыя. Хацелася б, каб паэты і даследчыкі паэзіі выказалі пра іх сваю думку і паклапаціліся аб тым, каб у кнігі класіка не траплялі пераклады, не вартыя перавыдання.

Вялікія задачы стаяць перад Літаратурным музеем Максіма Багдановіча. Пакуль што дырэкцыя музея працуе ў цяжкіх умовах. Штат малы. Пры вялікай зацікаўленасці і ініцыятыве супрацоўнікаў магчымасці ў іх абмежаваныя. Замест таго, каб усе сілы накіроўваць на пошук матэрыялаў для фондаў музея і распрацоўку планаў экспазіцыі, супрацоўнікам даводзіцца многа часу аддаваць гаспадарчым справам, клопатам пра будоўлю. Рэстаўрацыя будынка ідзе вельмі марудна. У дырэкцыі музея няма нават тэлефона. Каб музей не толькі скончыў будаўніцтва і расчыніў свае дзверы для наведвальнікаў, але і добра падрыхтаваўся да 100-гадовага юбілею паэта, неабходна самая дзейсная дапамога яму з боку Міністэрства культуры і Саюза пісьменнікаў БССР.

Вырашэнне ўсіх гэтых пытанняў вымагае шмат часу, таму і трэба пачаць падрыхтоўку да юбілею своечасова.

Ніна ВАТАЦЫ.

Кансультацыя УААП

САЎТАРСТВА

Як узнікае сааўтарства і ў якім аб'ёме належыць аўтарскае права кожнаму з сааўтараў?

М. В. РУДАКОЎ.

Сааўтарства — гэта ўдзел дзвюх ці больш асоб у сумеснай творчай дзейнасці па стварэнні твора літаратуры, навукі або мастацтва, у выніку чаго ўсе гэтыя асобы набываюць аўтарскае права на створаны імі твор. Як відаць з самога вызначэння, сааўтарства падразумявае сумесную творчую працу, аднак гэта не сведчыць аб аб'яднанні творчага працэсу: сааўтарства часта ажыццяўляецца, калі сааўтары працуюць хоць і ўзгоднена, але паасобку, ствараючы агульны твор, уносячы ў яго свой творчы ўклад.

У законе нічога не гаворыцца пра тое, якім павінен быць размер творчага ўкладу сааўтараў. Адсюль вынікае, што гэты размер юрыдычна не мае значэння для ўзнікнення самога факту сааўтарства. Значыць, дастаткова самага мінімальнага, але абавязкова творчага ўкладу ў агульны твор, каб быць сааўтарам і карыстацца ўсімі аўтарскімі правамоцтвамі. Размер творчага ўкладу мае значэнне толькі пры размеркаванні аўтарскага ганарару.

Менавіта творчы ўклад з'яўляецца прыметай сааўтарства. Нельга назваць сааўтарам таго, хто аказвае аўтару або сааўтарам тэхнічную дапамогу: падбірае матэрыялы, вычэрчвае схемы, дыяграмы, графікі і да т. п. Тут трэба мець на ўвазе, што гаворка ідзе не аб тэхнічных работніках (машыністка, чарцёжніца, капіроўшчыца і г. д.), бо ў адносінах да іх звычайна пытанне аб сааўтарстве не паўстае. Гаворка аб працы асоб той самай прафесіі, што і аўтар, яго калегах, але аб працы тэхнічнай, без унясення ў твор творчага ўкладу.

У законе гаворыцца аб двух відах сааўтарства: нераздзельным, што ўзнікае ў адносінах да твора, які ўяўляе сабой адно неразрыўнае цэлае, і раздзельным — яно ўзнікае ў адносінах да твора, што складаецца з частак, кожная з якіх мае і самастойнае значэнне. Пры гэтым самастойнай з'яўляецца толькі такая частка, якая можа быць выкарыстана незалежна ад іншых частак калектыўнага твора, напрыклад, раздзел з кнігі — у выглядзе артыкула ў часопісе.

Незалежна ад віду сааўтарства аўтарскае права належыць сааўтарам сумесна. Акрамя таго, кожны з сааўтараў карыстаецца аўтарскім правам на створаную ім частку твора, якая мае самастойнае значэнне. Такое становішча ўзнікае толькі тады, калі можна вызначыць, якая з самастойных частак кім з сааўтараў створана. Калі кожную, хоць і самастойную частку ўсе сааўтары стваралі супольна, то раздзельнага сааўтарства няма.

Існуе многа твораў, што складаюцца з асобных самастойных частак, кожная з якіх патрабуе для свайго стварэння розных відаў творчай дзейнасці. Інакш кажучы, гэтыя творы аб'ядноўваюць розныя аб'екты аўтарскага права. Прыкладам такіх твораў з'яўляюцца: песня (яна складаецца з музыкі і паэтычнага тэксту), ілюстраваная кніга (тэкст і ілюстрацыі) і да т. п. У такіх выпадках паміж аўтарамі ўзнікаюць адносіны, падобныя на сааўтарскія (асабліва гэта добра відаць на прыкладзе, калі паэт і кампазітар супольна працуюць над стварэннем песні). Аднак з улікам прававой прыроды гэтых асобных твораў, якія рэгулююцца рознымі відамі аўтарскіх дагавораў, аплачваюцца па розных стаўках і г. д., трэба прызнаць, што тут няма сааўтарства ў юрыдычным значэнні, а ёсць проста творчае супрацоўніцтва.

Звычайна адносіны паміж сааўтарамі вызначаюцца іх пагадненнем. У пастанове пленума Вярхоўнага суда СССР ад 19 снежня 1967 г. «Аб практыцы вырашэння судамі спрэчак, якія вынікаюць з аўтарскага права» наогул гаворыцца аб тым, што сааўтарства ўзнікае толькі пры наяўнасці ўзаемнага пагаднення паміж сааўтарамі, якое можа быць дасягнута ў любой стадыі стварэння калектыўнага твора. Такое пагадненне, калі яно заключаецца ў адносінах да яшчэ не створанага твора, можа вызначаць размер укладу кожнага аўтара, канкрэтызаваць узаемныя абавязкі сааўтараў. Акрамя таго, пагадненнем паміж сааўтарамі можа рэгулявацца парадак указання імёнаў, спосаб абазначэння імёнаў (сапраўднае імя або псеўданім), размеркаванне ганарару. Напрыклад, пры літаратурным запісе прафесійным літаратарам расказаў ці матэрыялаў непасрэднага ўдзельніка або сведкі падзей магчыма рознае абазначэнне імёнаў аўтараў. У адным выпадку імёны абодвух сааўтараў абазначаюцца на тытуле, у другім — імя літаратара ўказваецца на адвароце тытульнага ліста як асобы, што ажыццявіла «літаратурны запіс» або «літаратурную апрацоўку», іншым разам прыводзіцца імя толькі расказчыка, а імя літаратара наогул адсутнічае. Усё залежыць ад пагаднення, якое наконт гэтага заключылі паміж сабой сааўтары.

Пагадненне паміж сааўтарамі можа быць выражана ў пісьмовай або вуснай форме. Яно нярэдка ўключаецца ў дагавор, што заключаецца паміж сааўтарамі і арганізацыяй, якая выкарыстоўвае твор. Трэба адзначыць, што на практыцы вусныя пагадненні часта параджаюць спрэчкі паміж сааўтарамі, таму лепш за ўсё, калі дамоўленасць сааўтараў афармляецца дакументальна. Калі па пытаннях сааўтарства ўзнікаюць спрэчкі і сааўтары не прыходзяць да згоды, то справа вырашаецца судом.

Парадак выплаты ганарару сааўтарам залежыць ад віду сааўтарства. Пры нераздзельным сааўтарстве размер долі аўтарскага ганарару вызначаецца пагадненнем сааўтараў у залежнасці ад удзельнай вагі творчай працы кожнага з іх. Пры раздзельным сааўтарстве, калі ў творы выдзелены часткі, якія належаць кожнаму сааўтару, ганарар выплачваецца ў адпаведнасці з іх аб'ёмам.

С. ШУСТ.

ТЭАТР ЛЯЛЕК—ДАРОСЛЫМ

Ленінградскі дзяржаўны ордэна «Знак Пашаны» Вялікі тэатр лялек не ўпершыню прыязджае ў горад Мінск, але цяперашнія выступленні гледачам асабліва запомніліся, бо далі магчымасць занава перагарнуць старонкі творчасці М. Зошчанкі. Спектакль «Чужаземец у Рыме» з інтрыгуючым вызначэннем жанру — зусім неверагодны катаклізм у дзвюх частках — дазволіў убачыць сапраўдны твар мяшчанства, якое ва ўсе часы выклікала пагарду.

Ад аўтара выступаў народны артыст СССР А. Райкін, голас якога быў запісаны на плёнку. Мінчане і госці беларускай сталіцы змаглі ацаніць па вартасцях майстэрства рэжысёра народнага артыста РСФСР В. Сударышкіна, мастакоў У. Хаўралёва і Л. Баравенкавай, артыстаў, якія агучвалі лялькі.

М. ГЕЛЬСКІ.

САМАДЗЕЙНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

„Скрыпяць мае лапці!..“

Перш чым выйсці на сцэну ў складзе фальклорна-этнаграфічнага ансамбля «Альшанка», які існуе ў калгасе «40 год Кастрычніка», навічок павінен прайсці незвычайнае творчае выпрабаванне: навучыцца насіць лапці. І не горш за свайго дзеда альбо прабабку. Справа гэта не з лёгкіх, асабліва калі ўлічыць, што ў «лыкавых пуантах» трэба станцаваць «Кракавяк». Таго і глядзі, разматаюцца анучы альбо наступіш на дрэнна завязаную абору партнёра. Бясспрэчны аўтарытэт тут — пенсіянер Міхаіл Іванавіч Крупкевіч. Ніхто іншы не праявіць столькі цярплівасці, пакуль не растлумачыць усе тайны абування лапцей, і ніхто з такім майстэрствам і аператыўнасцю не зробіць для чарговага канцэрта дзесятак фарсістых лапаткоў, якія яшчэ пахнуць прывялай лазой.

Гармонік палявода Міхаіла Міхайлавіча Сысы напяе вам дзесяткі мелодый. Сэрцы не аднаго пакалення альшанцаў застаўлялі яны паскорана біцца. І ні на адзін дзень не змаўкалі тыя напевы сярод будзённых клопатаў у душах многіх вяскоўцаў. Гармонік галасісты, уладарыў ты калісьці на вяселлях і ігрышчах, у дні сустрэч і расстанняў!.. Як адзываецца памяць на твае вечна маладыя пераборы!..

Бываючы на ферме, дырэктар калгаснага Дома культуры Ала Мікалаеўна Крупкевіч чуйна ўслухоўвалася ў галасы даярак, углядалася ў іх твары. А калі зразумела, у каго жыве ў душы песня, запрасіла жанчын на першую спеўку.

З тых першых, нясмелых выхадаў на сцэну прайшло пяць гадоў. Удзельнікі «Альшанкі» пераканаліся самі і даказалі аднавяскоўцам, што мастацтва продкаў не старэе. Тысячы аднадумцаў набылі яны пасля выступленняў, якія праходзілі не толькі ў Століне, Пінску, але і на Украіне ў калгасе «Сцяг камунізму» Дубровіцкага рёна, у літоўскім горадзе Утэна. Не разгубіліся і ў залітай святлом сафітаў студыі абласнога тэлебачання.

У «штаце» альшанскай філармоніі 16 чалавек. З першых дзён тон задае тут Наталля Чынікайла, жанчына галасістая, жыццярадасная. Больш за дваццаць гадоў працуе яна даяркай, выйшла ў перадавікі, выхавала трое дзяцей і ўвесь гэты час не расставалася з песняй. Палескіх мелодый Наталля Іванаўна напяе вам, як яна сама кажа, вялікі мех і маленькую ношачку. Палявод Кацярына Рудзяк, маці чатырох дзяцей, — звонкагалосая «прыма» ансамбля. На самай чыстай і высокай ноце запявае яна «Вярбу яравую», «Я ў калгасе...», «Кукавала зязюленька», «Добры вечар, стара маці», складзеныя калісь невядомым вясковым кампазітарам. Ні ў чым не адстае ад сяброўак і перадавы аператар машыннага даення Аляксандра Балтуха. Клопат пра пяцярых дзяцей, завочная вучоба ў Пінскім сельскагаспадарчым тэхнікуме не перашкаджаюць Аляксандры Паўлаўне, чалавеку выключна аптымістычнаму, прагнаму да работы і жыцця, удзельнічаць ва ўсіх канцэртах і рэпетыцыях. Сотні народных мелодый можа напець бухгалтар сельпо Людміла Міхайлаўна Піваварэвіч, у якой растуць трое такіх жа галасістых дзяцей.

Ёсць у сельскіх артыстаў апякун, надзейны і клапатлівы — старшыня калгаса, Герой Сацыялістычнай Працы Іван Дзмітрыевіч Янкоўскі. Гэта дзякуючы яго стараням «Альшанка» адправілася на гастролі ў Літву на камфартабельным «Ікарусе». З нязменнай зацікаўленасцю калгасны кіраўнік выслухоўвае сваіх артыстаў. А потым ансамбль слухаюць усім сялом. Сцэнай становіцца для жанчын поле ў час традыцыйных зажынак, у час свята першай баразны. Маляўнічае палатно нагадвае тады фальклорная кампазіцыя «Беларуская ўраджайная»—з прыпеўкамі аб калгасным жыцці, мясцовым танцам «Венгерка», сваімі, шытымі па старадаўніх узорах касцюмамі.

Вяртаць людзям незаслужана забытае — тое ж самае, што змагацца за чысціню навакольнага асяроддзя. Свае нумары з арыгінальнай, не скажонай на патрэбу павярхоўным густам лексікай альшанцы зберагаюць на сцэне як элементы нацыянальнай культуры. У традыцыйны фальклор калектыў смела ўносіць сучасны змест, новыя сродкі мастацкай выразнасці. Душэўнае багацце, сардэчнасць альшанскіх пявунняў становяцца і нашым здабыткам.

Салістка ансамбля Аляксандра Паўлаўна БАЛТУХА.

М. КАЗЛОВІЧ.

Столінскі раён.

АД ДЗЕДА Ў СПАДЧЫНУ

Усе, хто праходзіць па вуліцы Пралетарскай горада Старыя Дарогі, абавязкова спыняюцца каля дома № 48, дзе жывуць ветэран Вялікай Айчыннай вайны Іван Сямёнавіч Лізура і яго жонка, былая настаўніца пачатковых класаў Кацярына Вікенцьеўна. Прываблівае ўвагу хітрун-лесавік, выразаны на камлі дрэва сынам Лізураў Ігарам Іванавічам. Ён даўно жыве за межамі рэспублікі — у Ніжнім Тагіле, але на ўсё жыццё захаваў любоў да роднай культуры, багатай духоўнай спадчыны, фальклору свайго народа. А пераняў яе Ігар Іванавіч ад дзеда — Вікенція Францавіча Дзятко, славутага разьбяра па дрэве. Той быў чалавекам таленавітым, творчым, умеў дасягаць не толькі знешняга, а і ўнутранага падабенства сваіх герояў з рэальнымі прататыпамі.

Ад яго і даведаўся ў маленстве І. Лізура пра многія сакрэты майстэрства разьбы па дрэве, навучыўся адчуваць своеасаблівасці кожнага віду драўніны. Пад яго наглядам зрабіў першыя крокі, свае першыя вырабы. Але навуку на гэтым не скончыў, а паступіў у тэхнікум на аддзяленне тэхналогіі апрацоўкі драўніны. І толькі тады ўзяўся за карпатлівую напружаную працу...

Першыя творы І. Лізуры дэманстраваліся ў раённым Доме культуры 15 гадоў назад. І хоць разнастайных экспанатаў на выстаўцы было шмат, яны звярнулі на сябе самую пільную ўвагу наведвальнікаў. Найбольш прывабілі «Баба Каргота», «Пачвара», трыпціх «Рэпка», «Калабок», «Курачка раба». Кожны з гэтых твораў вылучаўся нацыянальным каларытам, добразычлівым народным гумарам. Разам з гэтымі «героямі» знайшлі сваё завершанае мастацкае ўвасабленне вобразы папулярных народных казак і песень...

З таго часу сотні твораў выхадца са Старадарожчыны дэманстраваліся на яго персанальных выстаўках у Мінску, Ніжнім Тагіле, у Польшчы і ГДР. Гэты факт сведчыць, што майстэрства разьбяра па дрэве І. Лізуры ўвесь час расло і ўдасканальвалася.

У 1980 годзе горад Старыя Дарогі адзначыў свой 400-гадовы юбілей. І. Лізура горача адгукнуўся на гэту падзею і выканаў эмблему роднага горада, якая выкарыстоўвалася на некалькіх значках, што паступілі ў той год у продаж.

Для Ігара Іванавіча стала правілам кожны штогадовы водпуск праводзіць на радзіме. Заканчваецца адпачынак, а ў самадзейнага мастака — некалькі новых твораў. Сёлета, напрыклад, І. Лізура прыняў удзел у чарговым агляндзе фальклорна-этнаграфічных калектываў раёна і зрабіў партрэт фальклорнага квартэта з калгаса «Герой працы». Свой новы твор народны ўмелец перадаў на захаванне ў аддзел культуры райвыканкома.

А. ЛІСІЦКІ.

На здымку: «Несцерка».

НА ЭКРАНЕ

з 14 па 20 кастрычніка

14 кастрычніка, 20.25

«МЫ—МУЗЫЧНАЯ СЯМ'Я».

Выступае сямейны ансамбль Балачковых з Гомельшчыны.

15 кастрычніка, 18.05

«МОЙ РОДНЫ КУТ».

Перадача расказвае пра рэвалюцыйныя, баявыя, працоўныя традыцыі Глускага раёна. У ёй прымаюць удзел Герой Савецкага Саюза У. Жук, пісьменнік С. Грахоўскі, мастак В. Захарынскі, сакратар раённага камітэта партыі Ю. Былінскі. Вядучы — пісьменнік А. Марціновіч.

15 кастрычніка, 19.45

Адбудзецца сустрэча з рэдакцыяй часопіса «Беларусь».

15 кастрычніка, 21.50

З ПЛЕНУМА ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА КАМПАЗІТАРАЎ БССР.

Канцэрт песні. Вы пачуеце творы Глебава, Семянякі, Лучанка, Ханка, Іванова, Дарохіна, Зарыцкага, Шлег, Прохарава, Раінчыка. Выканаўцы: спевакі Н. Бярнацкая, Т. Пячынская, Т. Раеўская, В. Кучынскі, В. Скорабагатаў, Я. Еўдакімаў, вакальна-інструментальны ансамбль «Верасы», Акадэмічны сімфанічны аркестр БССР. Дырыжор — заслужаны артыст БССР Б. Райскі.

16 кастрычніка, 19.20

«НАВІНКІ КНІГАРНІ».

Вядучая—паэтэса В. Аколава.

16 кастрычніка, 20.25

«ВЕЧАРЫ КАМЕРНАЙ МУЗЫКІ».

Прагучаць творы беларускіх кампазітараў для скрыпкі і фартэпіяна.

18 кастрычніка, 19.45

ПАКАЗВАЕ ГРОДНА.

Літаратурна-мастацкі часопіс «На прынёманскіх прасторах».

19 кастрычніка, 12.20

«СЛОВА—ПАЭЗІІ».

Свае новыя вершы чытае Г. Каржанеўская.

19 кастрычніка, 13.05

А. АРБУЗАЎ. «У ГЭТЫМ МІЛЫМ СТАРЫМ ДОМЕ».

Спектакль Томскага тэатра драмы.

19 кастрычніка, 15.10

«У ЖЫВАПІСЕ, ГРАФІЦЫ, СКУЛЬПТУРЫ».

Размова пойдзе пра развіццё беларускага пейзажнага жывапісу, яго напрамках, характэрных асаблівасцях і наватарскіх тэндэнцыях. Вы ўбачыце лепшыя палотны, якія дастойна прадстаўляюць мастацтва рэспублікі не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі.

19 кастрычніка, 15.30

«НАВІНКІ КНІГАРНІ».

Вядучая—паэтэса Н. Тулупава.

19 кастрычніка, 17.05

«ТЭАТРАЛЬНАЯ ГАСЦІНАЯ».

На гэты раз вы сустрэнецеся з артыстамі Кіеўскага тэатра драмы і камедыі.

19 кастрычніка, 23.25

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».

Эстрадная музычная праграма з удзелам Л. Гурчанка, К. Райкіна, Д. Джэрсі (Інданезія), вакальна - інструментальнага ансамбля «Верасы», балета тэлебачання ГДР.

20 кастрычніка, 11.05

Спявае салістка ДАВТа БССР В. Цішына.

Яна выконвае творы Танеева, Брамса, Карловіча, Арэнскага. Уступнае слова музыкаведа Г. Хаймінавай.

20 кастрычніка, 19.45

«СВІТАЛЬНАЯ ПЕСНЯ».

Перадача прысвечана трагічна загінуўшаму паэту Л. Якубовічу. Вядучы —паэт М. Федзюковіч.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 04451

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела мастацтваў — 33-21-53, аддзела арганізацыйна-масавай работы — 33-19-65, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.